*Студыйны варыянт*

# КАНСПЕКТЫ

## ДАПАМОЖНЫХ МАТЭРЫЯЛАЎ

## ДЛЯ КАТЭХЕЗАЎ

V кл.

Катэхетычная секцыя пры ККББ

2008 г.

**Тэма № 1. Пан Бог аб’яўляецца чалавеку ў Святым Пісанні**

**Дыдактычная мэта:**

Вучань ведае, што Пан Бог адкрываецца чалавеку ў Святым Пісанні. Ён ведае, што:

1. Святое Пісанне ўтрымлівае Божае слова.
2. Хто з’яўляецца аўтарам Бібліі, структуру Бібліі.
3. І дзе чалавек можа пачуць Божае слова.

**Выхаваўчая мэта:**

Выхаванне павагі да Святога Пісання, таму, што яно з’яўляецца кнігай, у якой Пан Бог адкрываецца чалавеку і гаворыць яму аб сваёй любові. Уважлівае слуханне Божага Слова таму, што яно ўтрымлівае мудрасць і вядзе людзей да Пана Бога. Самастойнае чытанне Святога Пісання.

**Матэрыялы:**

Ліст, словы з Бібліі для кожнага вучня з «Ліста Нябеснага Айца». Біблія. Матэрыялы для дэкарыравання. Дапаможнікі.

**Метады катэхэзы:**

Аналіз біблійнага тэксту, дыскусія, праца з дапаможнікам, дэкарыраванне.

**Ход заняткаў**

**Малітва:**

Малітва да Духа Святога. Малітоўнік «Ойча наш» стр. 46

К. правярае хатняе заданне, паўтарае пройдзены матэрыял і ўводзіць вучняў у новую тэму.

**Чалавек пытае:**

Адносіны з роднымі і блізкімі нам людзьмі дастаўляюць нам асаблівую радасць. Мы любім іх і пастаянна хочам мецць зносіны з імі. А калі мы вымушаны растацца з імі, мы смуткуем і сумуем. Любім атрымліваць лісты ад іх. Я хачу прачытаць вам ліст, які атрымала мая сяброўка ад таты, яе йцец працаваў далёка на Поўначы.

*«Прывітанне, мая любая дачушка! Як твае справы? Як вучоба? Я сумую па табе. Прама на халадзільніку я павесіў твой фотаздымак, гляджу на цябе і радуюся, што ты ёсць у мяне. Сумую… Не магу дачакацца лета, каб прыехаць у адпачынак. Тады мы з табой і мамай будзем разам хадзіць на рэчку купацца, пойдзем у лес па ягады. Мне так шмат трэба расказаць табе…»*

К. пытаецца:

- «Якія ў вас з’явіліся пачуцці і думкі, калі вы пачулі змест гэтага ліста?»

Вучні выказваюцца. К. кожны з нас любіць атрымліваць лісты, а, калі іх шмат, тады кожны адкрывае ліст ад чалавека, які яму даражэйшы за ўсіх. Сёння я вам прынесла асаблівы ліст, /К. бярэ ў рукі Біблію/, які для мяне
і для кожнага чалавека напісаў самы дарагі і родны на свеце Нябесны Айцец– Пан Бог. У ім Ён адкрываецца нам, гаворыць усім людзям аб Сваёй любові, гэты цудоўны ліст называецца Святое Пісанне. Па-іншаму гэту ўнікальную кнігу называюць Біблія.

**Бог адказвае:**

Біблія — гэта святая кніга, таму, што яе аўтарам з’яўляецца сам Пан Бог. Ён выбраў аўтараў-людзей, якія пад натхненнем Святога Духа запісалі словы Бога. Аўтара-чалавека мы будем называть натхнёным Богам аўтарам. У Бібліі два аўтары: Пан Бог і натхнёны Богам аўтар. К. пытае:

− Хто з’яўляецца аўтарам Святога Пісання?

Святое Пісанне мы можам назваць Божай бібліятэкай, таму, што яна утрымлівае 73 кнігі, і складаецца з двух частак: Стары Запавет (46 кніг) і Новы Запавет (27 кніг). Слова «запавет» азначае дамову, якая пацвярджае саюз Бога з людзьмі.

К. успомнім, аб чым апавядаюць нам кнігі Старога і Новага запавету.

К. прымацоўвае да дошкі гатовы дапаможнік наступнага зместу:

Стары Запавет утрымлівае 46 кніг, якія апавядаюць аб людзях і падзеях да нараджэння Езуса Хрыста:

1. Стварэнні свету і чалавека
2. Першародным граху
3. Пакліканні і гісторыі выбранага народа
4. Запавеце на гары Сінай
5. Прароцтве аб прыйсці нашага Збаўцы, Езуса Хрыста

К. просіць дзяцей запісаць у сшытак змест дапаможніка.

К. прымацоўвае да дошкі гатовы дапаможнік наступнага зместу:

Новы Запавет складаецца з 27 кніг, якія апавядаюць аб жыцці і дзейнасці Езуса Хрыста, Яго апосталаў і пра заснаваны ім Касцёл.

К. просіць дзяцей запісаць у  сшытак змест дапаможніка

К. пытае:

- Колькі кніг у Старым Запавеце?
- Аб чым апавядаюць кніга Старога Запавету?
- Колькі кніг у Новым Запавеце?
- Аб чым апавядаюць кнігі Новага Запавету?

Біблія, Святое Пісаннее, з’яўляецца асноўнай крыніцай нашай веры. Усе, хто чытае або слухае Божае слова, маюць жывы кантакт з Панам Богам. Святы Геранім казаў: «Няведанне Пісання - гэта няведанне Хрыста».

У Святым Пісанні Пан Бог паступова адкрываецца чалавеку, паказвае яму Сваю вялікую любоў, і крок за крокам вядзе яго да Сябе.

К. прымацоўвае да дошкі гатовы дапаможнік наступнага зместу:

| |
|---|
| Святое Пісанне – гэта кніга аб любові Бога да чалавека. |
| Біблія з’яўляецца асноўнай крыніцай нашай веры. |
| «Няведанне Пісання – гэта няведанне Хрыста» св. Геранім |

К. просіць дзяцей запісаць у сшытак змест дапаможніка.

З аднаго боку Святое Пісанне адрасавана ўсім людзям, якія жывуць на зямлі. А з іншага боку Пан Бог звяртаецца да кожнага з нас асобна, асабіста. Святое Пісанне – гэта Божае Адкрыццё, якое дае чалавеку не толькі веды пра Пана Бога, але і ўказвае шлях, які да Яго вядзе.

Святое Пісанне з’яўляецца самай важнай і галоўнай кнігай у свеце, яе называюць Кнігай усіх кніг, яна ўтрымлівае словы Пана Бога. У нашым класе мы выберам самае ганаровае і галоўнае месца і размесцім Біблію.

Інтранізацыя Святога Пісання. К. разам з дзецьмі дэкарыруе ганаровае месца, на якім будзе пастаянна знаходзіцца Святое Пісанне (свечка, глобус, дэкарыраваць тканінай і г.д.) К. прапаноўвае вучням устаць, запальвае свечку і кажа «Святло Хрыста», а вучні адказваюць «Дзякуем Богу». К. заклікае вучняў памаліцца ў цішыні да Святога Духа, каб яны змаглі зразумець і годна прыняць Божае слова.

К. раздае дзецям лісты-скруткі з прыгатаванымі словамі з Бібліі.
У цішыні кожны чытае свой ліст.

**Чалавек адказвае Богу:**

К. пытае:

- «Якія ў вас з’явіліся пачуцці і думкі, калі вы прачыталі ліст?»

К. указвае на пустое крэсла і прапаноўвае па чарзе садзіцца на яго
і расказать групе пра свае пачуцці і думкі. Напрыканцы ён сам садзіцца на крэсла і кажа пра свае пачуцці і думкі.

К. пытае:

- У чым заключаецца сакрэт шчасця кожнага чалавека?
- Дзе мы можам пачуць Божае слова?
- Як мы можам зразумець, што мы пачулі Божае слова?
- Ці дастаткова для чалавека толькі пачуць Божае слова?
  - Напішы прыклад таго, як ты выконваеш Божае слова.

**Разважанне:**

Пан Бог любіць мяне. Ён напісаў мне ліст – Святое Пісанне. У ім Ён адкрываецца мне і кажа аб сваёй бязмежнай любові. У Святым Пісанні Пан указвае верны і надзейны шлях, які вядзе мяне да Яго.

1. Ці ўдзячны я Пану Богу за дар Святога Пісання?
2. Дзе ў маім доме захоўваецца Святое Пісанне?
3. Як часта я чытаю Біблію?
4. Ці ўважліва я слухаю Божае слова ў Касцёле і на катэхезе?
5. Як я выконваю Божае слова?
6. Што я магу зрабіць для таго, каб Біблія стала для мяне любімай і галоўнай кнігай?
7. Як я адкажу на словы, якія атрымаў ад Пана Бога?

**Пастанова.**

**Хатняе заданне:**

– Раскажы сваім сябрам пра Біблію.

– Калі ў цябе ў пакоі яшчэ няма алтарыка (месца, пры якім ты молішся) то пастарайся зрабіць яго. /можна на прыкладзе паказаць, як арганізаваць малітоўны вугалок у пакоі; крыж, абразы, Біблія, свечка, ружанец, малітоўнік, сшытак па рэлігіі і г.д./

- Прынясі на наступны занятак, выразаныя з часопісаў малюнкі, на якіх паказана прырода, жывёлы і птушкі, або намалюй сам тое, што табе найбольш падабаецца ў прыродзе.

**Заключная малітва:**

Спантанная малітва, у якой вучні выражаюць удзячнасць Пану Богу за дар Бібліі. Песня «Слова Тваё», Спеўнік Эмануэль стр. 110.

## Тэма № 2. Святое Пісанне аб стварэнні свету

**Дыдактычная мэта**:

Пазнаёміць вучня з біблійнай гісторыяй аб стварэнні свету. Вучань ведае, што Пан Бог — мудры Стварыцель свету бачнага і нябачнага. Пан Бог Усемагутны – Ён стварыў усё з нічога. Усё, што стварыў Пан Бог з'яўляецца добрым.

**Выхаваўчая мэта**:

Фарміраваць у вучню веру ва усемагутнасць і мудрасць Бога, які з нічога стварае свет і фарміраваць пачуццё ўдзячнасці Богу за створаны свет, які служыць чалавеку. Выхоўваць адказнасць за навакольны свет.

**Матэрыялы**:

Біблія: **Быцця 1, 1-25**, ілюстрацыя і фільм, паказваючыя падзеі біблійнага тэксту. Дапаможнік. Камень, кветка, вада, кактус і г.д. Надпіс на калаж «Веру ў Бога, Творцу неба і зямлі…»

**Метады катэхэзы**:

Аналіз біблійнага тэксту, медытацыя вобраза, дапаможнік, дыскусія, незаконченыя сказы. Калаж на тэму: «Веру ў Бога, Творцу неба і зямлі…»

**Ход заняткаў**

**Малітва:**

Спеўнік Эмануэль "Аллелюя… Хваліце з неба" стр 8

К. правярае хатняе заданне, звяртае асаблівую ўвагу на тое, як удалося вучням расказаць пра Біблію сваім сябрам, што ў іх атрымалася, з якімі цяжкасцямі яны сутыкнуліся. К. паўтарае пройдзены матэрыял і ўводзіць вучняў у новую тэму.

**Чалавек пытае:**

К. сам прыносіць і просіць вучняў паказаць другую частку хатняга задання – выразаныя з часопісаў малюнкі, на якіх паказана прырода, жывёлы і птушкі, або намаляваная вучнямі, тое, што ім найбольш падабаецца ў прыродзе.

К. Мы ведаем, што само сабой нічога не ствараецца. К. пытае:

– Адкуль узяўся свет, у якім мы жывём?

– Ці мог гэты цудоўны свет узнікнуць выпадкова, сам?

– Хто з’яўляецца Аўтарам, Стварыцелем гэтага свету?

– Для каго створаны гэты цудоўны свет?

К. А што Святое Пісанне кажа пра стварэнне свету?

**Бог адказвае:**

На першых старонках Бібліі мы чытаем рэлігійны гімн — паэму аб стварэнні свету. У ёй натхнёны Богам аўтар, з дапамогай вобразаў, якія ўзніклі ў яго ўяўленні, апісаў стварэнне свету. Таму нельга ў гэтым фрагменце ўспрымаць усё даслоўна. У Бібліі гаворыцца аб тым, Хто стварыў свет. Біблія кажа аб тым, што Пан Бог, стварыў увесь свет з нічога, таму мы называем Яго ўсемагутным Богам! К. на дошцы прымацоўвае дапаможнік наступнага зместу:

| |
|---|
| У Бібліі гаворыцца аб тым, Хто стварыў свет.<br>Пан Бог з’яўляецца мудрым Стварыцелем сусвету.<br>Пан стварыў усё з нічога, таму мы называем Пана Усемагутным Богам! |

К. просіць вучняў запісаць словы дапаможніка ў сшытак.

У той час, калі натхнёны Богам аўтар пісаў паэму аб стварэнні свету, ізраэльцяне верылі ў сапраўднага Пана Бога, жылі яны сярод язычнікаў, якія пакланяліся ідалам. Напрыклад, егіпцяне пакланяліся ідалу, прадстаўленаму ў выглядзе быка, бо бачылі ў жывёлах багоў. У Бабілёне пакланяліся сонцу, зоркам, лмесяцу. Ізраэльцяне разумелі, што ідалы язычнікаў не сапраўдныя, бо не могуць быць багамі. Сонца, месяц, чалавек ці жывёла – гэта толькі стварэнні Пана Бога. Біблійная гісторыя аб стварэнні свету скінула фальшывых багоў з язычаскіх алтароў.

К. прапаноўвае вучням устаць, запальвае свечку і кажа «Святло Хрыста», а вучні адказваюць «Дзякуем Богу». К. заклікае вучняў памаліцца ў цішыні да Святога Духа, каб яны змаглі зразумець і годна прыняць слова Божае.

К. чытае **Быцця 1, 1-25**, затым К. паказвае фрагмент з фільма, які апісвае стварэнне свету. Праца над тэкстам **Быцця 1, 1-25**. К. пытае:

- Якім чынам Бог стварыў свет?
- Напачатку Бог стварыў …(закончыы сказ)
- Хто лунаў над водамі?
- Якія выразы паўтараюцца ў біблійным тэксце найчасцей? Выпісваем на дошцы (І сказаў Бог, І сталася так, І быў вечар і была раніца, І ўбачыў Бог, што гэта добра)
- Аб чым кажуць выразы «І сказаў Бог: … І так сталася»?
- Аб чым кажа выраз «І ўбачыў Бог, што гэта добра»?
- Пан Бог стварыў не толькі паўзуноў, птушак і рыб, але і …(закончы сказ)
- Добры Пан Бог стварыў свет і падрыхтаваў яго..... (закончы сказ)

**Чалавек адказвае Богу:**

Пан Бог стварыў усё мудра, гарманічна і прыгожа. Уся прырода сведчыць пра яе вялікага, мудрага і ўсемагутнага Стварыцеля. Усё, што створана Богам – добрае і карыснае. Уся прырода служыць чалавеку.
К. пытае:

- Ці любіце вы бываць у лесе?
- Што ў лесе можна збіраць?
- Хто любіць купацца ў возеры?
- Хто любіць катацца на лодцы?
- Ці любіце вы пах скошанага лугу і палявых кветак?

− Ці бегалі вы басаном летам па траве?

− Якія жывёлы вам больш за ўсё падабаюцца?

− Якую садавіну вы найбольш любіце?

К. звяртае ўвагу на багацце і разнастайнасць навакольнага свету. К. на прыкладзе дапаможнікаў: Камень, кветка, вада, кактус і г.д. дэманструе адрозненне: па саставу, па форме, на дотык / цвёрдае, мяккае, цёплае, пушыстае і г.д./, па паху, па смаку, па гуку. Свет навокал нас - цудоўны і паказвае нам Шчодрасць, Дабрыню і веліч Пана Бога.

К. калі людзі прыдумалі камп'ютэр, прыклалі да яго інструкцыю, інструкцыю па карыстанні камп'ютэрам, у якой апісаны магчымасці камп'ютэра, як з ім працаваць, і чаго на ім рабіць нельга. Пан Бог таксама мае Свой намер адносна створанага свету, чалавеку Ён сказаў: «**Валодайце ёю, і пануйце над рыбамі марскімі, над птаствам нябесным і над усімі жывымі істотамі, якія рухаюцца па зямлі, Усё аддаю вам** …»

− Ці цэнім мы свет навокал нас?

К. прапаноўвае вучням напісаць правілы: «Як правільна адносіцца да прыроды?», у якіх яны павінны ўлічыць:

1. Намер пана Бога — Стварыцеля, Аўтара сусвету.
2. Что дае нам прырода, яе магчымасці? /Прырода дае нам …/
3. Як з ёй абыходзіцца, каб яна магла быць для нас карыснай?
4. Як нельга абыходзіцца з прыродай, таму што ў гэтым выпадку мы яе разбураем?
5. Чым пагражае чалавеку разбурэнне прыроды?

К. разам з дзецьмі робіць калаж на тэму: «Веру ў Бога, Стварыцеля неба і зямлі…», пад малюнкамі можна размясціць словы з правіла: «Як правільна адносіцца да прыроды?»

**Разважанне:**

Пан Бог – усемагутны, мудры Стварыцель сусвету. Ён стварыў свет добрым і цудоўным. К. пытае:

- Ці ўдзячны я Богу за прыроду?
- Як я магу выразіць удзячнасць Богу за прыроду?
- Як я магу абараніць прыроду?

**Пастанова.**

**Хатняе заданне:**

1. Раскажы сваёй сям'і і сябрам пра тое, што ў Бібліі гаворыцца пра стварэнне свету ў Бібліі.
2. Намалюй малюнак на тэму «Бог — Стварыцель свету».
3. Прынясі на наступны ўрок карцінкі або малюнкі, на якіх паказаны людзі, можна прынесці фотаздымкі любых і блізкіх табе людзей.

**Заключная малітва:**

Спантанная малітва, у якой вучні выражаюць:

1. Удзячнасць Богу за створаны свет.
2. Просьбу аб прабачэнні за няўдзячнасць і няправільныя адносіны да прыроды.
3. Просьбу аб тым, каб умелі абыходзіцца з прыродай, згодна намеру Бога — Стварыцеля.

## Тэма № 3. Пан Бог адорвае чалавека Божым жыццём і запрашае да жыцця з сабою

**Дыдактычная мэта:**

Вучань пазнае і прымае праўду пра тое, што Пан Бог з'яўляецца Стварыцелем чалавека і што чалавек гэта – вобраз і падабенства Божыя. Вучань разумее святасць жыцця кожнага чалавека.

**Выхаваўчая мэта:**

Выхоўваем у вучню ўдзячнасць Богу за дар жыцця і фарміруем імкненне жыць у еднасці і любові з панам Богам.

**Матэрыялы:**

**Біблія: Быцця 1 26-31**, ілюстрацыя і фільм, якія паказваюць падзеі біблійнага тэксту. Дапаможнік. Надпіс «Створаныя па вобразу і на падабенства Божае»

**Метады катэхэзы:**

Аналіз біблійнага тэксту, медытацыя вобраза, дапаможнік, дыскусія, незавершаныя сказы.

**Ход заняткаў**

**Малітва:**

Псальм № 8, 2. 4-7

К. правярае хатняе заданне, паўтарае пройдзены матэрыял і ўводзіць вучняў у новую тэму.

**Чалавек пытае:**

К. просіць вучняў паказаць карцінкі з відарысам людзей, якія яны прынеслі. К. пытае:

- Адкуль з'явіўся чалавек?
- Чаму вочы бачаць?
- Чаму вушы чуюць?

– Чаму лёгкія дыхаюць?

– Чаму сэрца б’ецца?

– Чаму чалавек усміхаецца?

– Адкуль у чалавека бяруцца думкі і пытанні?

– Адкуль у чалавеку дабрыня і любоў?

Вучні выказваюцца.

**Бог адказвае:**

Апісваючы стварэнне чалавека, натхнёны Богам аўтар выкарыстоўвае вобразы, зразумелыя для чалавека. Ён прадстаўляе Пана Бога як ганчара або скульптара. Гэты вобраз кажа нам пра тое, што Пан Бог з’яўляецца Стварыцелем чалавека, а не пра тое, як быў створаны чалавек. Хоць чалавек і з’яўляецца часткай прыроды, ён — асаблівае стварэнне. Гэта асаблівасць заключаецца ў тым, што Пан Бог удыхнуў подых жыцця — надзяліў чалавека бессмяротнай душой, стварыў чалавека па Свайму вобразу і на Сваё падабенства.

К. на дошцы прымацоўвае дапаможнік наступнага зместу:

| |
|---|
| У Біблії гаворыцца аб тым, што:<br>1. Пан Бог з’яўляецца Стварыцелем чалавека<br>2. Пан Бог стварыў чалавека па свайму вобразу і на сваё падабенства. |

К. кажа вучням: «А зараз прачытаем і ўважліва паслухаем, што кажа Святое Пісанне пра стварэнне чалавека»

К. прапаноўвае вучням устаць, запальвае свечку і кажа «Святло Хрыста», а вучні адказваюць «Дзякуем Богу». К. заклікае вучняў памаліцца ў цішыні да Святога Духа, каб яны змаглі зразумець і годна прыняць слова Божае.

К. чытае ўрывак з Біблії пра стварэнне чалавека **Быццё 1 26-31**. К. прапаноўвае паглядзець фрагмент з фільма «Стварэнне Свету»: ад стварэння

свету да стварэння чалавека. Пасля прагляду К. прапаноўвае вучням папрацаваць самастойна з тэкстам **Быццё 1 26-31**:

- Хто стварыў чалавека?
- Па чыйму вобразу і падабенству быў створаны чалавек?
- Для чаго Бог стварыў чалавека?
- Што сказаў Пан Бог чалавеку, калі яго благаславіў?
- Над кім павінен панаваць чалавек?

Вучні дзеляцца сваімі адказамі.

К. Бог стварае чалавека, каб падзяліцца з ім сваім шчасцем і любоўю. Чалавек створаны для таго, каб любіць Пана Бога, выконваць Яго святую волю і жыць вечна з Ім у раі. Першыя людзі былі па-сапраўднаму шчаслівыя. Чаму? Таму што былі ўлюбёнымі дзецьмі Пана Бога, яны былі любімыя і самі любілі. Яны сябравалі з Панам Богам. Пан хацеў, каб людзі вечна жылі з Ім у раі, у любові і еднасці. Першыя людзі мелі асвячальную ласку. Асвячальная ласка рабіла душу першых людзей мілай і прыемнай Богу. К. пытае:

- У чым заключаўся сакрэт шчасця першых людзей?
- Як ставіліся першыя людзі да Бога?
- Для чаго створаны чалавек?
- Як жылі першыя людзі?
- Першыя людзі мелі … /закончы сказ/

Бог — наш усемагутны Айцец, наш Стварыцель. Жыццё кожнага чалавека — святое. Гэта значыць, што ніхто з людзей на свеце не мае права пазбаўляць жыцця чалавека. Толькі Пан Бог Крыніца ўсяго жывога, можа яе ў чалавека забраць. З дарам жыцця Бог адарыў кожнага чалавека трыма дарамі, якія робяць яго падобным да Бога, гэта:

К. прымацоўвае да дошкі наступныя дапаможнікі:

| Несмяротная душа – чалавек жыве вечна |
|---|

Вольная воля – чалавек мае свабоду выбару, можа любіць і быць добрым

| Розум – чалавек здольны думаці і быць мудрым |
| --- |

К. просіць вучняў запісаць змест дапаможніка.

К. пытае вучняў:

- Які наш Бог?

К. адказы вучняў запісвае на дошцы.

**Чалавек адказвае Богу:**

К. пытае вучняў:

- Што мы павінны рабіць для того, каб станавіцца ўсё больш падобнымі да Бога?
- Что нам трэба рабіць для таго, каб захаваць у сабе вобраз Божы?

Выказваюцца ўсе вучні.

К. разам з вучнямі робяць калаж на тэму: «Створаныя па вобразу і падавенству Божаму »

Малюнкі з відарысамі людзей прыносяць вучні, а надпіс «Створаныя па вобразу і падабенству Божаму» падрыхтуе К. Пад малюнкамі можна размясціць адказы вучняў на вышэйпрыведзеныя пытанні.

**Разважанне:**

К. пытае вучняў:

- Ці ўдзячны я Пану Богу за сваё жыццё? У чым гэта выяўляецца?
- Як мне зберагчы ў сабе Божы вобраз і Божае падабенства?
- Ці бачу я ў кожным чалавеку Божы вобраз і Божае падабенства ?
- У чым заключаецца сакрэт майго шчасця?

– Ці з’яўляецца святым для мяне жыццё кожнага чалавека?

**Пастанова.**

**Хатняе заданне:**

1. Раскажы сваёй сям’і і сябрам біблійную гісторыю пра стварэнне чалавека.
2. Напішы малітву падзякі Богу за дар жыцця.
3. У людзях, якіх ты яшчэ не навучыўся прымаць і любіць, пастарайся ўбачыць Божы вобраз і Божае падабенства.

**Заключная малітва:**

“Аддане сябе Богу” “Ойча наш” стр. 45. Песня «Табе ахвярую Пане мой…»,

## Тэма № 4. Чалавек праз непаслухмянасць разрывае сувязь з Богам

**Дыдактычная мэта:**

Вучань разумее сутнасць граху – гэта недахоп любові, які выражаецца ў непаслухмянасці Богу. Грэх разбурае адносіны з Богам. Жаданне пастаяннага навяртання, вяртання да Бога, праз таямніцу Пакаяння.

У таямніцы хросту Пан Бог вызваляе чалавека ад першароднага граху напаўняе асвячальнай ласкай і робіць нас Дзецьмі Божымі.

**Выхаваўчая мэта:**

Выхоўваем у вучнях імкненне жыць у стане асвячальнай ласкі.

**Матэрыялы:**

Біблія, **Быцця 2, 8-10, 15-17; 3, 1-14,** ілюстрацыя і фрагмент з фільма, якія паказваюць падзеі біблійнага тэксту. Ілюстрацыі: хрост дзіцяці, выгнанне з раю. Чорная тканіна. Дапаможнік: супраць каго накіраваны грэх.

**Метады катэхэзы:**

Дыскусія, пантаміма, незакончаныя сказы, аналіз біблійнага тэксту, праца з дапаможнікам.

### Ход заняткаў

**Малітва:**

Дзеці чытаюць малітву падзякі Богу за дар жыцця, якую напісалі дома.

К. Правярае хатняе заданне, паўтарае пройдзены матэрыял і ўводзіць вучняў у новую тэму.

**Чалавек пытае:**

К. Добры Пан Бог падарыў нам жыццё, каб мы былі шчаслівыя, каб праслаўлялі і служылі Пану Богу і любілі бліжніх. Але чалавек зграшыў. Зараз паспрабуем паказаць у пантаміме, што робіць грэх з чалавекам

К. паказвае з трымя вучнямі наступную сцэнку:

*Грэх*
*Дзеючыя асобы*

*Чалавек*
*Два чалавекі, якія паказваюць вобразы з дапамогай чорнай тканіны*
*Вядучы*
*Рэмарка для пастаноўшчыка. Для рэквізіта спатрэбіцца адзін вялікі кавалак чорнай шаўковай тканіны:*
*Увесь тэкст гаворыць вядучы – К., а акцёры – вучні ілюструюць яго сваімі дзеяннямі.*
*На сцэне адзін чалавек стаіць у цэнтры, два чалавекі з тканінай на крок спераду ад яго, у руках за канцы яны трымаюць вялікі кавалак чорнай тканіны*

*Вядучы. Біблія апісвае грэх па-рознаму. Гэта тканіна нагадвае мне грэх.* *(*Расцягваюць чорную тканіну і паказваюць яе гледачам*): з аднаго боку яна бліскучая, як і грэх, вельмі часта, выглядае прывабна, але з іншага боку* (паварочваюць тканіну вываратным бокам) *тканіна цьмяная і змрочная.*
*Грэх аддзяляе нас ад Бога* (расцягваюць тканіну перад чалавекам так, каб ён цалкам быў аддзелены ад гледачоў).
*З-за граху мы знаходзімся у цемры, таму што ў Бібліі гаворыцца, што з-за сваіх злых спраў людзі больш палюбілі цемру чым святло* (накідваюць тканіну на галаву).
*Грэх робіць нас сляпымі* (адзін чалавек бярэ канец тканіны і робіць цэнтральнаму
акцёру павязку на вочы).
*Ён робіць глухімі нашы вушы* (гэтым жа канцом, закрывае цэнтральнаму акцёру
вушы).
*Ён утрымлівае нас ад абвяшчэння слоў праўды* (тым жа канцом завязвае цэнтральнаму акцёру рот).
*Ён звязвае нас* (той, у каго няма тканіны ў руках, выцягвае рукі цэнтральнага акцёра, а другі адным канцом звязвае яму рукі).
*Ён робіць нас нявольнікамі* (рукі цэнтральнага акцёра застаюцца звязанымі, а другім

канцом тканіны яго б'юць па спіне).
*Ён заманьвае нас у пастку* (двое па баках робяць з тканіны жгут
і расцягваюць
перад нагамі цэнтральнага акцёра, ён робіць крок, спатыкаецца і падае на спіну)
*Але самае жудаснае – ён прыносіць смерць* (двое па баках выпростваюць тканіну і накрываюць зверху цэнтральнага акцёра як накрываюць труп ).

К. задае пытанні вучням:

- Што робіць грэх з чалавекам?
- Да чаго хоча давесці грэх чалавека?

Вучні выражаюць сваё меркаванне, ідзе дыскусія, К. актыўна ўключае ў дыскусію ўсіх вучняў.

**Бог адказвае:**

К. Зараз паслухаем, што кажа Святое Пісанне пра першародны грэх. Мы з вамі памятаем, што натхнёны Богам аўтар, з дапамогай вобразаў, якія ў яго былі ва ўяўленні, апісаў першародны грэх. Таму нельга ў гэтым фрагменце ўспрымаць усё даслоўна, вобразы, якія нам прадстаўлены, дапамагаюць раскрыць і зразумець праўду аб першародным граху. К. прапаноўвае дзецям устаць, запальвае свечку і кажа «Святло Хрыста», а дзеці адказваюць «Дзякуем Богу». К. чытае фрагмент з Біблii аб першародным граху ***Быццё 2, 8-10, 15-17; 3, 1-14***, паказвае фрагмент з фільма, які прадстаўляе падзеі біблійнага тэксту. На дошцы размяшчае ілюстрацыю, якая паказвае вобраз выгнання з раю. К. прапаноўвае вучням самастойную працу з тэкстам
з Біблii.

К. пытае:

- Дзе размясціў Бог першых людзей?
- Што знаходзілася ў раі?
- Як называлася дрэва, пладоў ад якога Бог сказаў чалавеку не есці?
- Чаму Бог не хацеў, каб людзі елі з дрэва пазнання дабра і зла?

– Як паступілі першыя людзі?

– Хто іх да гэтага падштурхнуў?

– Што зрабілі Адам і Ева пасля грэхападзення?

К. прапаноўвае вучням запоўніць табліцу:

– Упішы ў табліцу значэнні вобразаў.

| ВОБРАЗ | ІНТЭРПРЭТАЦЫЯ ВОБРАЗА |
|---|---|
| Сад, рай | |
| Дрэва пазнання дабра і зла | |
| Змей | |
| Змей падгаворвае ўкусіць забаронены плод | |
| Адам і Ева адкусваюць забаронены плод | |
| Спрэчка Адама і Евы | |
| Церні і ваўчыца будуць прарастаць, выгнанне з раю | |

**Значэннее вобразаў**

1. Вораг Бога і чалавека — сатана;
2. Першародны грэх: чалавек хоча быць роўным з Богам, хоча сам вырашаць, што з’яўляеццая дабром, а што — злом; разрывае сувязь з Богам;

3. Людзі не могуць зразумець адзін аднаго, зло ўваходзіць у іх жыццё;

4. Спакушальная моц зла, якая здаецца нам дабром;

5. Сяброўства, любоў, адносіны з Богам, стан асвячальнай ласкі, гармонія паміж людзьмі і прыродай;

6. Жыццё становіцца цяжкім, у жыццё чалавека ўваходзіць страх, пакуты і смерць. Трагедыя чалавечага граху: прырода становіцца для чалавека небяспечнай, чалавек адчувае сябе чужым, яму складана бачыць Бога.

7. Сімвал праўды аб залежнасці ад Бога. Толькі Пан з'яўляецца Стварыцелем свету і чалавека і Ён вырашае, што з'яўляецца дабром, а што — злом

На аснове запоўненай табліцы К. тлумачыць: Супраць каго накіраваны грэх:



**Чалавек адказвае Богу:**

Здзяйсняючы грэх, чалавек сам адыходзіць, адварочваецца, хаваецца ад Бога. Яго жыццё напаўняецца страхам і пакутамі. Кожны чалавек нараджаецца з першародным грахом. Пан Бог не пакінуў чалавека, ён даў нам вялікі дар - сакрамант, у якім Ён вызваляе нас ад путаў першароднага граху, напаўняе асвячальнай ласкай і робіць нас Дзецьмі Божымі.

К. пытае:

- Які гэта сакрамант?
- Хто ачышчае нас ад першароднага граху?
- Што дае чалавеку сакрамант Хросту?
- Паслухмяны Богу чалавек – гэта … /закончы сказ/
- Да каго мы становімся падобнымі, калі любім і чынім дабро?

**Разважанне:**

У сакраманце Хросту Пан Бог ачысціў нас ад першароднага граху, абдарыў асвячальнай ласкай і ўсынавіў нас. К. пытае:

- Што аддаляе мяне ад Пана Бога?
- Ці ўдзячны я Пану Богу за сакрамант хросту?
- Калі і дзе мяне хрысцілі?
- Як завуць святара, які ўдзяляў мне сакрамант хросту?

- Як завуць маіх хросных бацькоў?
- Чым я падобны да майго Нябеснага Айца?
- Што я павінен змяніць у сваіх паводзінах, каб стаць сапраўдным сынам /дачкой/ Пана Бога?
- Ці малюся я за людзей, якія яшчэ не вераць у Пана Бога?

**Пастанова.**

**Хатняе заданне:**

1. Раскажы сваёй сям'і і сябрам гісторыю пра першародны грэх.
2. Запішы ў сшытак месца і дату твайго хросту, імёны хросных бацькоў і святара, які цябе хрысціў
3. Намалюй малюнак на тэму: «Мой хрост».

**Заключная малітва:**

Спантанная малітва падзякі Пану Богу за дар сакраманту Хросту. Закончыць малітвай «Ойча наш».

## Тэма № 5. Пан Бог абяцае прыйсце Збаўцы

**Дыдактычная мэта:**

Вучань пазнае праўду пра тое, што Пан Бог шукае людзей, якія ад Яго адышлі і хоча ўратавання кожнага чалавека. Пан Бог абяцае людзям Збаўцу.

**Выхаваўчая мэта:**

Фарміраваць у вучню пачуццё ўдзячнасці Пану Богу за дар Збаўцы – Езуса Хрыста. Вучань ведае, што Пан Бог не перастае любіць чалавека нават тады, калі ён грашыць і сам адыходзіць ад Яго.

**Матэрыялы:**

Біблія: ілюстрацыя і фільм, якія паказваюць падзеі біблійнага тэксту. Скрыні з надпісамі. Абраз Найсвяцейшай Дзевы Марыі – Беззаганнае пачацце і медальёны. Плакат у выглядзе Бэтлеемскай зоркі, або Сэрца Езуса, або Крыжа, з надпісам: «Езус – Ты наш Збаўца»

**Метады катэхэзы:**

Аналіз біблійнага тэксту, медытацыя вобраза, дыскусія. Сцэнка. Дапаможнік. Плакат.

### Ход заняткаў

**Малітва:**

Малітоўнік “Ойча наш”, “Малітва аб пазбаўленні ад дрэнных думак” стр. 59

К. правярае хатняе заданне, паўтарае пройдзены матэрыял і ўводзіць вучняў у новую тэму.

**Чалавек пытае:**

**Сцэнка «Сцяна»**

Музычнае суправаджэнне - па ўласнаму меркаванню.

Чалавек будуе вакол сябе сцяну са скрынак, на якіх напісана (можна разам з вучнямі, напісаць тое, што аддзяляе нас ад Пана Бога і бліжніх) напрыклад: Нявер'е, Забабоны, Нянавісць, Зайздрасць, Злосць, Абыякавасць і г.д. Гэта адбываецца кожны раз, калі да яго прыходзяць сябры, яны пра штосьці гавораць, а ён ім потым зайздросціць, або іх ненавідзіць (ставіць скрынкіі з надпісамі: зайздрасць, нянавісць). Урэшце рэшт, сцяна дасягае такіх памераў, што героя не бачна з-за яе, ён быццам сам сябе замураваў. Ён пачынае крычаць, зваць на дапамогу, плакаць, казаць аб тым, як ён сябе адчувае. Прыходзяць сябры, але не могуць дапамагчы, прыходзіць Хрыстус, і разбірае сцены.

- Вучні дзеляцца ўражаннямі ад сцэнкі.

**Бог адказвае:**

Пан Бог стварыў чалавека, каб раздзяліць з ім шчасце. Бог хацеў, каб чалавек знаходзіўся з Ім у пастаянным сяброўстве. Але чалавек не паслухаў Пана Бога і трапіў у бяду, путы зла зняволілі яго. Але Бог заўсёды любіць чалавека, і не перастае любіць нават тады, калі чалавек выбірае няправільны шлях і сам адыходзіць ад Яго. Пан асуджае няправільны выбар — грэх, але не чалавека, і хоча выратаваць яго. К. паказвае ілюстрацыю «Выгнанне з раю», і прымацоўвае дапаможнік наступнага зместу да дошкі:

| ЯК ВЫРАТАВАЦЬ ЧАЛАВЕКА? |
| --- |

Зараз я прачытаю словы, якія сталі першай «Добрай Весткай» пра нашае збаўленне. К. чытае тэкст **Быццё 3, 14а-15**, затым вучні чытаюць яго ў цішыні самастойна. К. пытае:

- Каго сімвалізуе змей?
- Што Бог сказаў змею?
- Пра якую жанчыну абвяшчае Пан Бог? /К. паказвае вобраз Найсвяцейшай Дзевы Марыі./

На зямлі нарадзіўся адзін чалавек, у якога не было першароднага граху – гэта Найсвяцейшая Дзева Марыя. Урачыстасць Беззаганнага Пачацця Найсвяцейшай Дзевы Марыі мы святкуем 8 снежня. Пан Бог захаваў яе ад першароднага граху, дзеля Свайго Сына Езуса Хрыста. Найсвяцейшая Дзева Марыя - Багародзіца, яна - мама Езуса Хрыста. (Можна раздаць вучням медальёны Беззаганнае пачацце і растлумачыць іх значэнне )

- Найсвяцейшая Дзева Марыя нарадзілася … (завяршы сказ)
- Якога Збаўцу Пан Бог абяцае людзям?
- Хто перамог сатану?
- Што зрабіў Езус Хрысту, каб збавіць чалавека?
- Ад чаго збавіў Езус Хрыстус чалавека?

Пан Бог знайшоў першых людзей і даў ім вялікае абяцанне перамогі над злом. Перамогу над злом мы інакш называем збаўленнем. Езус Хрыстус наш Збаўца, бо менавіта Ён перамог зло і вызваліў нас ад улады д’ябла.

**Чалавек адказвае Богу:**

К. раздае вучням каляровыя картачкі і прапаноўвае ім напісаць словы удзячнасці і праслаўлення Бога, за тое, што Ён даў нам Свайго Сына, Збаўцу

– Езуса Хрыста. Гатовыя картачкі вучні наклейваюць на плакат з надпісам: «Езус – Ты наш Збаўца». /падчас працы можа гучаць музыка /

**Разважанне:**

- Ці ўдзячны я Пану Богу за Яго любоў?
- Ці ўдзячны я Пану Богу за тое, што Ён дае мне Збаўцу – Езуса Хрыста? У чым гэта выяўляецца?
- Як я захоўваюся, калі раблю дрэнныя ўчынкі?
- Ці не спіхваю я віну на іншых?
- Ці не прыдумляю я доўгі і заблытаны ланцуг апраўданняў?
- Ці прызнаю сваю віну?
- Ці прашу прабачэння?
- Ці стараюся выправіцца?

**Пастанова.**

**Хатняе заданне:**

1. Раскажы сваёй сям'і і сябрам біблійную гісторыю пра тое, як Пан Бог абяцаў Адаму і Еве даць Збаўцу.
2. Запішы ў сшытак абяцанне Бога адносна прыйсця Збаўцы Езуса Хрыста.
3. Напішы сваю малітву падзякі Богу за тое, што Ён даў нам Збаўцу.

**Заключная малітва:**

Песня «Мой Збавіцель», спеўнік Эмануэль стр. 76

## Тэма № 6. Ахвяра Каіна і Абэля

**Дыдактычная мэта:**

Пазнаёміць вучня з біблійнай гісторыяй пра братоў Каіна і Абэля. Вучань разумее, што грэх разбурае адносіны паміж людзьмі.

**Выхаваўчая мэта:**

Фарміруем у вучняў імкненне прызнаваць свае памылкі, прасіць прабачэнне за ўчыненае зло і будаваць сяброўскія адносіны з бліжнімі.

**Матэрыялы:**

**Біблія: Быццё 4, 2-11; 4 6,7** ілюстрацыя і фільм, якія паказваюць падзеі біблійнага тэкста. Прыгатаваць літары «УСЕ ВАЖНЫЯ ДЛЯ БОГА». Дапаможнік: «Супраць каго накіраваны грэх»

**Метады катэхэзы:**

Аналіз біблійнага тэксту, медытацыя вобраза, праца з дапаможнікам, дыскусія, сцэнка.

### Ход заняткаў

**Малітва:**

*Мой Пане і мой Божа,*

*вазьмі ўсё, што мяне ад Цябе аддаляе.*

*Мой Пане і мой Божа,*

*дай усё, што мяне да Цябе набліжае.*

*Мой Пане і мой Божа,*

*вазьмі мяне ў поўную ўласнасць сваю.*

*Малітва «Адданне сябе Богу»*

К. правярае хатняе заданне, паўтарае пройдзены матэрыял:

- Як мы называем грэх першых людзей?
- Што дрэннага зрабілі Адам і Ева?
- Якое было наступства граху?

К. уводзіць вучняў у новую тэму.

**Чалавек пытае:**

К. пытае:

- Назавіце крыніцу зла на зямлі? /грэх/

К. паказвае дапаможнік з папярэдняга ўрока: «Супраць каго накіраваны грэх». Канцэнтруе ўвагу на тым, што: «Людзі не могуць зразумець адзін аднаго, зло ўваходзіць паміж людзей».

К. пытае:

- Што нам не падабаецца ў адносінах паміж людзьмі? /Народы, сям’я, школа, сябры/

К. адказы запісвае на дошцы і асабліва акцэнтуе ўвагу на граху зайздрасці.

К. просіць вучняў намаляваць твар чалавека, якога мучыць пачуццё зайздрасці, і твар чалавека вольнага ад пачуцця зайздрасці. Пад намаляванымі тварамі людзей вучні адпаведна пішуць 5 галоўных рысаў, якія характарызуюць зайздроснага і незайздроснага чалавека. Вучні прадстаўляюць сваю творчасць на абмеркаванне, і ўсе разам вызначаюць тыя рысы, якія сустракаюцца часцей за ўсё.

**Бог адказвае:**

На прыкладзе двух братоў Каіна і Абэля, мы з вамі ўбачым, да чаго можа давесці чалавека грэх, у прыватнасці грэх зайздрасці. Каіна і Абэля натхнёны Богам аўтар называе дзецьмі Адама і Евы, гаворка ідзе не пра родных дзяцей, не пра першых людзей. У Бібліі не гаворыцца пра першабытных людзей, пра якіх вы даведваліся на ўроку гісторыі ў школе. Каін і Абэль з’яўляюцца

патомкамі Адама і Евы. Выраз «сын, дачка Адама і Евы», азначае проста - чалавек. Мы з вамі таксама з'яўляемся сынамі і дачкамі Адама і Евы.

К. запальвае свечку, вучні ўстаюць … зачытывае тэкст з Бібліі **Быццё 4, 2б-11**. (можна паказаць фрагмент з фільма), на дошцы пакінуць ілюстрацыю: «Ахвяра Абэля і Каіна» або «Каін забівае Абэля». К. падрабязна тлумачыць дзецям сэнс прачытанага тэксту – экзэгеза тэксту. Пасля экзегезы задае пытанні:

- Кім былі Каін і Абэль?
- Што было прычынай смутку Каіна?
- Чаму паводзіны Каіна не спадабаліся Богу?
- Што павінен быў змяніць Каін у сваіх паводзінах?
- Да чаго можа давесці чалавека грэх, а ў прыватнасці грэх зайздрасці?

Пан Бог ніколі не пакідае чалавека, Ён заўсёды шукае розныя спосабы, каб дапамагчы яму, задае пытанні, засцерагае, хоча, каб чалавек быў шчаслівы. І ў гэтай гісторыі, Пан хоча дапамагчы Каіну, і таму кажа яму: К. чытае **Быццё 4 6,7 «І сказаў Пан Каіну: Чаму засмуціўся ты , і чаму спахмурнеў твар твой ? Калі ты робіш добра, ці не павінна быць узнята аблічча тваё? А калі не робіш добра, грэх затойваецца пры дзвярах. Ён цягне цябе да сябе, але ты можаш панаваць над ім».**

К. просіць вучняў самастойна папрацаваць з тэкстам з Бібліі, знайсці і ўпісаць у дапаможнік для вучня словы Пана Бога, у якіх Ён засцерагае Каіна ад граху.

- Ад чаго Пан Бог засцерагаў Каіна?
- Што павінен быў змяніць Каін у сваіх паводзінах?
- Што б мы параілі Каіну, для таго, каб ён жыў у згодзе са сваім братам?

**Чалавек адказвае Богу:**

Уявім сабе, што наш лепшы сябар пакутуе ад зайздрасці. Ён пастаянна паўтарае: «Да іншых ставяцца лепш, чым да мяне. Ім больш шанцуе, у іх усё

атрымліваецца. Я не такая прыгожая, як … » Што ты параіш свайму сябру? Дыскусія на тэму: «Як можна пазбавіцца зайздрасці?» Можна зрабіць плакат «Таблеткі ад зайздрасці», на якім вучні напішуць свае адказы.

Пан Бог любіць кожнага з нас асаблівым чынам. Кожны чалавек каштоўны для Бога. Кожны з нас для Пана Бога асаблівы, незаменны і кожнага з нас Пан шчодра адарыў дарамі. Кожны чалавек вельмі важны для Бога, таму, што ён адзіны і непаўторны. Зараз мы з вамі пакажам пра гэта сцэнку:

К. ставіць з дзецьмі сцэнку «Усе важныя для Бога»:

ЛІТАРЫ

ДЗЕЮЧЫЯ АСОБЫ: Вядучы і 16 чалавек з літарамі на грудзях: У, В, А- 2 чалавекі, С, Е, Ж, Н, Ы, Д, Л, Я - 2 чалавекі, Б, О, **Г.**

ВЯДУЧЫ: У друкарні, дзе звычайна шумна бывае толькі з-за працуючых станкоў, на гэты раз гаманілі літары. Яны спрачаліся паміж сабой.

ЛІТАРА Н: Сярод людзей заўсёды знойдзецца хтосьці больш просты, а хтосьці больш важны, але сярод літар важней за ўсё літара Н.

ЛІТАРА Ы: Гэта яшчэ чаму?

ЛІТАРА Н: Н – часта ўжывальная літара, не тое, што нейкая Ы. З мяне пачынаецца Біблія: На пачатку стварыў Бог неба і зямлю… Нават у адным наборы нас дзве. Вось!

ЛІТАРА А: Гэта Н – самая ўжывальная? А па-мойму - А. А нас туту дзве. Як бы людзі абышліся без літары? Усё пачынаецца з А. А – першая літара алфавіта, А – гэта першы гук дзіцяці

ЛІТАРА Д: А першае слова – ДАЙ. Д – больш галоўная.

ЛІТАРА Б: Б! З мяне пачынаюцца такія важныя словы, як Бог і Біблія. ЛІТАРА Е: А з мяне Евангелле! Ды і ўвогуле, вы – зычныя без нас зусім бы не гучалі. Не было б галосных, людзі не маглі б пець.

ЛІТАРА О: Сябры, перастанце спрачацца. Вы ўсе не правыя. Няўжо не зразумела, што самая дасканалая – гэта літара О. Вы паглядзіце на мяне. Якая я круглая, сіметрычная, правільная. Паглядзеўшы на мяне, усе кажуць: о-о-о!

ЛІТАРЫ Я: Я! Я! Вы забыліся пра нас!

ЛІТАРА Ы: Я – апошняя літара алфавіта!

Усе літары пачныаюць разам шумець: кожны вымаўляе сваю літару.

ВЯДУЧЫ: Але тут у друкарню зайшоў наборшчык. Літары заціхлі. Яны чакалі, каго ж чалавечыя рукі скарыстаюць для працы. Кожнай хацелася атрымаць месца. Аказалася, што патрэбныя ўсе. Наборшчык набраў патрэбны загаловак і, паглядзіце, што ў яго атрымалася.

Літары строяцца ў рад, спіной да гледачоў, пасля слоў “паглядзіце, што ў яго атрымалася” яны адначасова паварочваюцца, і атрымліваеца наступны сказ: УСЕ ВАЖНЫЯ ДЛЯ БОГА.

Літары разам: УСЕ ВАЖНЫЯ ДЛЯ БОГА!

К. пытае ў вучняў:

- Як вы разумееце выраз «Усе важныя для Бога»?
- Што вы зразумелі з гэтай сцэнкі?

**Разважанне:**

Кожны чалавек вельмі важны, каштоўны і незаменны для Пана Бога:

- Ці радуюся я дасягненням бліжніх?
- Ці я не сапернічаю з бліжнімі?
- Што я найбольш цаню ў іншых людзях?
- Што я найбольш цаню ў сабе?

– Што я раблю, калі ўва мне ўзнікае пачуццё зайздрасці?

**Пастанова.**

**Хатняе заданне:**

1. Раскажы сваёй сям’і і сябрам біблійную гісторыю пра Каіна і Абэля, запытай у сябра, што ён найбольш цэніць у табе, а ты ў сваю чаргу скажы яму тое, што ты цэніш у ім.
2. На працягу гэтага тыдня пастарайся гаварыць шчырыя кампліменты сваім бліжнім.
3. Намалюй малюнак на тэму «Усе людзі важныя для Бога»

**Заключная малітва:**

Напісаць малітву, у якой мы хочам:

- выразіць сваю ўдзячнасць Богу за тое, што Ён нас стварыў і адарыў шматлікімі дарамі
- просім прабачэння за нашыя грахі, у прыватнасці за грэх зайздрасці, за ўсе формы яе праяўлення
- просім аб аздараўленні ад нашых грахоў

Вучні чытаюць свае малітвы.

# Тэма № 7. Патоп як справядлівае пакаранне за маральную сапсаванасць

**Дыдактычная мэта**:

Пазнаёміць вучня з біблійнай гісторыяй пра сусветны патоп. Вучань разумее другую галоўную праўду веры «Бог – Суддзя справядлівы: за добрае ўзнагароджвае, а за злое карае.». Вучань ведае, што «Пан Бог – наш Міласэрны Айцец, Ён ахвотна прабачае нам нашыя грахі, калі мы ў іх шчыра раскайваемся"

**Выхаваўчая мэта**:

Фарміраваць у вучнях давер і вернасць Богу.

**Матэрыялы**:

Біблія: **Быццё 6, 5-9, 17**, ілюстрацыя і фільм, якія паказваюць падзеі біблійнага тэксту

**Метады катэхэзы**:

Аналіз біблійнага тэксту, медытацыя вобраза, дапаможнік, дыскусія. Сцэнка.

**Ход заняткаў**

**Малітва:**

*Шчаслівы чалавек,*

*які не ходзіць за парадай бязбожных.*

*Ён будзе як дрэва,*

*пасаджанае каля воднага патоку,*

*якое плод прыносіць у свой час,*

*і лісце яго не вяне,*

*а ўсё, што ён чыніць, яму ўдаецца.*

*Не такі лёс бязбожных:*

*яны, як мякіна, што разносіцца ветрам.*

*Таму бязьожныя не выстаяць на судзе...*

Псальм 1, 1а. 3-5а

К. правярае хатняе заданне. Выказваецца кожны вучань, пры гэтым К. акцэнтуе ўвагу вучняў на станоўчых эмоцыях, якія нараджаліся ў тых, каму былі адрасаваныя камплементы, і адпаведна, у вучняў, якія рабілі шчырыя камплементы. К. паўтарае пройдзены матэрыял:

– Да чаго прыводзіць чалавека грэх?

– Якія наступствы ў граху?

– Як можна вярнуцца да Бога?

К. уводзіць дзяцей у новую тэму.

**Чалавек пытае:**

Сцэнка: «Калі нічога не зменіцца …»

Пустыя крэслы

Вядучы: Добры дзень! Дазвольце мне прадставіць вам былых выпускнікоў 11А класа адной з нашых школ. (Тры сімвалы, якія характэрызуюць герояў)

Гэта Віталь. Ужо ў чацвёртым класе ён пачаў курыць цыгарэты, уцякаць з заняткаў, ён часта лаецца брыдкімі словамі. Калі нічога не зменіцца, то праз некалькі гадоў яго адлічаць са школы, і ён стане алкаголікам.

Гэта Аня. Самая самая прыгожая дзяўчына ў класе. Яна любіць музыку і танцы, а таксама хлопчыкаў. Вельмі часта ходзіць да варажбітак і сама варожыць. Калі нічога не зменіцца, то яна ніколі не зможа стварыць добрую

сям'ю. Варажбіткі ёй не дапамогуць. Яна будзе жыць у сваё задавальненне, але гэта не прынясе ёй радасці, наадварот, яна будзе нешчаслівая.

Гэта Валера. Звычайны школьнік, першы раз ён украў у 6 гадоў і з той пары ён не можа спыніцца. Усе ў школе ведаюць аб гэтым. Калі нічога не зменіцца, то праз некалькі гадоў ён трапіць у вязніцу.

Звычайныя дзеці. Звычайнае жыццё. Што далей? Гэта жыццё, якое яны выбралі, або лёс, ад якога не ўцячэш? Ці можна яшчэ нешта змяніць? Ці ўсё застанецца так, як ёсць?

А, забылася вам прадставіць сябе - мяне завуць Маргарыта. Я не апраўдваю сваіх памылак і не звальваю віну на іншых. Я жыву і вучуся быць шчаслівай. Мне ў гэтым дапамагае мая вера. Яна як маяк, указвае мне мэту майго жыццёвага шляху. Вельмі лёгка пацярпець крушэнне ў хвалях гэтага свету. Але ў мяне ёсць Хтосьці, Хто са мной, Ён ўва мне, Ён верыць у мяне і заўсёды, пры любых абставінах Ён верны мне. Яго завуць Езус Хрыстус.

Ці можна яшчэ штосьці змяніць у нашым жыцці? Ці ўсё застанецца так, як ёсць?

Але ж:

*Падыходзіць да Віталя.*

Віталь! Бог любць цябе! Ён не хоча, каб ты стаў алкаголікам. Калі ты будзеш жыць паводле Яго запаведзяў, ты станеш шчаслівым чалавекам.

*Падыходзіць да Ані*

Аня! Калі ты дазволіш, то Бог усё зменіць. Ты - каштоўная ў Яго вачах, Ён любіць цябе па-сапраўднаму.

*Падыходзіць да Валеры.*

Валера! Калі ты дазволіш, то Бог усё зменіць. Бог – твой шлях, ідзі і не спыняйся.

ВЯДУЧЫ: Я не ведаю, што яны выберуць. Ці захочуць усё змяніць, або іх жыццё застанецца ранейшым. Але Бог заўсёды дае шанс.

**Бог адказвае:**

Сёння мы даведаемся пра адну падзею, якая паказвае нам Бога, як справядлівага Суддзю, які за дабро ўзнагароджвае, а за зло карае. Справядлівы – гэта той, хто любіць і абараняе дабро, але не любіць і выракаецца зла. Пан Бог не толькі справядлівы, але і міласэрны, Ён ахвотна прабачае нам нашыя грахі, калі мы шчыра ў іх раскайваемся. К. чытае тэкст з Бібліі: **Быццё 6, 5-9, 17.** К. з дапамогай ілюстрацый падрабязна тлумачыць вучням падзеі, пададзеныя ў тэксце /фільм/.

К. пытае:

- Якім чалавекам быў Ной?
- Як дзейнічалі людзі, сярод якіх жыў Ной?
- Якое даручэнне атрымаў Ной ад Бога?
- Чаму Бог сказаў Ною пабудаваць каўчэг?
- Што адбылося пасля таго, як Ной пабудаваў каўчэг?
- Хто загінуў у водах сусветнага патопу?
- Чаму Бог выратаваў Ноя і яго сям’ю?

К. прымацоўвае да дошкі дапаможнікі наступнага зместу:

| |
|---|
| Пан Бог - Суддзя справядлівы: за добрае ўзнагароджвае, а за зло карае |
| Пан Бог - наш Міласэрны Айцец, Ён ахвотна прабачае нашыя грахі, калі мы ў іх шчыра раскайваемся |

У водах патопу загінула шмат людзей. Стыхійнае бедства - патоп для людзей быў апошнім шансам, каб яны шчыра раскаяліся ва ўчыненых грахах.

І калі  яны раскаяліся, то Пан Бог, наш Міласэрны Айцец прабачыў ім грахі і прыняў да сябе.

К. пытае:

- Як вы разумееце выраз: «Пан Бог - Суддзя справядлівы: за добрае ўзнагароджвае, а за зло карае»?
- Як вы разумееце выраз: «Пан Бог наш Міласэрны Айцец, Ён ахвотна прабачае нашыя грахі, калі мы ў іх шчыра раскайваемся»?

Вучні выказваюцца.

К. Праз 5 месяцаў, Пан, нагнаў вецер на зямлю, і каўчэг спыніўся на гарах Арарацкіх. Калі ж воды зусім адышлі, Ной са сваёй сям’ёй выйшаў на зямлю. Збудаваўшы ахвярнік Пану, Ной узяў з кожнай чыстай жывёлы, і з кожнай чыстай птушкі і прынёс на ўсеспаленне. І паставіў Бог запавет паміж Сабой і Ноем, што не будзе ўжо патопу на спусташэнне зямлі. І даўшы сімвал запавету, паклаў вясёлку Сваю на аблокі.

К. пытае ў вучняў:

- Як Ной аддзячыў Богу?
- За што Ной дзякаваў Богу?
- Які запавет заключыў Бог з Ноем?
- Што стала сімвалам запавету?

**Чалавек адказвае Богу:**

Пан Бог хоча, каб у нас было толькі добрае, каб мы заўсёды дзейнічалі высакародна і шчыра. Існуюць сучасныя каўчэгі, у якіх прысутнічае Сам Пан Бог, у якіх Ён ратуе веруючых у Яго ад патопу злога. К. пытае

– Ці ведаеце вы, пра які каўчэг ідзе гаворка? (касцёл)

К. паказвае ілюстрацыі касцёлаў, прымацоўвае іх да дошкі.

У наш час існуе мноства каўчэгаў – касцёлаў, якія пабудавалі людзі. Кожны, хто хоча, можа прыйсці і ўвайсці ў яго, сустрэцца з Панам Богам, Які прабачае нам грахі, калі мы ў іх шчыра раскайваемся, напаўняе нас асвячальнай ласкай. У касцёле мы слухаем Слова Божае, прымаем Пана Бога ў Святой Камуніі, адным словам, у касцёле Пан Бог ратуе нас. Усё залежыць ад выбару чалавека.

– Які выбар зробіш ты?

– Чаму нас навучыў Ной?

**Разважанне:**

– Як я разумею выраз: «касцёл – гэта каўчэг»?

– Што мне дапамагае прыходзіць у касцёл?

– Што мне перашкаджае прыходзіць у касцёл?

– Чаму я прыходжу ў касцёл?

**Пастанова.**

**Хатняе заданне:**

1. Раскажы сваёй сям’і і сябрам пра сусветны патоп, і запрасі іх у Касцёл на нядзельную святую Імшу.

2. Намалюй касцёл, у якім ты молішся, і напішы кароткую гісторыю твайго парафіяльнага касцёла.

**Заключная малітва:**

Псальм № 91(90).

## Тэма № 8 Толькі Бог аб’ядноўвае людзей. Бабілёнская вежа

**Дыдактычная мэта**:

Пазнаёміць вучня з біблійнай гісторыяй пра будаўніцтва бабілёнскай вежы. Вучань разумее, што Бабілёнская вежа з’яўляецца сімвалам чалавечай гардыні.

**Выхаваўчая мэта**:

Фарміраваць у вучню імкненне жыць у згодзе і еднасці з Богам і бліжнім.

**Матэрыялы**:

Біблія: **Быццё 11, 1-8.**, ілюстрацыя і фільм, якія паказвкюць падзеі біблійнага тэксту.

**Метады катэхэзы**:

Аналіз біблійнага тэксту, медытацыя вобраза, дапаможнік, дыскусія, сцэнка.

### Ход заняткаў

**Малітва:**

Малітва аб пакоры. Малітоўнік «Ойча наш» стр. 62

К. правярае хатняе заданне і паўтарае пройдзены матэрыял:

- Чаму Бог паслаў патоп на зямлю?
- Каго Бог выратаваў ад патопу?
- Чаму Бог выратаваў Ноя, што ў Ною падабалася Богу?

– Як Ной аддзячыў Богу за выратаванне?

– Што Бог абяцаў Ною?

– Які знак пацвярджае тое, што Бог больш не дапусціць сусветнага патопу?

Падзякуем Богу за тое, што Ён справядлівы і дапамагае добрым людзям. К. уводзіць вучняў у новую тэму.

**Чалавек пытае:**

Сцэнка «Рукі».

Дзве дзяўчыны і два хлопцы парамі стаяць на сцэне. Вядучы чытае словы, а акцёры адначасова ўсе паказваюць пад музыку.

Акт № 1

*Бог даў нам рукі.*
*Рукі, каб будаваць.*
*Рукі, каб любіць.*
*Рукі, каб дапамагаць.*
*Рукі, каб абараняць.*
*Але чалавек зрабіў усё па-іншаму.*
*Рукі, якія будавалі, сталі разбураць.*
*Рукі, якія любілі, сталі ненавідзець.*
*Рукі, якія дапамагалі, сталі абыякавымі.*
*Рукі, якія абаранялі, сталі забіваць.*
Канец першага акта

К. абмяркоўвае з вучнямі першы акт сцэнкі.

**Бог адказвае:**

К. пераходзіць непасрэдна да тэмы, ён чытае тэкст з Бібліі **Быццё 11, 1-8.** К. ілюструе вобразамі (фільм). К. пытае:

- Як жылі людзі пасля сусветнага патопу?
- Якое дрэннае жаданне зарадзілася ў сэрцах людзей?
- Чаму людзі хацелі дасягнуць неба?
- Што зрабіў Пан Бог, калі ўбачыў пыху людзей?

К. усё ў свеце мае сваё месца. Чалавек таксама мае сваё месца, ён з'яўляецца вянцом стварэння. Бог стварыў яго з любові і хоча раздзяліць з ім шчасце. Людзі бачылі моц і магутнасць Бога, і хацелі, каб у іх быў знак іх магутнасці і моцы, якую яны змаглі б паставіць нароўні з Богам. Спачатку чалавек захацеў паставіць нароўні з Богам сябе, гэта адбылося ў раі і мы памятаем, чым гэта скончылася – першародным грахом. Цяпер людзі заганарыліся і аб'ядналіся супраць Бога і рашыліся паставіць нароўні з Богам справу сваіх рук – Бабілёнскую вежу. Гэта не спадабалася Богу, і таму Бог змяшаў мовы, і яны не маглі зразумець адзін аднаго.

Дыскусія вучняў.

**Чалавек адказвае Богу:**

К. пытае:

1. Чаму вучыць нас гісторыя пра будаўніцтва Бабілёнскай вежы?
2. Калі мы становімся падобнымі да будаўнікоў Бабілёнскай вежы?
3. Што мы можам зрабіць для таго, каб нашыя сем'і не былі падобнымі да Бабілёнскай вежы?

4. Калі наша школа становіцца падобнай да Бабілёнскай вежы?
5. Што мы павінны зрабіць, каб наша жыццё не было падобным да Бабілёнскай вежы?

**Акт № 2**

*І тады Бог паглядзеў на Сваё стварэнне і працягнуў свету Свае рукі.*

*Але людзі прыбілі гэтыя рукі да крыжа.*

*І сказалі: " Застанься там!"*

*Але Ён не застаўся, Ён уваскрос.*

*І зараз Бог ходзіць па вуліцах нашых гарадоў*

*і працягвае свету Свае прабітыя рукі.*

*Што выбераш ты?*

*Паспрабуеш не бачыць?*

*Не чуць?*

*Ці аддасі Яму сваё сэрца?*

*Перад табой выбар.*

*Рукі. Бог даў нам рукі.*

*Рукі, каб будаваць.*

*Рукі, каб любіць.*

*Рукі, каб дапамагаць.*

*Рукі, каб абараняць.*

К. абмяркоўвае з вучнямі сцэнку. К. пытае:

- Які выбар зраблю я?
- У якіх выпадках мы патакаем, дапамагаем бліжняму чыніць злое?

– Ці будзем мы падштурхваць бліжніх чыніць злое?

– Хто па-сапраўднаму аб’ядноўвае нас?

Пан Бог, дабро і любоў яднаюць нас. Веруючыя людзі кожную нядзелю збіраюцца ў касцёле на святой Імшы, пазнаюць мову любові, мову даступную ўсім людзям і зразумелую для кожнага чалавека, незалежна ад узросту і нацыянальнай прыналежнасці. К. пытае:

– Што нам дапамагае падчас святой Імшы наблізіцца адзін да аднаго?

– Хто па-сапраўднаму нас яднае?

**Разважанне:**

Грахі іншых па нашай віне

- ❖ Ці загадваў грашыць?
- ❖ Ці намаўляў да граху?
- ❖ Ці дазваляў грашыць?
- ❖ Ці раіў грашыць?
- ❖ Ці хваліў грэх?
- ❖ Ці замоўчваў грэх?
- ❖ Ці не караў грэх?
- ❖ Ці дапамагаў грашыць?
- ❖ Ці абараняў грэх?

**Пастанова.**

**Хатняе заданне:**

1. Раскажы сваёй сям’і і сябрам біблійную гісторыю пра Бабілёнскую вежу.

2. Намалюй малюнак на тэму: «Божае адзінства». Напішы малітву пра адзінства з Панам Богам і бліжнімі.

**Заключная малітва:**

Псальм 131 (130).

## Тэма № 9. Пан Бог здзяйсняе план Збаўлення. Пакліканне Абрагама

**Дыдактычная мэта**:

Пазнаёміць вучня з біблійнай гісторыяй аб пакліканні Абрагама. Вучань ведае, што сумленне – гэта голас Бога ў чалавеку.

**Выхаваўчая мэта**:

Фарміраваць у вучню ўменне:

1. Заўсёды слухаць голас сумлення
2. Дзейнічаць паводле сумлення

**Матэрыялы**:

Біблія **Быццё 12, 1-7**, ілюстрацыя, якая паказвае падзеі біблійнага тэксту. Дапаможнікі.

**Метады катэхэзы**:

Аналіз біблійнага тэксту, медытацыя вобраза, прадстаўленне зместу ў выглядзе схемы, дыскусія.

### Ход заняткаў

**Малітва:**

Апостальскі сімвал веры

К. правярае хатняе заданне, паўтарае пройдзены матэрыял і ўводзіць вучняў у новую тэму.

**Чалавек пытае:**

- Чаму Бога называем справядлівым?

– Чым Бог хоча адарыць кожнага чалавека?

– Адкуль людзі ведаюць, што такое дабро і зло? (сумленне)

– Адкуль мы ведаем, як трэба дзейнічаць?

Вучні адказваюць на пытанні, К. акцэнтуе ўвагу на адказах, якія кажуць аб унўтраным голасе чалавека – сумленні, які нам падказвае, што з’яўляецца дабром, а што злом. Сумленне дапамагае нам выбіраць дабро і пазбягаць зла. К. на дошцы прымацоўвае дапаможнік наступнага зместу:

| |
|---|
| Сумленне – гэта ўнутраны голас чалавека.<br>Праз сумленне Бог кажа нам, што нам неабходна рабіць і чаго трэба пазбягаць.<br>Чалавек павінен заўсёды слухаць голас свайго сумлення і заўсёды дзейнічаць паводле яго. |

Вучні выказваюцца.

**Бог адказвае:**

Зараз мы пазнаёмімся з чалавекам, Які заўсёды слухаў голас Пана Бога ў сваім сэрцы. Яго завуць Абрагам. Спачатку Яго звалі Абрам. Пазней Сам Пан Бог даў яму новае імя – Абрагама. Падчас малітвы Абрагам, вельмі ўважліва слухаў Пана Бога, каб потым у жыцці выканаць волю Божую.

К. Чытае біблійны тэкст **Быццё 12, 1-7**, ілюструючы яго вобразамі /можна паказаць фрагмент з фільма/. Тлумачыць тэкст і задае вучням пытанні:

– Якое даручэнне Абрагам атрымаў ад Бога?

– Чаму заданне Бога было цяжкім для Абрагама?

– Як дзейнічаў Абрагам?

– Якую ўзнагароду ад Пана атрымаў Абрагам?

К. просіць вучняў прачытаць словы абяцання, якія Бог даў Абрагаму.

***«Твайму патомству дам гэтую зямлю»***

Гэта словы, у якіх Пан абяцае Абрагаму аддаць зямлю, якую Ён Сам хоча даць яму, а самае галоўнае – абяцае сына. З патомкаў Абрагама ўзнікне ізраэльскі народ. У гэтым народзе народзіцца Збаўца свету.

Пан Бог заўсёды выконвае Свае абяцанні. Усе абяцанні, якія Бог даў Абрагаму здзейсніліся: Абрагам з сям’ёй жыў у Ханаане, на зямлі, якую яму даў Пан. У старасці ў яго нарадзіўся сын.

К. пытае ў вучняў:

– Дзе Абрагам пачуў голас Бога? (сумленне)
– Што ў Абрагаме спадабалася Пану Богу? (быў паслухмяны, верыў Богу)
– Чаму мы можам навучыцца ад Абрагама? (даверу да Бога)
– Чым падобная наша вера да веры Абрагама?
– Што для нас сёння значаць словы «я веру Богу»?

Вучні выказваюцца.

**Чалавек адказвае Богу:**

К. прымацоўвае да дошкі дапаможнік наступнага зместу:

| Што людзям дапамагае заўсёды дзейнічаць паводле сумлення? |
|---|

Вучні пішуць на асобных картках свае адказы і прымацоўваюць іх пад дапаможнікам. К. зачытвае ўсе адказы і абмяркоўвае іх з вучнямі. К. пытае:

К. прымацоўвае да дошкі дапаможнік наступнага зместу:

| Што людзям перашкаджае заўсёды дзейнічаць паводле сумлення? |
|---|

Вучні пішуць на асобных картках свае адказы і прымацоўваюць іх пад дапаможнікам. К. зачытвае ўсе адказы і абмяркоўвае іх з вучнямі.

К. прымацоўвае да дошкі дапаможнік наступнага зместу:

| Што адчувае чалавек, які жыве ў згодзе са сваім сумленнем? | Што адчувае чалавек, які не жыве ў згодзе са сваім сумленнем? |
|---|---|

Вучні пішуць на асобных картках свае адказы і прымацоўваюць іх пад дапаможнікам. К. зачытвае ўсе адказы і абмяркоўвае іх з вучнямі. Напрыканцы К. пытае:

- Які выбар робім мы: « Жыць у згодзе са сваім сумленнем ці ж дзейнічаць супраць свайго сумлення?»

**Разважанне:**

К. пытае:

- Ці заўсёды я прыслухоўваюся да голасу свайго сумлення?
- Ці дзейнічаю я заўсёды згодна свайму сумленню?
- Што мне перашкаджае заўсёды дзейнічаць паводле сумлення?/чаго я павінен пазбягаць, што пераадольваць?/
- Што мне дапамагае заўсёды дзейнічаць паводле сумлення? /да чаго я павінен імкнуцца /

**Пастанова.**

**Хатняе заданне:**

1. Раскажы сваёй сям'і і сябрам біблійную гісторыю пра пакліканне Абрагама.
2. Кожны дзень вечарам рабі  рахунак сумлення. Калі твае ўчынкі былі згодныя з сумленнем, намалюй сэрца, а калі не, намалюй кляксу.




**Заключная малітва:**

Спантанная малітва, у якой вучні:

1. Дзякуюць Богу за дар сумлення.
2. Просяць прабачэння, што не заўсёды дзейнічалі паводле сумлення.
3. Просяць аб тым, каб заўсёды ішлі за голасам сумлення: пазбягалі злога і заўсёды рабілі дабро.

## Тэма № 10. Абрагам – айцец усіх веруючых

**Дыдактычная мэта**:

Пазнаёміць вучня з біблійнай гісторыяй пра ахвярапрынашэнне Абрагама. Вучань разумее, што Пан чакае ад чалавека паслухмянасці, таксама і ў вельмі цяжкіх жыццёвых сітуацыях.

**Выхаваўчая мэта**:

Выхоўваць гатоўнасць паслухмянасці Богу, і выканання волі Божай нават у вельмі цяжкіх сітуацыях.

**Матэрыялы**:

Біблія, **Быццё 22, 1-12**, ілюстрацыя, якая паказвае падзеі біблійнага тэксту– ахвярапрынашэнне сына. Дапаможнік.

**Метады катэхэзы**:

Аналіз біблійнага тэкста, медытацыя вобраза, прадстаўленне зместу ў выглядзе схемы, дыскусія.

### Ход заняткаў

**Малітва:**

Акт надзеі.

К. правярае хатняе заданне: «рабі дабро і пазбягай зла», вучні выказваюцца. К. паўтарае пройдзены матэрыял, асабліва падкрэслівае аспект паслухмянасці Абрагама Богу:

– Якое даручэнне даў пан Абрагаму?

– Чаму яно было складаным?

– Як дзенічаў Абрагам?

– Што дапамагло Абрагаму пазнаць голас Бога? /сумленне/

– Чаму мы павінны заўсёды слухаць голас сумлення?

К. уводзіць вучняў у новую тэму.

**Чалавек пытае:**

К. пытае ў вучняў:

– Якія складаныя даручэнні даюць вам вашыя бацькі?

– Што ў гэтых даручэннях самае складанае?

Вучні выказваюцца.

**Бог адказвае:**

К. сёння мы будзем гаварыць пра вельмі цяжкае даручэнне, якое Пан Бог даў Абрагаму. Гэта вельмі складанае выпрабаванне веры для Абрагама.
К. прымацоўвае да дошкі наступны дапаможнік:

| ПАН БОГ НІКОЛІ НЕ ПАМЫЛЯЕЦЦА, І НЕ ЎВОДЗІЦЬ НІКОГА Ў ЗМАН |
|---|

К. У гэтыя словы глыбока і шчыра верыў Абрагам. Абрагам вельмі доўга чакаў нараджэння свайго адзінага сына, ён кожны дзень маліўся Богу, каб Ён паслаў яму сына. Калі ў Абрагама нарадзіўся сын, ён быў шчыслівым і ўдзячным Богу за яго нараджэнне. Аднойчы Пан Бог выпрабаваў Абрагама, даў яму вельмі складанае даручэнне. К. чытае біблійны тэкст, ***Быццё 22, 1-13***, ілюструючы яго вобразамі /можна паказаць фрагмент з фільма/. К. пытае:

– Што Пан сказаў Абрагаму?
– Чаму гэта даручэнне было вельмі цяжкім для Абрагама?
– Што зрабіў Абрагам?
– Хто спыніў Абрагама, калі ён ужо хацеў прынесці ў ахвяру свайго сына?
– Што тады Пан сказаў Абрагаму?

**Чалавек адказвае Богу:**

Абрагам быў гатовы выканаць цяжкае даручэнне Пана Бога, хоць яму было вельмі складана, бо ён вельмі моцна любіў свайго доўгачаканага адзінага сына сына Ісаака. Абрагам гэтым учынкам паказаў Богу, што любіць Яго больш за ўсё на свеце, нават больш за роднага, адзінага і доўгачаканага сына. Гэты ўчынак спадабаўся Богу. Абрагам для нас з'яўляецца прыкладам веры і паслухмянасці Богу, яго называем айцом усіх веруючых людзей. Ён шчыра верыў Богу, ён ведаў, што ПАН БОГ НІКОЛІ НЕ ПАМЫЛЯЕЦЦА,
І НЕ ЎВОДЗІЦЬ НІКОГА Ў ЗМАН і таму Абрагам заўсёды і ва ўсім быў паслухмяны Пану Богу.

К. пытае вучняў:

– Чаму паслухмянасць Абрагама была такой вялікай?
– Чаму нас вучыць паслухмянасць Абрагама?

К. прыводзіць прыклад бязмежнага даверу Богу з жыцця. (Самае пераканаўчае сведчанне – гэта сведчанне з жыцця К.)

**Разважанне:**

– Як я выконваю цяжкія даручэнні Пана Бога?

– Што змянілася ў маіх адносінах да цяжкасцяў, якія ўзнікаюць у жыцці, пасля сённяшніх заняткаў?

– Чаму нас вучыць сваімі ўчынкамі Абрагам?

**Пастанова.**

**Хатняе заданне:**

1. Раскажы сваёй сям'і і сябрам біблійную гісторыю пра веру Абрагама.
2. Напішы малітву, у якой ты папросіш Пана Бога ўмацаваць тваю веру.
3. Прынясі фотаздымак тваёй сям'і або намалюй яе.

**Заключная малітва:**

Акт веры.

## Тэма № 11. Пакліканне Юзафа

**Дыдактычная мэта**:

Пазнаёміць вучня з біблійнай гісторыяй аб пакліканні Юзафа. Вучань ведае, што Пан Бог узнагароджвае чалавека за вернасць і давер.

**Выхаваўчая мэта**:

Фарміраваць у вучнях імкненне шукаць дапамогі ў цяжкіх сітуацыях у Бога. Выхоўваць давер і вернасць Богу.

**Матэрыялы**:

**Біблія Быццё 37, 1-20; 41, 1-57**, ілюстрацыя і фільм, якія паказваюць падзеі біблійнага тэксту.

**Метады катэхэзы**:

Аналіз біблійнага тэксту, медытацыя вобраза, дыскусія.

### Ход заняткаў

**Малітва:**

Акт надзеі.

К. правярае хатняе заданне, паўтарае пройдзены матэрыял і ўводзіць вучняў у новую тэму.

**Чалавек пытае:**

К. прапаноўвае вучням задумацца аб «маёй крыўдзе» і «чужой крыўдзе», просіць вучняў запоўніць табліцу:

**«Мая крыўда і чужая крыўда»**

| **Калі я крыўджуся:** | | **Калі я каго-небудзь крыўджу:** | |
|---|---|---|---|
| **Што раблю?** | **Што адчуваю?** | **Што раблю?** | **Што адчуваю?** |
| крычу | злосць | адыходжу | Шкадую |
| б’юся | гнеў | абвінавачваю іншага | Злараднасць |
| скарджуся | супраціўленне | Прашу прабачэння | Смутак |
| нічога не раблю | варожасць | нічога не раблю | Нянавісць |
| | | | |

К. абмяркоўвае з вучнямі адказы.

**Бог адказвае:**

1. Юзаф – улюбёны сын Якуба

К. уводзіць дзяцей у новую тэму. У Якуба была адна дачка і 12 сыноў, сярод якіх у яго быў любімы сын Юзаф, які любіў Пана Бога і жыў паводле Яго запаведзяў. Аднойчы айцец падараваў Юзафу вельмі прыгожае, рознакаляровае адзенне, братам гэта не спадабалася, яны зайздросцілі Юзафу і ўзненавідзелі яго, і нават не маглі з ім прыязна размаўляць.

Сны Юзафа

Юзаф Бачыў сон і расказаў братам, а яны яго яшчэ больш узненавідзелі. Ён сказаў ім: *«Вось, мы вяжам снапы, сярод поля; і вось, мой сноп устаў, і стаў прама; і вось, вашы снапы сталі вакол і пакланіліся майму снапу».*
І бачыў яшчэ іншы сон: *«Вось сонца, і месяц, і адзінаццаць зорак пакланяюцца мне».* Браты думалі, няўжо Юзаф будзе валадарыць над імі, і яшчэ больш узненавідзелі яго.

Браты прадаюць Юзафа

Аднойчы браты Юзафа пасвілі статак далёка ад дому. Якуб паслаў Юзафа праведаць братоў. Калі Юзаф набліжаўся да братоў, яны вырашылі забіць яго, але Рувім, адзін з братоў адгаварыў іх ад гэтага. Паблізу іх праходзіў караван купцоў і тады адзін з братоў па імені Юда прапанаваў прадаць Юзафа купцам. Усе згадзіліся і прадалі свайго брата за 20 срэбнікаў .

К. пытае:

- Колькі дзяцей было ў Якуба?
- Каго ён любіў найбольш?
- Як да Юзафа ставіліся яго браты? Чаму?
- Якія сны бачыў Юзаф?
- Што браты зрабілі з Юзафам?

Калі купцы прывялі Юзафа ў Егіпет, прадалі яго царадворцу, старшыні целаахоўнікаў фараона па імені Патыфар. Бог не пакінуў Юзафа, Ён адарыў яго ласкай. Дзеля Юзафа Бог благаславіў дом царадворца. Быў добрасумленным і добрым працаўніком. У яго закахалася жонка Патыфара і хацела схіліць яго да чужаложства, але Юзаф адмовіўся ад яе прапановы: **«Як жа я ўчыню гэта вялікае зло і зграшу перад Богам!»** К. акцэнтуе ўвагу на адказе Юзафа. Тады жонка Патыфара ўзвяла паклёп на Юзафа, і Патыфар адправіў Юзафа ў вязніцу. І там Пан Бог не пакінуў яго.

К. расказвае вучням чарговыя падзеі па біблійнаму тэксту **Быццё 41, 1-57**. (Можна паказаць фрагмент з фільма «Стварэнне свету»)

1. Сон фараона. К чытае **Быццё 41, 17-24**

2. Бог дае веданне Юзафу, і ён тлумачыць сны фараона.

3. Юзаф прызначаецца кіраўнікам усяго Егіпта.

Пан адказаў на малітвы Юзафа, прыйшоў да яго на дапамогу. Пан апекаваўся і клапаціўся пра Юзафа.

К. просіць вучняў падумаць над тым, якімі дарамі Пан Бог адарыў Юзафа, адказы запісваць на дошцы. К. пытае:

- Як Пан Бог апекаваўся Юзафам, які быў Яму заўсёды верным і маліўся да Яго?
- Чым Пан адарыў Юзафа? (давер фараона, мудрасць, веданне, Юзаф з нявольніка стаў кіраўніком усяго Егіпта).

Сёння Пан адказвае на нашыя малітвы, таму, што мы з'яўляемся яго дзецьмі. Бог нам заўсёды дапамагае і апякуецца намі.

К. пытае вучняў:

- Праз каго Пан апякуецца намі? (бацькі , настаўнікі, дактары, …)
- Што мы атрымліваем ад нашых апекуноў? Адказы запісваць на дошцы: (любоў, клопат, дом, ежа, веданне, здароўе, бяспеку…)

**Чалавек адказвае Богу:**

К. мы таксама можам быць Божым дарам для іншых:

- Кім мы можам апекавацца?
- Каму мы можам дапамагчы?

**Разважанне:**

- Ці ўдзячны я Пану Богу, за тое, што Ён пастаянна і нястомна клапоціцца пра мяне? У чым гэта выяўляецца?
- Ці ўдзячны я людзям, якія клапоцяцца пра мяне? (бацькі, настаўнікі, дактары, …) У чым гэта выяўляецца?
- Пра каго я клапачуся?
- Каму і як я магу дапамагчы?

**Пастанова.**

**Хатняе заданне:**

1. Раскажы сваёй сям'і і сябрам біблійную гісторыю пра Юзафа, пра тое, як Пан Бог дапамагаў яму.
2. Намалюй сцэны з жыцця Юзафа, якія табе найбольш спадабаліся і запомніліся, з моманту продажу яго ў няволю, да таго моманту, калі фараон прызначае Юзафа кіраўніком Егіпта.

**Заключная малітва:**

Спантанная малітва падзякі за людзей (абавязкова пералічыць іх пайменна), якія клапоцяцца пра нас.

## Тэма № 12. Пан Бог перамагае зло дабром

**Дыдактычная мэта**:

Пазнаёміць вучня з біблійнай гісторыяй аб сустрэчы Юзафа. Вучань разумее, што ў Пана Бога ёсць намер, план збаўлення, які Ён здзяйсняе праз паслухмяных Яму людзей.

**Выхаваўчая мэта**:

Фарміраваць у вучнях імкненне раскрываць, пазнаваць Божы намер і вучыцца прабачаць ад усяго сэрца.

**Матэрыялы**:

**Біблія Быццё 41, 37-48; 41, 54-57; 42, 1-25; 42, 36-38; 43, 1-34; 45, 1-15; 45; 50**, ілюстрацыя і фільм, якія паказваюць падзеі біблійнага тэксту. Прыгатаваць надпісы: ты не прабачыў, табе не прабачаюць, ты прабачыў, табе прабачылі

**Метады катэхэзы**:

Аналіз біблійнага тэксту, медытацыя вобраза, дыскусія, акраверш, праца з дапаможнікам.

### Ход заняткаў

**Малітва:**

“Малітва св. Францішка аб духу любові”, “Ойча наш” стр. 58

К. правярае хатняе заданне, паўтарае пройдзены матэрыял. З дапамогай малюнкаў, якія намалявалі вучні з жыцця Юзафа К. і вучні ствараюць фільм. Злучаюць усе малюнкі вучняў і дэманструюць іх па «тэлевізары». Фільм могуць паказваць двое вучняў, а астатнія займаюцца агучваннем сцэн.

К. уводзіць вучняў у новую тэму.

**Чалавек пытае:**

К. Прымацоўвае да дошкі надпісы:

ты прабачыў

табе прабачылі

ты не прабачыў

табе не прабачаюць

К. Просіць вучняў напісаць на чатырох картках пачуцці, якія яны адчуваюць калі, адпаведна надпісам: “Ты не прабачыў”… К. просіць вучняў прымацаваць адпаведна надпісам, пачуцці, якія ўзнікаюць. К. Чытае плакаты, якія атрымаліся і абмяркоўвае іх з вучнямі.

**Бог адказвае:**

К. усе пачуцці, пра якія мы з вамі гаварылі, прысутнічаюць у біблійнай гісторыі, якую сёння будзем праходзіць.

Браты зайздросцілі і ненавідзелі Юзафа. Гэта іх нянавісць прывяла да таго, што яны прадалі свайго брата ў няволю, а айца падманулі, сказаўшы, што Юзафа разарвалі дзікія звяры. Пан Бог не пакінуў Юзафа, прыйшоў да яго на дапамогу, і Юзаф стаў кіраўніком усяго Егіпта, другім чалавекам пасля фараона. Юзаф адразу ж  прыступіў да сваіх абавязкаў. Пакуль ішлі гады дастатку, ён збіраў у засекі запасы зерня, каб, калі прыйдуць галодныя гады, народ Егіпта не загінуў ад голаду.

1. Сем гадоў голаду

Праз сем гадоў па ўсёй зямлі надыйшоў голад. З усіх краін пачалі прыходзіць у Егіпет, каб купіць у Юзафа хлеба, таму што ён зрабіў ва ўсіх гарадах вялікія запасы зерня. Калі Якуб даведаўся, што ў Егіпце ёсць хлеб, паслаў дзевяць сваіх сыноў за зернем, пры сабе пакінуў Бэньяміна. Юзаф быў кіраўніком у Егіпце і ён прадаваў хлеб. Браты прыйшлі і пакланіліся яму да зямлі і папрасілі прадаць ім хлеб. Юзаф пазнаў сваіх братоў, а яны яго не пазналі. Юзаф зрабіў выгляд, што не пазнаў братоў, і сказаў ім, што яны выведнікі-шпіёны і прыйшлі, каб выглядзець слабыя бакі Егіпта. Браты ж казалі, што яны – сумленныя людзі, дзеці аднаго бацькі і іх малодшы брат застаўся дома. Юзаф загадаў узяць іх пад варту. На трэці дзень ён сказаў ім: "Калі вы людзі сумленныя, дык адзін брат з вас хай будзе трыманы ў доме, дзе вы ўвязьнены; а вы ідзеце, завязеце хлеб, з прычыны голаду ў сем'ях вашых; а брата вашага меншага прывядзеце да мяне, каб спраўдзіліся словы вашыя і каб не памерці вам". Так яны і зрабілі. І казалі яны адзін аднаму: і праўда ж, гэта кара нам за грэх супроць брата нашага; мы бачылі пакуту душы ягонай, калі ён маліў нас, але не паслухалі яго; за тое і прыйшла на нас бяда гэтая. Юзаф, пачуўшы гэтыя словы, выйшаў ад іх і заплакаў. Адпусціў іх дамоў з хлебам, і Сымона пакінуў.

2. Юзаф адкрываецца братам

Браты вярнуліся дадому да айца і ўсё яму расказалі. Якуб не згаджаўся адпускаць Бэньяміна. Але хутка хлеб скончыўся і Якуб вымушаны быў адправіць з сынамі ў Егіпет Бэньяміна. Браты прыйшлі ў Егіпет. Калі Юзаф убачыў Бэньяміна, ён выйшаў у іншы пакой і расплакаўся. Памыў свой твар ад слёз і наказаў слугам падаць для братоў вялікі пачастунак. Браты
ж збянтэжыліся і не маглі зразумець, чаму ён аказвае ім такі гонар. Нарэшце Юзаф быў ужо не ў сілах стрымлівацца. Ён голасна зарыдаў і сказаў братам: "Я – Юзаф. Ці жывы яшчэ бацька мой?" Збянтэжаныя браты не маглі нічога адказаць. Тады Юзаф сказаў: "Падыдзіце да мяне". Яны падышлі, і ён сказаў ім, К. Чытае з Бібліі: "Я – Юзаф, брат ваш, якога вы прадалі ў Егіпет; але цяпер не маркоцьцеся і не шкадуйце пра тое, што вы прадалі мяне сюды, бо паслаў мяне Бог перад вамі, каб захаваць вам жыцьцё; бо цяпер два гады голаду на зямлі: яшчэ пяць гадоў, калі ні араць, ні жаць ня будуць; Бог паслаў мяне перад вамі, каб пакінуць вас на зямлі і захаваць ваша жыцьцё вялікім

збавеньнем. Дык вось, ня вы паслалі мяне сюды, а Бог, Які і паставіў мяне бацькам фараону і гаспадаром ва ўсім доме ягоным і валадаром ва ўсёй зямлі Егіпецкай. Ідзеце хутчэй да бацькі майго і скажэце яму: так кажа сын твой Язэп: Бог паставіў мяне гаспадаром над усім Егіптам: прыйдзі да мяне, не марудзь; ты будзеш жыць у зямлі Гесэм і будзеш блізка ад мяне, ты і сыны твае, і сыны сыноў тваіх, і дробнае і буйное быдла тваё, і ўсё тваё; і пракармлю цябе там, бо голад будзе яшчэ пяць гадоў, каб не згалеў ты і дом твой і ўсё тваё”. Пасля гэтых словаў Юзаф упаў на шыю Бэньяміна і плакаў. Затым ён абдымаў і цалаваў усіх братоў. Ён любіў іх і ад усяго сэрца прабачыў ім усё зло, якое яны яму прычынілі.

3. Сустрэча Юзафа з айцом

Калі Якуб пачуў, што яго ўлюбёны сын Юзаф жывы, вельмі моцна ўзрадаваўся і разам з усімі дзецьмі і ўнукамі накіраваўся ў Егіпет. Юзаф запрог сваю калясніцу і выехаў насустрач ім. Убачыўшы свайго айца, ён упаў яму на шыю і доўга плакаў. Фараон аддаў Юзафу і яго сям’і лепшую частку Егіпецкай зямлі і пастаянна забяспечваў іх хлебам і ўсім неабходным.

К. пытае:

- Кім быў Юзаф у Егіпце?
- Хто даў Юзафу дар тлумачыць сны?
- Як рыхтаваўся да сямі гадоў голаду Юзаф?
- За чым прыйшлі ў Егіпет браты Юзафа?
- Як прайшла першая сустрэча Юзафа з братамі?
- Калі Юзаф адкрыўся сваім братам?
- Ці лёгка было Юзафу прабачыць сваіх братоў?
- Хто даў сілы Юзафу прабачыць братоў?

– Калі Юзаф адкрыўся братам, што ім сказаў?

– Хто паслаў Юзафа ў Егіпет?

– Навошта?

**Чалавек адказвае Богу:**

У Пана Бога ёсць намер адносна кожнага чалавека. У цяжкай сітуацыі чалавек думае, што Пан пакінуў яго, але на самой справе Бог заўсёды застаецца з чалавекам. К. пытае:

1. Што адбылося б, каб Юзаф адпомсціў сваім братам?
2. Чаму нас вучыць сваімі ўчынкамі Юзаф?
3. Якія высновы мы можам зрабіць, гледзячы на ўчынкі братоў Юзафа?

К. просіць вучняў скласці акраверш: "Любоў прабачае".

Вучні павінны запісаць у акраверш фразы, аб тым, як можна ажыццявіць выраз: "ЛЮБОЎ ПРАБАЧАЕ"

[redacted]

[redacted]

**Разважанне:**

Пан Бог любіць мяне і нястомна клапоціцца пра мяне.

– Ці памятаю я аб гэтым ў цяжкіх сітуацыях?

– Што я павінен зрабіць для таго, каб не чыніць зло бліжнім?

- Што мне неабходна зрабіць для таго, каб навучыцца прабачаць ад усяго сэрца?
- Хто для мяне з’яўляецца прыкладам таго, як трэба прабачаць?

**Пастанова.**

**Хатняе заданне:**

1. Раскажы сваёй сям’і і сябрам гісторыю пра тое, як Бог выбраў Юзафа для таго, каб выратаваць ад голаду сваю сям’ю.
2. Напішы малітву, у якой мы просім Бога аб тым, каб ён навучыў нас не чыніць зло бліжнім, і навучыў нас прабачаць ад усяго сэрца.

**Заключная малітва:**

Песня «Ізноў бачыш», Спеўнік Эмануэль стр. 53

## Тэма № 13. Бог кліча Майсея

**Дыдактычная мэта**:

Пазнаёміць вучняў з біблійным тэкстам, аб пакліканні Майсея і няволі ізраэльцян. Вучань разумее, што грэх з'яўляецца няволяй. Кожнага чалавека Пан Бог заклікае жыць у стане асвячальнай ласкі.

**Выхаваўчая мэта**:

Выхоўваем у вучню імкненне жыць у стане асвячальнай ласкі
і пазбагаць няволі граху.

**Матэрыялы**:

**Біблія, Зыход 3, 1-12**, ілюстрацыя і франмент з фільма, паказваючыя падзеі біблійнага тэксту. Дапаможнік.

**Метады катэхэзы**:

Аналіз біблійнага тэкста, медытацыя вобраза, дыскусія, незавершаныя сказы.

**Ход заняткаў**

**Малітва**:

Псальм 37 (36), 5-6

К. правярае хатняе заданне, паўтарае пройдзены матэрыял і ўводзіць вучняў у новую тэму.

**Чалавек пытае:**

Для таго, каб нам зразумець, што такое грахоўны палон і да чаго ён нас вядзе, паставім з вамі пантаміму. К. з вучнямі падрыхтоўвае і паказвае пантаміму.

*«Бог стварае чалавека, паказвае яму ўсё стварэнне і становіцца збоку. Нейкі час чалавек разглядае свет навокал яго, запускае птушак і г.д. З’яўляецца чалавек з надпісам ХЛУСНЯ. Ён прываблівае чалавека. Той дазваляе адзець яму на руку кайданы – стужачку ці бант. Другі канец ён трымае ў сябе. Затым уваходзіць другая спакуса – ЗАЙЗДРАСЦЬ, трэцяя – ЛЯНОТА, чацвёртая – НЯНАВІСЦЬ. Кожны адзявае чалавеку на руку і ногі сваю павязку і адыходзіць убок. Такім чынам, чалавек застаецца пасярэдзіне сцэны, а гэтыя чацвёра стаяць па двое з розных бакоў. Яны пачынаюць кіраваць ім, як марыянеткай. Чалавек спрабуе дзесьці ісці, рабіць нейкія рухі, але гэтыя чацвёра кантралююць яго. Чалавек, здзіўляючыся, нізка схіляецца. Уваходзіць Хрыстус. Ён падыходзіць ззаду і прасоўвае свае рукі ў банты. Чацвёра ўкрыжоўваюць Яго, але Хрыстус уваскрасае і вызваляецца ад бантоў. Усе чацвёра падаюць, быццам яны пераможаныя. Хрыстус пераможна ўзвышаецца над імі, чалавек становіцца перад ім на калені. Урачыстая музыка».*

К. абмяркоўвае з вучнямі змест пантамімы

**Бог адказвае:**

Сягоння мы даведаемся пра аднаго з сяброў Пана Бога — Майсея, які родам з ізраэльскага народа. Яго паклікаў Пан Бог, каб вывесці ізраэльцян з егіпецкай няволі. Пасля смерці Юзафа егіпцяне змянілі свае адносіны да ізраэльскага народа, яны прымушалі іх цяжка працаваць, будаваць велізарныя піраміды. Ізраэльцяне апынуліся ў няволі ў егіпцянаў. Егіпцяне,

ў дадатак, забівалі нованароджаных ізраэльскіх хлопчыкаў, каб іх колькасць зменшылася ў Егіпце. К. пытае:

- Як жывецца нявольніку?
- Што робіць нявольнік?
- Якія працы выконвае нявольнік?
- Пра што марыць нявольнік?

Ізраэльцяне кожны дзень старанна маліліся Пану Богу, просячы яго аб вызваленні з няволі. Пан пачуў малітвы ізраэльцян, паклікаў Майсея, каб праз яго вывесці свой народ з няволі. К. чытае біблійны сюжэт аб нараджэнні Майсея **Зыход 1, 15-22; 2, 1-25**, ілюструючы яго вобразамі /можна паказаць фрагмент з фільма/. К. пытае:

- Што зрабіла маці Майсея, калі ўжо немагчыма было яго хаваць?
- Хто знайшоў Майсея?
- Хто стала карміліцай Майсея?

К. Хоць Майсей рос у палацы фараона, ён ведаў, што паходзіць з ізраэльскага роду. Ён бачыў, як жорстка прыгняталі яго народ. Аднойчы Майсей заўважыў, як егіпцянін біў аднаго ізраэльцяніна. Майсей захацеў абараніць свайго суайчынніка. Ён забіў егіпцяніна, а затым схаваў яго цела ў пясок. На наступны дзень Майсей заўважыў, як сварыліся ўжо яго суайчыннікі. Ён запытаў у аднаго з іх: «Чаму ты б’еш свайго бліжняга?» Той адказаў: «Хто паставіў цябе судздзёю? Ці не думаеш ты забіць мяне, як забіў егіпцяніна?» Тады Майсей зразумеў, што аб гэтай справе ўжо даведаліся. Калі фараону данеслі аб тым, што здарылася, ён хацеў забіць Майсея. Але Майсей уцёк ад яго ў зямлю Мадыямскую. Там ён пазнаёміўся з Етрам і застаўся жыць у яго сям’і. Майсей пасвіў авечак у Етра і вось, што з ім здарылася: К.

чытае фрагмент з Бібліі: **Зыход 3, 1-12. К.** прымацоўвае да дошкі ілюстрацыю «Майсей і пылаючы куст». К. пытае ў вучняў:

- Што ўбачыў Майсей, калі пасвіў авечак у пустыні?
- Што незвычайнага было ў палаючым кусце?
- Чаму Майсей зняў свой абутак?
- Хто размаўляў з Майсеем з палаючага куста?
- Якое заданне даў Пан Бог Майсею?
- Што адказаў Майсей?
- Якое імя адкрыў Пан Бог Майсею?

К. прымацоўвае да дошкі дапаможнік:

| |
|---|
| Я СУТНЫ<br>Яхвэ |

«Я Сутны», азначае, што Пан Бог ёсць, быў і будзе заўсёды. Пан Бог з'яўляецца не толькі крыніцай усяго жывога, але Ён і ёсць Жыццё.

Майсей сумняваўся, ён лічыў сябе невартым такога вялікага задання. Ён сказаў Богу: «Хто я, каб мне ісці да фараона і вывесці з Егіпта сыноў Ізраэлевых?» На што Бог адказаў яму: «Я буду з табою». Майсей згадзіўся выканаць місію Пана Бога.

**Чалавек адказвае Богу:**

К. прымацоўвае да дошкі ілюстрацыю і дапаможнік наступнага зместу:



## ГРЭХ РОБІЦЬ ЛЮДЗЕЙ НЯВОЛЬНІКАМІ

К. пытае:

– Што такое грэх?

Адказы вучні запісваюць на дошцы. К. падсумоўвае адказы вучняў, акцэнтуе: сутнасць граху – гэта недахоп любові, даверу і веры ў Пана Бога, які выражаецца ў непаслухмянасці Богу, у парушэнні Божых запаведзяў. Грэх для чалавека з’яўляецца глабальнай катастрофай, яна як трэшчына, якая з’яўляецца ў чалавеку і разбурае адносіны з Богам, людзьмі і навакольным светам. Калі чалавек грашыць, ён трапляе ў няволю да злога духа, становіцца нявольнікам граху. Але Пан Бог не пакідае чалавека. Чалавек слабы, і яму не хопіць сілаў самому пераадолець у сабе. Яму неабходна Божая ласка, Божая дапамога. Гэтую дапамогу мы атрымліваем ад Пана Бога ў сакраманце пакаяння. Праз святара Пан Бог прабачае нам грахі і напаўняе нас бясцэнным дарам – асвячальнай ласкай. Ён заклікае нас жыць у стане асвячальнай ласкі, бо толькі яна робіць нас па-сапраўднаму свабоднымі і шчаслівымі.

К. пытае:

– Як ты разумееш выраз: «кожны хрысціянін павінен старацца быць заўсёды ў стане асвячальнай ласкі»?

– Калі чалавек губляе стан асвячальнай ласкі?

- Хто можа вярнуць чалавеку стан асвячальнай ласкі?
- У якім сакраманце?

У сапраўднага хрысціяніна ёсць дэвіз:

К. прымацоўвае да дошкі дапаможнік наступнага зместу:

| НІВОДНАГА МЕСЯЦА БЕЗ СВЯТОЙ СПОВЕДЗІ |
| --- |

К. раскладае на стале прыгатаваныя карткі з надпісамі:

- Малітва - Саперніцтва - Дать добрый совет
- Святая Імша - Зайздрасць - Плёткі - Сварка
- Сакрамант Пакаяння - Гнеў - Варажба - Прабачаць крыўды
- Падзяліцца з беднымі - Назапашванне багаццяў - Спачуваць
- Смяяцца над памылкамі іншых - Быць абыякавым
- Наведаць хворага - Навучыць неасвечанага і г.д.

К. прапаноўвае вучням, выбраць тое, што дапамагае нам жыць у стане асвячальнай ласкі.

**Разважанне:**

- Ці ўдзячны я Пану Богу за тое, што Ён вызваляе мяне з няволі граху? У чым гэта праяўляецца?
- Ці цаню я дар асвячальнай ласкі? У чым гэта выяўляецца?
- Што я павінен рабіць для таго, каб заўсёды быць у стане асвячальнай ласкі?

**Пастанова.**

**Хатняе заданне:**

1. Раскажы сваёй сям’і і сябрам аб тым, што ты даведаўся аб пакліканні Майсея, аб няволі ізраэльцян і аб жыцці ў стане асвячальнай ласкі.

2. Сімвалічна намалюй чалавека, які жыве ў стане асвячальнай ласкі і чалавека, які знаходзіцца ў няволі граху.

**Заключная малітва:**

Акт любові.

## Тэма № 14. Пан Бог выводзіць свой народ з егіпецкай няволі

**Дыдактычная мэта**:

Пазнаёміць вучня з біблійнай гісторыяй пра тое, як Пан Бог выводзіць свой народ з егіпецкай няволі. Вучань разумее, што Хрыстус - наша Пасха. Ён — Пасхальны Баранак, які вызваляе нас з няволі граху.

**Выхаваўчая мэта**:

Выхаваць пачуццё ўдзячнасці Езусу Хрысту за нашае вызваленне з грахоўнай няволі.

**Матэрыялы**:

Біблія. Усё неабходнае для пантамімы. Прэсны хлеб. Дапаможнік.

**Метады катэхэзы**:

Аналіз біблійнага тэксту, медытацыя вобраза, дыскусія. Пантаміма.

**Ход заняткаў**

**Малітва:**

Псальм 23 (22), 1-6.

К. правярае хатняе заданне, паўтарае пройдзены матэрыял і ўводзіць вучняў у новую тэму.

**Человек пытае:**

Паказаць урывак з фільма, у якім паказана вызваленне людзей з няволі – вяртанне чалавеку свабоды: вызваленне зняволеных з канцлагера з фільма

«Спіс Шыдлера», або ўрывак з дакументальных фільмаў аб вызваленні заложнікаў, мірных жыхароў.

Абмеркаванне сюжэта з вучнямі.

**Бог адказвае:**

Пан Бог паклікаў Майсея, каб вывесці свой народ з егіпецкай няволі. Майсей са сваім братам Ааронам накіроўваецца да фараона, каб адкрыць яму волю Бога. Майсей патрабаваў, каб фараон вызваліў габрэяў з няволі. Але фараон не хацеў адпускаць габрэяў, бо яны былі нявольнікамі, бясплатнай працоўнай сілай. З-за ўпартасці і нежадання фараона егіпцян спасціглі дзесяць жудасных пакаранняў:

1. Вада ў рацэ Ніл ператварылася ў кроў.
2. Жабы пакрылі егіпецкую зямлю.
3. Усё напоўнілася мошкамі.
4. З’явілася шмат сабачых мух.
5. Маравая язва.
6. На людзях і на жывёлах з’явіліся пухіры з нарывамі.
7. Град.
8. Саранча.
9. Цемра па ўсім Егіпце.
10. Смерць першынцаў.

Але сэрца фараона ўвесь час станавілася ўсё больш жорсткім, хоць сам і пакутаваў, але народ ізраэльскі не адпусціў. І тады Майсей папярэдзіў фараона аб самым страшным пакаранні за непаслухпянасць Богу: «Памрэ ўсялякі першынец у зямлі Егіпецкай», і так адбылося. Пан загадаў ізраэльцянам закалоць ягня, спячы і каб кожны член сям’і еў яго з прэсным

хлебам. Крывёю заколатага ягняці памазаць вушакі і перакладзіны дзвярэй дома. К. чытае **Зыход 12, 12-13**. Ізраэльцяне выканалі загад Бога. Апоўначы памерлі ўсе першанцы егіпцян, а дзеці ізраэльцян засталіся ў жывых. Пасха азначае пераход Бога. Ягнятка, якога елі ў гэту ноч называюць пасхальным.
З гэтага часу гэта ноч называецца Пасхальнай. К. прымацоўвае да дошкі гатовы дапаможнік наступнага зместу:

| ПАСХА |
|---|

К. І тады фараон адпусціў ізраэльцян. Кожны год ізраэльцяне павінны былі есці спечанае ягня з прэсным хлебам у гэта свята, успамінаючы сваё вызваленне з егіпецкай няволі.

К. пытае:

- Што Пан Бог паабяцаў ізраэльцянам?
- Што павінна была прыгатаваць кожная ізраэльская сям’я?
- Якое ягнятка павінны былі прынесці ў ахвяру? /К. акцэнтуе, што Пану Богу мы павінны дарыць самае лепшаее, што у нас ёсць/
- Ад чаго абараняла кроў ягняці?
- Як называлася ноч, у якую адбылося збаўленне ізраэльцян з егіпецкага палону?

К. пытае:

-- Каго нам нагадвае пасхальнае ягня?

-- Чаму Езуса Хрыста мы можам называць Баранкам Божым?

-- Хто першы назваў Езуса Хрыста Баранкам Божым?

Паслухайце словы св. Яна Хрысціцеля, якія ён сказаў пра Езуса. К. прымацоўвае да дошкі гатовы дапаможнік наступнага зместу:

# «ВОСЬ БАРАНАК БОЖЫ, ВОСЬ ТОЙ, ХТО БЯРЭ НА СЯБЕ ГРАХІ СВЕТУ»

– Як Ян Хрысціцель назваў Езуса Хрыста?

Езуса Хрыста мы называем Баранкам Божым, таму, што Ён аддаў за нас жыццё, праліў сваю кроў на крыжы, каб вызваліць нас ад вечнай смерці.

Падчас святой Імшы перад святой Камуніяй святар указвае нам на Цела Езуса Хрыста са словамі «Вось Баранак Божы, вось той, хто бярэ на сябе грахі свету…». Мы адказваем «Пане, я не варты, каб Ты ўвайшоў да мяне, але скажы толькі слова, і будзе аздароўлена душа мая».

– Што азначаюць гэтыя словы, як ты іх разумееш?

**Чалавек адказвае Богу:**

Пан хоча, каб мы часта прымалі Яго Цела.

У сапраўднага хрысціяніна ёсць дэвіз:

НІВОДНАЙ НЯДЗЕЛІ БЕЗ СВЯТОЙ ІМШЫ

– Як ты разумееш гэты выраз?

**Разважанне:**

– Ці ўдзельнічаю я кожную нядзелю і ў абавязковыя святы ў святой Імшы?

– Калі не, то па якой прычыне?

– Як я рыхтуюся да святой Імшы? (цудоўная магчымасць расказаць дзецям пра інтэнцыі)

– Ці ўважлівы я падчас святой Імшы?

– Як часта прымаю Пана Езуса ў святой Камуніі?

– Святая Імша для мяне…(закончыць сказ)

– Для таго, каб яшчэ лепш перажываць святую Імшу я …(скончыць сказ)

**Пастанова.**

**Хатняе заданне:**

1. Раскажы сваёй сям'і і сябрам біблійную гісторыю аб тым, як Пан Бог вызваліў ізраэльцян з егіпецкай няволі.
2. Падчас нядзельнай святой Імшы падзякуй Езусу Хрысту за тое, што ён – сапраўдны Баранак Божы, які бярэ на сябе грахі ўсяго свету, у тым ліку і твае.
3. Напішы малітву падзякі Езусу Хрысту за тое, што Ён выратаваў цябе ад смерці вечнай і праліў за цябе сваю Кроў.

**Заключная малітва**

Душа Хрыстова…

## Тэма № 15. Бог вядзе свой народ як Пан і Айцец

**Дыдактычная мэта**:

Пазнаёміць вучня з біблійнай гісторыяй пра тое, як Пан Бог вядзе свой народ у зямлю абяцаную:

1. Пераход праз Чырвонае мора.
2. Манна з неба.
3. Майсей здабывае ваду са скалы.

Бог вядзе свой народ да неба і нястомна апякуецца і клапоціцца пра чалавека.

**Выхаваўчая мэта**:

Фарміраваць у вучню веру ва ўсемагутнасць Бога, які можа зрабіць усё для выратавання чалавека. У цяжкіх сітуацыях не скардзіцца і не наракаць на Бога, а ў малітве з даверам прадстаўляць Богу свае просьбы.

**Матэрыялы**:

**Біблія: Зыход 12, 31-40; 13, 20-22;, 14, 5-22; 14, 23-31; 15, 1-18; 16, 1-31; 17, 1-7**. Ілюстрацыя і фільм, паказваючы падзеі біблійнага тэксту. Мапа. Дапаможнік.

**Метады катэхэзы**:

Аналіз біблійнага тэксту, медытацыя вобраза, дапаможнік, дыскусія, незакончаны сказ.

### Ход заняткаў

**Малітва:**

Хатняе заданне, малітвы вучняў.

К. правярае хатняе заданне, паўтарае пройдзены матэрыял і уводзіць вучняў у новую тэму.

**Чалавек пытае:**

К. пытае:

- Хто з вас бачыў фокус?
- Чым фокус адрозніваецца ад сапраўднага цуду?
- Хто з вас можа здзейсніць цуд? Напрыклад, частку мора зрабіць сушай, вырасціць манну на пустыні, здабыць ваду са скалы?
- Хто можа здзейсніць сапраўдны цуд?
- Хто з вас бачыў сапраўдны цуд?
- Кожную нядзелю падчас святой Імшы мы становімся сведкамі, сапраўднага цуду, якога?

**Бог адказвае:**

Сёння мы з вамі пагаворым пра сапраўдныя цуды, якія ўчыніў Пан Бог, каб выратаваць свой народ.

1. **Пераход праз Чырвонае мора. /ілюстрацыя/**

Пасля смерці першынцаў фараон спужаўся і адпусціў народ ізраэльскі з Егіпта. Бог павёў ізраэльцян праз пустыню, які вёў да Чырвонага мора. К. паказвае мапу. Толькі Пан Бог ведаў, куды весці свой народ. Ён ішоў перад ім удзень у слупе воблачным, уначы – у слупе вогненным. Пан Бог, не адлучаўся ад свайго народу. Але фараон пашкадаваў аб тым, што адпусціў ізраэльцян і пагнаўся за імі са сваім войскам. Хутка перад ізраэльцянамі з’явілася Чырвонае мора, і ім не было куды бегчы, егіпцяне пачалі даганяць іх. Народ Божы пачаў наракаць на Майсея, за тое, што ён вывеў іх з Егіпта. Але Майсей сказаў ім: « Ня бойцеся, стойце - і ўбачыце выратаваньне ад Пана, якое Ён дасьць вам і сёньня, бо Егіпцянаў, якіх вы бачыце сёньня, больш ня ўбачыце вавек ». Бог загадаў Майсею працягнуць руку да мора. К. чытае Біблію, **Зыход 14, 21 – 22**. Калі ўсе ізраэльцяне прайшлі па сушы сярод мора, Пан сказаў Майсею: « Працягні руку тваю на мора, і хай павернуцца воды на Егіпцянаў, на калясьніцы іхнія і на верхаўцоў іхніх ». Майсей зрабіў усё так, як сказаў яму Пан. Вода ў моры вярнулася на сваё месца і патапіла ўсіх егіпцян. Тады майсей і ўвесь народ заспявалі песню на хвалу вялікага Збаўцы. К. паказвае фільм з вышэйапісаным сюжэтам. К. пытае:

- Чаму фараон адпусціў ізраэльцян?
- Якой дарогай Бог вывеў ізраэльцян?
- Хто ведаў шлях у зямлю абяцаную?
- Якім чынам Пан Бог прысутнічаў сярод свайго народу?
- Фараон перадумаў і пагнаўся за ізраэльцянамі. Што адбылося далей?
- Чаму ізраэльцяне выратаваліся, а егіпцяне патанулі?
- У гонар каго Майсей і ўвесь народ заспявалі песню хвалы?
- Чаму нас навучыла гэты гісторыя? (К. акцэнтуе ўвагу на тым, што: неабходна спадзявацца на Бога – як Майсей; не наракаць – як гэта рабілі ізраэльцяне)

2. **Манна з неба. /ілюстрацыя/**

Ізраэльцяне працягвалі свой доўгі шлях па пустыні, і Пан Бог вёў іх. Тады народ пачаў наракаць на Майсея і яго брата Аарона, кажучы, што ў Егіпце ім было лепш, паколькі ў пустыні ім няма чаго есці. Пан Бог паклапаціўся пра ізраэльцян і сказаў ім, што вечарам яны будуць есці мяса, а раніцай – хлеб.
І так адбылося. Вечарам прыляцелі перапёлкі, і ізраэльцяне елі смачнае мяса, а раніцай Пан Бог даў хлеб з неба, які ў выглядзе крупы з’явіўся на паверхні пустыні, пасля таго, як выпарыўся іней. Ізраэльцяне назвалі яго «маннай».

К. пытае:

- Чаму ізраэльцяне пачалі наракаць?
- Што зрабіў Пан Бог?

Падчас кожнай святой Імшы Пан Бог дае нам сапраўдны Хлеб, Які не проста спаталяе голад, але дае вечнае жыццё. К. прымацоўвае да дошкі дапаможнік наступнага зместу:

| |
|---|
| Я ёсць хлеб жыцця …<br>Хлеб, які сыходзіць з неба, каб той, хто есць яго, не памёр. Ян 6, 48-51 |

- Хто сказаў гэтыя словы?

- Аб кім гавораць гэтвя словы?
- Езус Хрыстус з’яўляецца для нас … (закончыць сказ)

3. **Майсей здабывае ваду са скалы. /ілюстрацыя/**

Ізраэльцяне прыйшлі ў месца Рефідым, і аказалася, што там няма вады. Тады народ пачаў наракаць на Майсея, кажучы, каб ён даў ім вады. І Майсей стаў маліцца, каб Пан Бог дапамог яму. Тады Пан загадаў Майсею ўдарыць па скале. І Майсей зрабіў так, як сказаў яму Бог, і вада пацякла са скалы, і ўвесь народ спataліў смагу. К. пытае:

- Што пачаў рабіць народ, калі даведаўся, што няма вады?
- Што Майсей зрабіў для таго, каб з’явілася вада?
- Хто даў ваду ізраэльцянам?

К. пытае:

- Што агульнае ў гэтых трох гісторыях?
- Што кажа аб тым, што Пан Бог - усемагутны?
- Пераход праз Чырвонае мора, манна на пустыні, вада са скалы – усе гэтыя цуды зрабіў пан для таго, каб … (закончыць сказ)
- Што вам спадабалася ў паводзінах Майсея?
- Што вам не спадабалася ў паводзінах ізраэльцян?

**Чалавек адказвае Богу:**

К. Мы верым ва ўсемагутнасць Пана Бога, які чыніць цуды для таго, каб выратаваць чалавека і прывесці яго ў Валадарства Божае. Ён любіць і клапоціцца пра чалавека і чакае ад чалавека даверу, любові і ўдзячнасці.

**Разважанне:**

- Як часта я задумваюся аб тым, што Пан Бог заўсёды са мной?
- Як я паводжу сябе ў цяжкіх сітуацыях? Прывядзі прыклад.
- Ці спадзяюся я на Пана Бога ў цяжкіх сітуацыях?

– Што я выберу пасля сягонняшняй сустрэчы: маліцца і з даверам прасіць у Пана Бога дапамогі або наракаць?

– Як часта я дзякую Пану Богу за аказаную дабрыню, любоў і апеку?

**Пастанова.**

**Хатняе заданне:**

1. Раскажы сваёй сям’і і сябрам пра адзін з цудаў, які табе найбольш запомніўся.
2. На падставе сённяшняй катэхэзы зрабі малюнак на тэму: «Пан Бог чыніць цуды для Свайго народа»

**Заключная малітва:**

Малітва “Вазьмі, Пане…”, Малітоўнік “Ойча наш” стр. 46

## Тэма № 16. Пан Бог заключае Запавет на гары Сінай

**Дыдактычная мэта**:

Пазнаёміць вучня з біблійнай гісторыяй пра тое, як Пан Бог заключыў Запавет на гары Сінай. Дзесяць Божых запаведзяў – гэта ўказальнікі, якія паказваюць нам правільны шлях да Валадарства Нябеснага.

**Выхаваўчая мэта**:

Фарміраваць у вучню імкненне паглыбляць веру ў адзінага жывога Пана Бога і імкненне жыць паводле Божых запаведзяў.

**Матэрыялы**:

Біблія: **Другазаконне 5, 1-2. 5а.в-7.11а.12.16-21 а, Зыход 19, 7-8**. Ілюстрацыя і фільм, паказваючыя падзеі біблійнага тэксту. Дапаможнік. Узор дамовы на падключэнне мабільнай сувязі. Карцінкі, на якіх паказаны ідалы.

**Метады катэхэзы**:

Аналіз біблійнага тэксту, медытацыя вобраза, дапаможнік, дыскусія, незавершаны сказ

### Ход заняткаў

**Малітва:**

Псальм № 67 (66)

К. правярае хатняе заданне, паўтарае пройдзены матэрыял і ўводзіць вучняў у новую тэму.

**Чалавек пытае:**

К. паказвае вучням узор дамовы, і тлумачыць, з якіх частак складаецца дамова. Можа быць, дамова на падключэнне мабільнай сувязі або на меркаванне К. К. пытае:

- Што такое дамова?
- Чаму людзі заключаюць дамовы?
- Што абгаворваецца ў дамове?
- Чые правы абараняе дамова?
- Што адбываецца ў выпадку невыканання ўмоў дамовы?

**Бог адказвае:**

Чалавек створаны паводле Божага вобраза і падабенства. Пасля грэхападзення чалавека ў свет увайшлі зло, грэх, страх, хваробы, пакуты і смерць. Чалавек заблытаўся ў путах зла. Але Пан Бог не пакінуў яго. Ужо пасля грэхападзення Пан Бог абяцае людзям даць Збаўцу. Для гэтага Ён кліча Абрагама і яго патомкаў. Але людзі пастаянна адварочваюцца ад Бога, пакланяюцца не сапраўднаму Богу, але ідалам іншых народаў, прыносячы ім ахвяры. Пакідаюць Бога жывога, сапраўднага і пакланяюцца багам створаным чалавечымі рукамі. Гэтыя ідалы зроблены людзьмі з золата, срэбра, медзі, дрэва, каменя, гліны. У іх ёсць вусны але, яны не размаўляюць, у іх ёсць вушы, але яны не чуюць, у іх ёсць ноздры, але яны не дыхаюць, ёсць ногі, але не ходзяць, яны нежывыя, несапраўдныя. У іх няма ні сілы, ні жыцця, яны нічым не могуць дапамагчы людзям, а тым больш выратаваць іх ад грахоў. Пан адкрыўся ізраэльскаму народу, як адзіны, сапраўдны і жывы Бог. Ён — адзіны Збаўца, Ён — усемагутны Пан Бог. К. пытае:

- Ці могуць ідалы, зробленыя чалавечымі рукамі з золата, срэбра ці іншых матэрыялаў зрабіць што-небудзь для чалавека, а тым больш выратаваць яго ад грахоў? (можна выкарыстоўваць карцінкі ідалаў, звязаных з гісторыяй беларускага народа)

На гары Сінай Пан Бог заключыў з ізраэльцянамі больш чым дамову - Запавет. Запавет – гэта дамова аб узаемадапамозе, супрацоўніцтве і ўзаемнай павазе. К. чытае **Другазаконне 5, 1-2. 5а.в-7.11а.12.16-21 а, Зыход 19, 7-8**. К. пытае:

- Што адбылося на гары Сінай?
- Хто размаўляў з Панам Богам ад імя ізраэльцян?
- На чым былі запісаны словы Запавету?
- Хто перадаў людзям словы Запавету?
- Што Пан Бог загадаў людзям?
- Што адказалі Богу людзі?

Згодна гэтаму Запавету ізраэльцяне вераць толькі ў адзінага, жывога Пана Бога і пакланяюцца толькі яму, а Пан Бог абяцае ізраэльцянам, што будзе іх Богам, і дасць ім зямлю абяцаную. Той, хто захоўвае, жыве паводле Божых запаведзяў — шчаслівы чалавек, і Пан абяцае Яму Валадарства Нябеснае. Божыя запаведзі вучаць нас таму, што самым галоўным у нашым жыцці з’яўляецца Пан Бог. Ён наш Айцец, а мы — Яго дзеці. Божыя Запаведзі вучаць нас таму, як правільна дзейнічаць, як ставіцца да бліжніх і да навакольнага свету. Кожная Божая запаведзь абараняе заўсёды жыццё
і дабро, яна заўсёды супраць зла і смерці.

К. раскладвае карткі з выпісанымі Божымі запаведзямі (на адной картцы - адна запаведзь), просіць, каб кожны вучань выбраў сабе па адной картцы. Вучні па чарзе чытаюць і стараюцца растлумачыць іх, адказваючы на наступныя пытанні:

К. прымацоўвае да дошкі дапаможнік з пытаннямі

1. Каго або што абараняе гэта запаведзь
2. Чаму яна важная?
3. Ці можна без яе жыць? Чаму?
4. Якім чынам яна служыць чалавеку?
5. Як яна дапамагае жыць у грамадстве?

Кожны вучань выказвае сваё меркаванне. К. падсумоўвае іх адказы.

**Чалавек адказвае Богу:**

К. пытае:

- Навошта Пан Бог даў людзям запаведзі?
- Чалавек, які жыве паводле Божых запаведзяў… (закончыць сказ)
- Чалавек, які не захоўвае Божыя запаведзі… (закончыць сказ)

**Разважанне:**

Пан Бог хоча, каб кожны чалавек быў шчаслівы і таму Ён даў нам Свае запаведзі. Божыя запаведзі – гэта ўказальнікі, якія паказваюць нам правільны шлях, што вядзе нас да Валадарства Нябеснага. К. пытае:

- Як я выконваю першую запаведзь?
- Ці веру я толькі ў адзінага, жывога, сапраўднага Пана Бога?
- Ці малюся я кожны дзень?
- Як часта я чытаю біблію і каталіцкую рэлігійную літаратуру?
- Ці я веру ў забабоны?
- Ці звяртаюся да знахараў і чараўніц?
- Ці гадаю?

- Ці з павагай вымаўляю імя Пана Бога, Найсвяцейшай Панны Марыі і ўсіх святых.
- Што значыць, прысвяціць нядзельны дзень Пану Богу?
- У нядзелю і святы ці прымаю я ўдзел у святой Імшы?
- Як я паводжу сябе ў касцёле?
- Як я адношуся да бліжніх?

**Пастанова.**

**Хатняе заданне:**

1. Раскажы сваёй сям'і і сябрам пра тое, як Пан Бог заключыў з чалавекам Запавет, растлумач ім, што такое “ідалы”.
2. Намалюй каменныя скрыжалі, напішы на іх Божыя запаведзі.

**Заключная малітва:**

«Сімвал веры»

## Тэма № 17. Пан Бог прыводзіць выбраны народ у абяцаную зямлю

**Дыдактычная мэта**:

Пазнаёміць вучня з біблійнай гісторыяй уваходу ізраэльцян у абяцаную зямлю. Вучань разумее, што Пан Бог дае нам праваднікоў, якія суправаджаюць нас і вядуць да дому Айца.

**Выхаваўчая мэта**:

Выхоўваць у вучнях давер да Божых абяцанняў.

**Матэрыялы**:

Біблія, **Езус Навін 1-3**, група людзей, якія ідуць у паход.

**Метады катэхэзы**:

Аналіз біблійнага тэксту, медытацыя вобраза, дыскусія.

### Ход заняткаў

**Малітва:**

Псальм № 31 (30) 1 – 9

К. правярае хатняе заданне, паўтарае пройдзены матэрыял і ўводзіць вучняў у новую тэму.

**Чалавек пытае:**

К. правярае хатняе заданне і паўтарае пройдзены матэрыял. К. размяшчае на дошцы ілюстрацыю, на якой паказана група людзей, якая накіравалася ў паход у горы.

- Что паказана на гэтай карціне?
- Что трэба ўзяць з сабой у паход?
- Навошта патрэбна мапа?
- Што можа здарыцца падчас паходу?
- У чым заключаецца місія праваднiка?

− Чаго хочуць найбольш удзельнікі паходу?

− Як адчувае сябе чалавек, дасягнуўшы мэты

Падчас паходу самае галоўнае – цвёрда пераадольваць цяжкасці
і дасягнуць мэты.

**Бог адказвае:**

Майсей убачыў абяцаную зямлю, але не ўвайшоў у яе, ён памёр. Пасля доўгага падарожжа па пустыні ізраэльцяне, нарэшце, дайшлі да мэты. Езус Навін стаў правадыром ізраэльцян. Засталося толькі прайсці праз раку, якая аддзяляла іх ад абяцанай зямлі. Яна была глыбокая і бурлівая, яе немагчыма было прайсці. Ізраэльцяне бачылі абяцаную зямлю, але не маглі прайсці раку. К. пытае:

− Что рабіць?

К. накіроўвае дыскусію такім чынам, каб вучні прыйшлі да выніку, што трэба памаліцца, бо толькі пан Бог можа ім дапамагчы.

Езус Навін сказаў людзям, што Бог абяцае ім бяспечны пераход праз раку
і перамогу над сямю ханаанскімі народамі. Пан сказаў Езусу Навіну: К. чытае Біблію **Езус Навін 3, 13**: **«І як толькі святары, якія нясуць каўчэг запавету Пана ўсёй зямлі, паставяць свае ногі ў воды Ярдана, раздзеляцца воды і тыя, што цякуць зверху, стануць быццам вал».** Як толькі тыя, хто неслі каўчэг увайшлі ў Ярдан, і ногі святароў, якія неслі каўчэг паглыбіліся ў раку Ярдан, вада, што цякла зверху спынілася і стала сцяною, а вада высахла да дна ракі, і тады ўвесь ізраэльскі народ стаў пераходзіць па сухому дну ракі Ярдан. Падчас іх пераходу святары стаялі пасярэдзіне высахшай ракі, трымаючы на руках каўчэг запавету. Калі ўвесь народ прайшоў Ярдан, святары выйшлі з ракі,
і вада зноў пацякла па свайму рэчышчу.

Калі ізраэльцяне падышлі да Ерыхона, ерыхонскі кароль загадаў замкнуць усе брамы горада. Пан Бог сказаў Езусу Навіну, што аддасць ў іх рукі Ерыхон, але пры гэтым неабходна кожны дзень на працягу шасці дзён абыходзіць горад. Сем святароў павінны несці сем юбілейных труб перад каўчэгам, а ў сёмы дзень неабходна абысці горад сем разоў, пры гэтым

святары павінны трубіць у трубы. Калі затрубіць юбілейны рог, і калі пачуюць гук юбілейнай трубы, тады ўвесь народ павінен крыкнуць гучным голасам. Ізраэльцяне паслухалі Пана Бога і зрабілі ўсё так, як Ён ім сказаў.
К. чытае Біблію **Езус Навін 6, 19.**

К. пытае:

- Хто быў правадыром ізраэльцян пасля Майсея?
- Хто перавёў ізраэльцян праз раку Ярдан?
- Якім чынам ізраэльцяне перайшлі раку Ярдан?
- Што такое каўчэг запавету?
- Як ізраэльцяне ўзялі горад Ерыхон?
- Дзякуючы Каму ізраэльцяне перамаглі і дайшлі да мэты?

**Чалавек адказвае Богу:**

Нашае зямное жыццё – гэта падарожжа, канчатковай мэтай якога з'яўляецца дом нашага Нябеснага Айца – Нябеснае Валадарства:

- Што для нас з'яўляецца абяцанай зямлёй? (Дом Нябеснага Айца, Рай, Нябеснае Валадарства)
- Хто з'яўляецца нашымі праваднікамі да дому Айца? (Езус Хрыстус, Найсвяцейшая Дзева Марыя, святыя, Папа Рымскі, Біскупы, святары, законныя сёстры і браты, веруючыя людзі). Адказы запісваем да дошцы.
- З якімі цяжкасцямі мы сустракаемся на шляху да Нябеснага Валадарства?

Нашыя праваднікі да Нябеснага Валадарства кажуць нам, што неабходна рабіць, як дзейнічаць, каб дасягнуць мэты, і, калі мы іх слухаем, тады, як ізраэльцяне дасягнулі зямлі абяцанай, так і мы здабудзем Нябеснае Валадарства. К. пытае:

- Чаму нас вучаць нашыя праваднікі? (Біблія, Малітва, Запаведзі, святая Імша, Сакрамант Споведзі, Святая Камунія, урокі рэлігіі).

− Як я слухаю сваіх праваднікоў?

**Разважанне:**

На шляху да Нябеснага Валадарства, ёсць мноства знакаў, дзякуючы якім мы можам дасягнуць мэты.

− Што дапамагае мне здабыць Валадарства Нябеснае?

*Адказы запішы ў знакі:*



На аснове адказаў вучняў К. складае пытанні для разважання.

**Пастанова.**

**Хатняе заданне:**

3. Раскажы сваёй сям'і і сябрам пра адзін з цудаў, які запомніўся табе найбольш з сённяшніх заняткаў. Напішы для каго і як ты можаш быць праваднікам да Нябеснага Валадарства?
4. Напішы малітву за няверуючых людзей, каб яны здабылі веру і знайшлі дарогу, якая вядзе да дому Нябеснага Айца.

**Заключная малітва:**

Песня «Вядзі мяне, Божа» Спеўнік Эмануэль стр.25

## Тэма № 18. Пан Бог дапамагае міласэрнаму Тобію

**Дыдактычная мэта**:

Пазнаёміць вучня з біблійнай гісторыяй пра міласэрнага Тобія, які верна выконваў Божыя запаведзі. Пан Бог стварыў нябачны свет – анёлаў, каб яны праслаўлялі Бога і дапамагалі людзям у справе збаўлення.

**Выхаваўчая мэта**:

Фарміраваць у вучню імкненне жыць паводле Божых запаведзяў і чыніць справы міласэрнасці.

**Матэрыялы**:

Біблія**: Тоб. 1, 3а. 12. 17. 19-20; 2, 1а.2 б.; Тоб. 3, 1-4.; Тоб. 12, 6. 15. 18-22**. ілюстрацыя і фільм, паказваючыя падзеі біблійнага тэксту.

**Метады катэхэзы**:

Аналіз біблійнага тэксту, медытацыя вобраза, дапаможнік, дыскусія,

**Ход заняткаў**

**Малітва:**

*Пане Божа, май ласку паслаць нам на дапамогу святога арханёла Рафала. Верым, што ён заўсёды знаходзіцца перад абліччам Тваёй велічы, таму просім: няхай ён прадставіць Табе нашыя сціплыя малітвы, каб атрымалі мы благаслаўленне Тваё праз Хрыста, Пана нашага. Амэн.*

Малітва да св. Арханёла Рафала

К. правярае хатняе заданне, паўтарае пройдзены матэрыял і ўводзіць вучаня ў новую тэму.

**Чалавек пытае:**

Пантаміма «Жыццё, пабудаванае на Пану Богу»

На сцэне ў беспарадку валяюцца скрыні з адпісамі: Пан Бог, Багацце, Слава, Поспех, Прыгажосць, Веды, Сіла, Здароўе, Сяброўства, Сям'я, і г.д.

Дзеянее 1: выходзяць два будаўніка і складваюць скрыні як цагельную сцяну. Адзін з іх, узяўшы ў рукі скрыню з надпісам Пан Бог, адкідвае яе з-за непатрэбнасці. Задаволеныя пабудаванай сцяной, яны радуюцца.

Дзеянне 2: На сцэну выходзіць прыгожая дзяўчына і глядзіць на сябе ў люстэрка. Накіроўваючыся да выкладзенай сцяны, яна выпадкова яе збівае. Не заўважыўшы гэтага, яна адыходзіць са сцэны. Будаўнікі раззлаваныя і пачынаюць зноў выкладваць сцяну. Скрыню з надпісам Пан Бог яны зноў адкідваюць. Задаволеныя пабудаванай сцяной, яны радуюцца і любуюцца ёю.

Дзеянне 3: На сцэну ўвальваюцца двое п'яных. Ледзьве валочачы ногі, яны падаюць на выкладзеную сцяну і ламаюць яе. Будаўнікі разгневаныя, спрабуюць падняць і прагнаць іх. Можна зымправізаваць агульную звалку. Будаўнікі праганяюць п'яніц са сцэны, выпіхваючы іх штуршкамі. Будаўнікі злуюцца, але пачынаюць выкладваць сцяну, зноў адкінуўшы скрыню з надпісам Пан Бог. Ляпаючы адзін аднаго па плячу, яны радуюцца сваёй працы.

Дзеянне 4: На сцэну выбягаюць дзве хуліганкі (яны павінны быць адпаведна апранутыя). Налятаюць на будаўнікоў, збіваюць іх ударамі, разбіваюць сцяну. Затым выбягаюць прэч. Будаўнікі знясіленыя ад пабояў, паднімаюцца і зноў пачынаюць выкладваць сцяну. Яны зноў ігнаруюць скрыню з надпісам Пан Бог.

Дзеянне 5: На сцэну выходзіць дзяўчына з кнігай у руках. Убачыўшы пабудаваную сцяну, яна задумвае зламаць яе. Зрабіўшы выгляд, што яна паглынутая чытаннем кнігі, накіроўваецца да сцяны. Будаўнікі размахваюць рукамі, каб дзяўчына ўбачыла сцяну. Але яны ламае яе і з задаволеным выглядам адыходзіць са сцэны. Будаўнікі раззлаваныя і засмучаныя сваімі няўдачамі. Нарэшце, адзін з іх прапаноўвае пабудаваць сцяну на скрыні Пан Бог. Яны будуюць сцяну з гэтай скрыняй. Пабудаваўшы яе, з недаверам аглядаюцца па баках, чакаючы новых няўдач. Але навокал усё спакойна. Узрадаваныя будаўнікі, абняўшыся адыходзяць са сцэны.

К. абмяркоўвае пантаміму з вучнямі.

К. пытае:

− Што трэба рабіць. Каб быць шчаслівым чалавекам?

**Бог адказвае:**

К. У Святым пісанні апісана жыццё Тобія, чалавека, які заўсёды быў верны пану Богу і будаваў сваё жыццё на Божых запаведзях. К. чытае **Тоб. 1, 3а. 12. 17. 19-20; 2, 1а.2 б.** К. на аснове біблійнага тэксту просіць вучняў знайсці адказ на пытанне:

− Як жыў Тобій? /адказы запісваем на дошцы/

- Маліўся
- Памятаў пра бедных
- Хаваў памерлых
- Выконваў Божыя Запаведзі

- Любіў Бога
- Не грашыў
- і г.д..

У Тобія здарылася няшчасце, ён аслеп, бяльмо пакрыла яго вочы, лекары не змаглі яму нічым дапамагчы. У Тобія была адна надзея на Пана Бога. Тобій старанна маліўся Пану Богу К. чытае малітву Тобій: **Тоб. 3, 1-4**. Малітва Тобія была пачута, і Пан Бог паслаў арханёла вылечыць яго. Пан Бог стварыў нябачны свет – анёлаў, каб яны праслаўлялі Бога і дапамагалі людзям у справе збаўлення.

- Якое няшчасце спасцігла Тобія?
- На Каго найбольш спадзяваўся Тобій?
- Што Пан Бог зрабіў для Тобія?
- Хто такія Анёлы?
- Якая асноўная місія Анёлаў?

У Тобія быў сын Тобій. Бацька паслаў яго да Габаэля, якому ён аддаў на захаванне срэбра. Тобій сустрэў Рафала, але ён не ведаў, што Рафал быў анёлам. Тобій ва ўсім быў паслухмяным Рафалу. Дзякуючы гэтаму ён знайшоў  лек ад бяльма, і вызваліў сваю  нарачоную ад злога духа. Тобій забраў срэбра ў Габаэля і вярнуўся з Рафалам і сваёй нарачонай дамоў. Ён прыклаў жоўць рыбы да вачэй свайго айца і той пачаў бачыць. Яны хацелі падзякаваць Рафалу. Але Ён сказаў ім, К. чытае **Тоб. 12, 6. 15. 18 – 22.**
К. пытае:

- Да каго і навошта Тобій паслаў свайго сына?
- Каго сустрэў Тобій?
- Ці ведаў Тобій аб тым, што Рафал  з’яўляецца Арханёлам?

– Якія узаемаадносіны былі у Тобія і Рафала?

– Дзякуючы каму Тобій знайшоў лек ад бяльма?

– Што сказаў Рафал Тобію і яго сыну?

**Чалавек адказвае Богу:**

Пан Бог дапамог міласэрнаму Тобію і яго сям'і. Бог хоча, каб мы былі міласэрнымі. К. пытае:

– Якога чалавека мы можам назваць міласэрным?

Дыскусія.

Сягоння мы з вамі ўспомнім і паўторым «Учынкі міласэрнасці для цела бліжняга» і "Учынкі міласэрнасці для душы бліжняга". К. Прапаноўвае вучням:

*Выкарыстоўваючы словы з рамкі, напішы ўчынкі міласэрнасці, якія мы павінны чыніць для нашых бліжніх.*

**Учынкі міласэрнасці**

| **для цела бліжняга** | **для душы бліжняга** |
|---|---|
| 1. Накарміць ……………. | 1. ……………………….. грэшнікаў |
| 2. ……………. сасмаглых | 2. Вучыць ……..………………… |
| 3. Адзець ……..…………..…. | 3. Раіць …………………………… |
| 4. ………..... у дом падарожных | 4. Суцяшаць ………………..…… |
| 5. Адведаць ………………. | 5. Зносіць …..………….………… |
| 6. Суцяшаць …………………… | 6. Дараваць..……………………... |
| 7. ………… памерлых | 7. Маліцца ……………………….. |

**за жывых і памерлых, тым, хто сумняваецца, галодных, цела, вязняў, напаіць, настаўляць, нагіх, пахаваць, засмучаных, хворых, цярпліва знявагу, душы, прыняць, ахвотна крыўду, тых, хто не ведае.**

К. дзеліць дзяцей на 3 групы і прапаноўвае ім падрыхтаваць кароткія сцэнкі:

**Група 1**

1. Настаўляць грэшнікаў
2. Вучыць тых, хто не ведае

**Група 2**

3. Раіць тым, хто сумняваецца
4. Суцяшаць засмучаных

**Група 3**

5. Зносіць цярпліва знявагу
6. Дараваць ахвотна крыўду
7. Маліцца за жывых і памерлых

Вучні дзеляцца ўражаннямі ад сцэнкі.

**Разважанне:**

- Як я стаўлюся да бліжніх?
- Ці быў я ветлівым і зычлівым? У чым гэта выяўляецца?
- Ці я цікаўлюся патрэбамі іншых?

- Якія ўчынкі міласэрнасці я зрабіў для бліжніх?
- Каму я дапамог?

**Пастанова.**

**Хатняе заданне:**

1. Раскажы сваёй сям'і і сябрам біблійную гісторыю пра міласэрнага Тобія і яго сям'ю.
2. Напішы малітву, у якой ты папросіш Пана Бога, каб ён дапамог табе заўсёды чыніць учынкі міласэрнасці.
3. Напішы, якія ўчынкі міласэрнасці удалося табе здзейсніць на працягу тыдня.

**Заключная малітва:**

Малітоўнік "Ойча наш", "Малітва да святога Арханёла Міхала, апекуна Беларусі" стр. 85

## Тэма № 19. Самуэль – суддзя выбранага народу

**Дыдактычная мэта**:

Пазнаёміць вучня з біблійным тэкстам аб пакліканні Самуэля. Вучань выражае гатоўнасць служыць Богу і бліжнім.

**Выхаваўчая мэта**:

Фарміруем у вучню імкненне слухаць Пана Бога і выконваць Яго волю.

**Матэрыялы**:

Біблія **1 Кніга Самуэля 3, 1-14**, ілюстрацыя, паказваючая падзеі біблійнага тэксту або фільм.

**Метады катэхэзы**:

Аналіз біблійнага тэксту, медытацыя вобраза, дыскусія. Сцэнка. Дапаможнік.

### Ход заняткаў

**Малітва:**

Малітва да Духа Святога, "Ойча наш" стр. 46

К. правярае хатняе заданне, паўтарае пройдзены матэрыял і ўводзіць вучняў у новую тэму.

**Чалавек пытае:**

- Хто такі суддзя?
- Добры суддзя … /закончы сказ/.

К. раздае вучням аркушы для адказаў і просіць, каб кожны вучань насупраць учынка, зробленага нейкім чалавекам, напісаў адно з пакаранняў, якое ён лічыць найбольш справядлівым:

1. Штраф
2. Вязніца
3. Цялеснае пакаранне
4. Ссыланне за межы краіны
5. Не караць

| УЧЫНАК | ШТРАФ<br>СУМА | ЦЯЛЕСНАЕ<br>ПАКАРАННЕ<br>ЯКОЕ | ВЫГНАННЕ<br>З КРАІНЫ<br>НА КОЛЬКІ | ВЯЗНІЦА<br>ТЭРМІН | НЕ КАРАЦЬ<br>НАОГУЛ |
|---|---|---|---|---|---|
| КРАДЗЕЖ АЎТО | | | | | |
| НАНЯСЕННЕ ЦЯЖКІХ ЦЯЛЕСНЫХ ПАШКОДЖАННЯЎ | | | | | |
| ЗАБОЙСТВА | | | | | |
| КРАДЗЕЖ РЭЧАЎ З КВАТЭРЫ | | | | | |
| КРАДЗЕЖ У ГРАМАДСКІМ ТРАНСПАРЦЕ | | | | | |
| АБРАЗА АСОБЫ | | | | | |
| ПАКЛЁП | | | | | |

Вучні абменьваюцца сваім меркаваннем. К. пытае:

- Ці лёгка быць справядлівым суддзёй?
- Што аблягчае, а што ўскладняе справядлівыя дзеянні ў дадзенай справе?
- Якая інфармацыя неабходна для таго, каб дзейнічаць больш справядліва?

**Бог адказвае:**

Сягоння мы даведаемся пра чарговага старазапаветнага героя Самуэля, якога Пан Бог выбраў Суддзёю ізраэльскага народа. У ізраэльцян не было зямных каралёў, як у іншых народаў. Пан Бог быў адзіным і сапраўдным Каралём ізраэльскага народа. Але, каб дапамагчы Свайму народу, Пан заклікаў "Суддзяў", якія ратавалі ізраэльцян ад рук ворагаў і клапаціліся аб тым, каб народ быў верны Богу і жыў паводле Божых Загадаў. Анна, маці Самуэля, доўгі час заставалася бяздзетнай. Кожны год, у прызначаны час, яна хадзіла са сваім мужам Элканам у Сілон пакланіцца і прынесці ахвяру Пану. Аднойчы, калі яны зноў прыйшлі ў храм Пана, Анна расплакалася, і пачала слёзна маліцца і прасіць у Пана Бога аб нараджэнні сына. Яна абяцала Богу, што, калі ў яе народзіцца сын, яна аддасць яго на служэнне Пану Богу. Святар Ілля, які ў той час знаходзіўся ў храме, сказаў ёй: «Ідзі ў супакоі, і Бог здзейсніць тваё прашэнне». Праз год у яе нарадзіўся сын, яна назвала яго Самуэлем. Калі хлопчык падрос, яна прывяла і аддала яго ў храм святау Іллі на служэнне Пану Богу.

К. Пытае:

- Чаму плакала Анна, аб чым яна прасіла Бога і што Яму абяцала?

– Што адказаў святар Ілля Анне?

– Як Пан Бог адказаў на малітву Анны?

– Як выканала сваё абяцанне Анна?

Самуэль жыў у храме Пана, дзе знаходзіўся каўчэг Божы. Каўчэг Божы для ізраэльцян - Святое святых, бо ў ім захоўваліся скрыжалі Запавету, на якіх былі напісаны дзесяць Божых Запаведзяў. К. чытае ***1 Самуэля 3, 1-14***, пытае:

1. Чаму Самуэль прачнуўся?
2. Што зрабіў Самуэль, калі пачуў заклік?
3. Што Ілля адказаў яму?
4. Колькі разоў паўтаралася гэта сітуацыя?
5. Што Ілія параіў Самуэлю?

К. прымацоўвае да дошкі дапаможнік:

| |
|---|
| Кажы, Пане, бо слухае слуга Твой. |

– Што пачуў Самуэль, калі сказаў Пану: Кажы, Пане, бо слухае слуга Твой?

– Чаму нас вучыць прыклад Самуэля?

Самуэль быў паслухмяным Богу і быў гатовы заўсёды служыць яму, таму быў добрым Суддзёю ізраэльцян. Пан Бог даваў яму сілу і мудрасць прымаць справядлівыя і правільныя рашэнні.

К. тлумачыць, што кожны чалавек атрымлівае ад Пана Бога асаблівае заданне, напрыклад: стаць суддзёю, урачом, настаўнікам, кандытарам, мастаком, ваенным … Кожны чалавек павінен адкрыць у сабе Божую іскру, як гэта зрабіў Самуэль. Акрамя асаблівага задання кожны чалавек атрымлівае ад Пана Бога асаблівае пакліканне:

1. Стварыць сям'ю, быць айцом або маці
2. Стаць святаром або законнай сястрой
3. Застацца ў самоце, прысвяціць сябе любімай прафесіі

**Чалавек адказвае Богу:**

Мы павінны пачуць голас Божага паклікання і верна ісці за ім. А, каб яго пачуць, неабходна маліцца. У гэтым заключаецца шчасце кожнага чалавека: «Адкрыць свой шлях, прыгатаваны Панам Богам і верна прытрымлівацца Божага паклікання».

– Да чаго заклікае нас Пан Бог? /любіць, чыніць добрыя справы, паслухмянасць Богу, дапамога бліжнім …/

**Сцэнка «У кожнага сваё пакліканне»**

Акцёры МАЛАТОК, ПІЛА, ВІНТ, РУБАНАК, ЛІНЕЙКА, НАЖДАЧНАЯ ПАПЕРА.

Дзеянне: на сцэну выходзяць інструменты: МАЛАТОК, ПІЛА, ВІНТ, РУБАНАК, ЛІНЕЙКА, НАЖДАЧНАЯ ПАПЕРА. Яны ажыўлена спрачаюцца паміж сабой.
АЎТАР: У майстэрні ішоў дзелавы сход, удзельнічалі ўсе інструменты, кіраваў брат МАЛАТОК.
МАЛАТОК: Дысцыпліны няма! Дысцыпліна – самае галоўнае! Колькі можна пра гэта казаць! (стукае кулаком па стале).
АЎТАР: За пастаянны шум і грук вырашылі брата МАЛАТКА выдаліць. Брат МАЛАТОК нічога не пярэчыў, але ўсё ж заўважыў, што павінна выйсці і сястра ПІЛА.

МАЛАТОК: Хай ужо і сястра ПІЛА выходзіць. Гэтая зануда ўсё пiліць і пiліць сваімі павучаннямі (паказвае, як быццам пiліць). Усім надакучыла! Быццам бы яна – святая! Фарысейка сапраўдная.
ПІЛА: Не фарысейка я, не фарысейка. А справядлівая. Усё па тэме пілю, г.зн. гавару. Вам калі не гаварыць, дык вы і рабіць нічога не будзеце. Вось, напрыклад, брат ВІНТ, яго калі не круціць, то ён і з месца не ссунецца.
АЎТАР: Брат ВІНТ у сваю чаргу, звярнуў увагу на брата РУБАНКА.
ВІНТ: Я дык затое, калі працую, то ўглыб бяру. А вось брат РУБАНАК як робіць? Ён жа ўсё па паверхні, па паверхні (паказвае, як працуюць рубанкам)
РУБАНАК: Гэта я ды па паверхні? Ды вы лепш звярніце ўвагу на сястру ЛІНЕЙКУ. Яна толькі і робіць, што ходзіць ад аднаго да другога і ўсіх па сабе мерае.(РУБАНАК падыходзіць то да аднаго, то да другога і, стаўшы побач, спрабуе быць з гэтым чалавекам аднаго росту, дакладней, усіх мерае). Дакладна, толькі яна вы ўсім правая. Не так сказаў, не так зрабіў! А ужо сама сябе любіць расхвальваць! На фоне чужых недахопаў лепшай становіцца.
ЛІНЕЙКА: Так, я такая. Ну дык што? Затое я магу знаходзіць падыход да людзей, а вось сястра НАЖДАЧНАЯ ПАПЕРА вельмі рэзкая і вострая, усіх супраць шэрсці гладзіць.
НАЖДАЧНАЯ ПАПЕРА: Я крытыкую ўсіх шчыра, усім у вочы праўду кажу. Папраў кашулю (звяртаючыся да аднаго з братоў).
*Інструменты ўсе разам пачынаюць спрачацца паміж сабой, але пры першых словах* АЎТАРА змаўкаюць. Яны становяцца ў лінію і апускаюць галовы.
АЎТАР: Але тут у майстэрню зайшоў Сам Цясляр з Назарэту. Увайшоў, каб скончыць пачатую працу. Надзеў фартух, падыйшоў да варштата. І для сваёй працы Ён выкарыстоўваў і вінт, і наждачную паперу, і пілу, і лінейку, і малаток, і рубанак (Пры гэтых словах інструменты адзін за адным падымаюць галовы). Па заканчэнні працоўнага дня ўстала сястра ПІЛА і сказала астатнім.
ПІЛА: Браты і сёстры! Як бачна, у кожнага з нас асаблівае заданне, усе мы патрэбныя Богу
АЎТАР: Як гэта правільна! Як шмат людзей падобныя да гэтых інструментаў: хвалююцца, сварацца, і прыдзіраюцца адзін да аднаго, лічачы сябе больш важнымі і карыснымі, чым іншыя. Але Цясляр з Назарэту прымірыў усіх. Бо кожны важны і незаменны для Бога.

УСЕ разам: Мы ўсе патрэбныя Богу і патрэбныя адзін аднаму!

К. абмяркоўвае сцэнку з вучнямі.

**Разважанне:**

- Дзе я слухаю Божае слова?
- Да чаго кліча мяне Пан Бог? /любіць, чыніць добрыя справы …/
- Як я здзяйсняю Слова Божае?
- Чым я люблю займацца?
- Што ў мяне атрымліваецца найлепш?
- Як я выконваю свае абавязкі дома і ў школе?

**Пастанова.**

**Хатняе заданне:**

1. Раскажы сваёй сям'і і сябрам біблійную гісторыю пра Самуэля.
2. Інтэрв'ю. Выберы адну з тэм: «Пакліканне айца», «Пакліканне маці», «Пакліканне святара», «Пакліканне законнай сястры», «Прысвяціць сябе любімай прафесіі». Трэба ўзяць інтэрв'ю ў героя, які мае адпаведнае тэме пакліканне. У ім ты павінен раскрыць і паказаць прыгажосць паклікання.
3. Напішы малітву, у якой ты падзякуеш Богу за тое, што Ён давярае табе і папросіш, каб ты заўсёды слухаўся Яго і адкрываў сваё пакліканне.

**Заключная малітва**

"Адданне сябе Богу", "Ойча наш" стр. 45

## Тэма № 20. Давід – кароль выбранага народа

**Дыдактычная мэта**:

Пазнаёміць вучня з біблійнай гісторыяй пра Давіда – Караля выбранага народа. Вучань разумее, што чалавечае сэрца з'яўляецца скарбам Пана Бога.

**Выхаваўчая мэта**:

Фарміраваць у вучнях жаданне дабра і любові.

**Матэрыялы**:

Біблія, **1 Самуэля 16, 1. 4а. 6-7. 10-13**, ілюстрацыя, паказваючая падзеі біблійнага тэксту або фільм. Два куфэрачкі.

**Метады катэхэзы**:

Аналіз біблійнага тэксту, медытацыя вобраза, дыскусія.

### Ход заняткаў

**Малітва:**

Псальм № 23 (22)

К. правярае хатняе заданне, паўтарае пройдзены матэрыял і ўводзіць вучняў у новую тэму.

**Чалавек пытае:**

К. ставіць на стол два куфэрачкі: адзін прыгожы, прывабны, яскравы, але ўнутры пусты, а другі на выгляд просты, але ўтрымлівае ў сабе штосьці каштоўнае, напрыклад, пярліну. К. пытае:

– Як выглядаюць куфэрачкі?

– Чым яны адрозніваюцца?

– Які куфэрачак спадабаўся вам найбольш?

– Чаму менавіта ён?

К. адкрывае і паказвае змесціва куфэрачкаў. Прыгожы куфэрачак - пусты. Правярае другі куфэрачак, і ў ім аказваецца пярліна. Тое, што з'яўляецца каштоўным, заўсёды захоўваецца ўнутры куфэрачка. Той, хто хоча знайсці сапраўдны скарб, не можа кіравацца толькі знешнім выглядам куфэрачка, ён павінен памятаць, што скарб знаходзіцца ўнутры яго.

**Бог адказвае:**

К. сёння мы даведаемся пра тое, як ізраэльцяне прасілі Бога, каб Ён дапамог ім знайсці чалавека адказнага, які стаў бы іх каралём. К. пытае:

– Якім чалавекам, па-вашаму, павінен быць кароль?

– Што, па-вашаму, азначае валадарыць?

– Якога караля мы можам назваць добрым?

Мы ведаем, што ізраэльцянамі кіравалі суддзі, аднак народ хацеў, каб у іх быў кароль. Першым каралём стал Саўл, але ён аказаўся дрэнным каралём. Ізраэльцяне маліліся да Пана Бога, каб Ён дапамог ім знайсці добрага чалавека, які стаў бы добрым каралём. Паспрабуем сягоння разам з ізраэльцянамі знайсці такога чалавека і паглядзім, дзе Бог будзе яго шукаць. К. чытае біблійны тэкст **1 Самуэля 16, 1. 4а. 6-7. 10-13. К.**

К. прымацоўвае да дошкі вобраз Давіда, пастуха і караля.

– Каго прадстаўляюць гэтыя вобразы?

– Кім быў Давід?

– Што ў Давідзе спадабалася Пану Богу?

К. чытае вучням, якое даручэнне даў Бог Самуэлю, **1 Самуэля 16, 7**

К. прымацоўвае да дошкі гатовы дапаможнік наступнага зместу:

| |
|---|
| Я гляджу не так, як глядзіць чалавек; бо чалавек глядзіць на твар, а Пан глядзіць на сэрца. |

К. просіць вучняў растлумачыць, як яны разумеюць гэты выраз. К. пытае:

– На што звяртае ўвагу Бог, калі глядзіць на чалавека?

– Што занчыць «глядзець на сэрца»?

– Якое было сэрца Давіда, калі яно спадабалася Богу?

– Што спадабалася Богу ў Давідзе, калі ён яшчэ быў пастушком?

К. Пан Бог любіў Давіда і ва ўсім дапамагаў яму, Ён падараваў Давіду незвычайную перамогу. Філістымляне жылі па суседству з ізраэльцянамі, яны пакланяліся ідалам і вельмі часта нападалі на ізраэльцян, рабавалі іх, спальвалі палі і забіралі ў палон жанчын і дзяцей. К. чытае **1 Самуэля 17, 40 – 51,** ілюструючы яго вобразамі /можна пакаць фрагмент з фільма/.

К. пытае:

– З якой зброяй выйшаў на бітву з Галіятам Давід?

– Як Давід перамог Галіята?

– Хто падараваў перамогу Давіду ў бітве з Галіятам?

К. прымацоўвае да дошкі гатовы дапаможнік наступнага зместу:

| |
|---|
| Ты ідзеш на мяне з дзідаю, мячом і пікай, а я іду на цябе ў імя Пана Магуццяў, Бога войск Ізраэля |

– Чаму мы навучыліся на прыкладзе жыцця Давіда?

Пан Бог глядзіць на нашае сэрца, на нашыя паводзіны, думкі і словы. Давід быў добрым каралём для ізраэльцян. У першую чаргу ён памятаў аб тым, што адзіным і сапраўдным каралём яго і ізраільцян з'яўляецца Пан Бог. Давід уласным прыкладам вучыў паслухмянасці і вернасці Пану Богу. Цар Ён памятаў, што сам з'яўляецца слугою Пана Бога і валадарыць над сваім народам ад Яго імя. Кароль Давід любіў Пана Бога і напісаў вельмі шмат малітваў-псальмаў, якія мы спяваем на святой Імшы.

**Чалавек адказвае Богу:**

К. пытае:

– На што звяртаеш увагу, калі глядзіш на людзей?

– Як вызначаеш добры чалавек ці дрэнны?

– Што найбольш падабаецца табе ў людзях?

Сэрца чалавека з'яўляецца скарбам Бога, калі ў ім жывуць любоў
і дабрыня. Калі ўчынкі чалавека добрыя, то і ён добры.

К. прымацоўвае на спіне ў вучня карткі, на якіх дзеці пішуць, што яны цэняць адзін у другім. Кожны зачытвае свой спіс і кажа аб сваіх пачуццях.

**Разважанне:**

К. пытае:

– Якія мае ўчынкі падабаюцца Пану Богу?

– Што я павінен ужо сёння змяніць, палепшыць, каб маё сэрца стала сапраўдным скарбам Пана Бога?

**Пастанова.**

**Хатняе заданне:**

1. Раскажы сваёй сям'і і сябрам пра Давіда і аб тым, як Бог глядзіць на чалавека.
2. Намалюй сваё сэрца і напішы ў ім усё, што робіць яго сапраўдным скарбам для Пана Бога.

**Заключная малітва:**

Псальм № 144 (143)

**Тэма № 21.** Святыня Саламона як знак прысутнасці Бога сярод свайго народу

**Дыдактычная мэта**:

Пазнаёміць вучня з біблійнай гісторыяй пра караля Саламона, які пабудаваў Божую Святыню. Вучань разумее, што святыня – гэта знак прысутнасці Пана Бога сярод свайго народу.

**Выхаваўчая мэта**:

Выхаваць у вучнях пачуццё адказнасці за Дом Божы – касцёл, клапаціцца пра яго прыгажосць.

**Матэрыялы**:

Біблія **1 Кніга Валадарстваў 3, 7-9; 6, 14**, ілюстрацыя, паказваючая падзеі біблійнага тэксту або фільм.

**Метады катэхэзы**:

Аналіз біблійнага тэксту, медытацыя вобраза, дыскусія, сцэнка «Набажэнства».

**Ход заняткаў**

**Малітва:**

Псальм № 148 (147)

К. правярае хатняе заданне, паўтарае пройдзены матэрыял і ўводзіць вучняў у новую тэму.

**Чалавек пытае:**

Набажэнства.

Акцёры, каля дзесяці чалавек, голас святара
Рэквізіт ТЭХНІЧНАЕ ВЫКАНАННЕ: думкі парафіян могуць гаварыць два чалавека ў мікрафон (мужчынскі і жаночы галасы). Яны, канешне, павінны знаходзіцца не ў полі зроку гледачоў. Другі варыянт, больш складаны: усе думкі запісваюцца загадзя на касету, а падчас сцэнкі гучыць фанаграма.
Касцюмаў няма.
Дзеянне. На сцэне стаіць некалькі крэслаў, паказваючых лаўкі ў касцёле.
У касцёл заходзяць людзі, яны займаюць свае месцы. Іх думкі і размовы могуць быць прыкладна наступныя.
Дзве дзяўчыны: “ТЫ БАЧЫЛА, У ЧЫМ СЁННЯ ЯНА ПРЫЙШЛА? КРУТЫ ПРЫКІД! ЦІКАВА, КОЛЬКІ КАШТУЕ ЯЕ КАПЯЛЮШЫК?
Заходзіць хлопец, ён бачыць, што яго месца ўжо занялі. “ЗНОЎ СЕЎ НА МАЁ МЕСЦА. НУ, НІЧОГА, У НАСТУПНЫ РАЗ Я ПРЫЛЯПЛЮ НА ГЭТАЕ КРЭСЛА ЖВАЧКУ”.
Пачынаецца набажэнства, святар пачынае маліцца. У касцёл уваходзіць запыханая дзяўчына. “ОЙ, ЗДАЕЦЦА, Я ЗНОЎ СПАЗНІЛАСЯ”. Яна садзіцца, пачынаецца набажэнства.
ТРЭБА СХАДЗІЦЬ ДА СЯРГЕЯ ЗА НОВАЙ КАМП’ЮТЭРНАЙ ГУЛЬНЁЙ, КЛАСНА!
ТАК. НА ГЭТЫМ ТЫДНІ ТРЭБА ЗАПЛАЦІЦЬ ЗА ГАЗ І ЗДАЦЬ ПАЛІТО Ў ХІМЧЫСТКУ. А ШТО Ў НАС У АЎТОРАК?
ЗДАЕЦЦА, Я ПРАС ДОМА НЕ ВЫКЛЮЧЫЛА. ЦІ ВЫКЛЮЧЫЛА? НЕ МАГУ БОЛЬШ ТРЫВАЦЬ, ПАБЯГУ ДАДОМУ, А ТО Ў МЯНЕ СЭРЦА НЕ НА МЕСЦЫ.
НУ Й, КРАСУНЯ, НУ Й НАФАРБАВАЛАСЯ! І НЕ СОРАМНА!

Я ХАЧУ ЕСЦІ, КАЛІ Ж ГЭТА ЎСЁ СКОНЧЫЦЦА!

Адзін з парафіян засынае, схіліўшы галаву на плячо суседу. Яго расштурхваюць, ён прачынаецца

І так праходзіць усё набажэнства. Можна прыдумаць яшчэ шмат цікавага.

К. пытае:

– Што мы зразумелі з гэтай сцэнкі?

**Бог адказвае:**

К. пытае:

– Хто з вас бачыў, як будуюць дом?

– Што патрэбна для яго будаўніцтва?

– З якога матэрыялу будуюць дом?

Сёння мы даведамемся пра тое, як кароль Саламон будаваў «дом» для Пана Бога. Кароль Саламон быў сынам караля Давіда і яго спадкаемцам. Ён жыў у г.Ерузалеме – сталіцы краіны. Ён таксама як і кароль Давід пісаў псальмы, у якіх праслаўляў Пана Бога. Яшчэ кароль Саламон адрозніваўся мудрасцю, гэты дар ён атрымаў ад Бога. Калі Саламон стаў каралём, ён хацеў быць справядлівым і добрым і ён сам маліўся Пану Богу і прасіў для сябе мудрасці, каб справядліва і мудра кіраваць народам. К. чытае **1 Кніга Валадарстваў 3, 7-9**. Гэта вельмі спадабалася Богу, таму што, з’яўляючыся каралём, Саламон не клапаціўся аб уласнай славе або багацці, не прасіў у Пана доўгіх дзён жыцця, а клапаціўся пра свой народ. І таму Пан надзяліў Саламона незвычайнай мудрасцю. Бог выбраў Саламона, для таго, каб ён пабудаваў Дом Пана, які будзе называцца святыняй. Сам кароль жыў у цудоўным палацы і вырашыў, што святыня Божая павінна быць нашмат

прыгажэйшай і багацейшай, чым яго палац. Саламон пачаў збіраць матэрыялы: золата, срэбра, каштоўныя камяні, дрэвы кіпарыса і кедра. Калі сабраў матэрыялы, запрасіў самых лепшых майстроў, архітэктараў, будаўнікоў і цесляроў. І пачалося будаўніцтва цудоўнай святыні. Будавалі святыню сем гадоў, пры гэтым, вельмі стараліся, бо будавалі для самога Пана Бога. К. прымацоўвае да дошкі дапаможнік з відарысам Святыні. Унутры святыні было месца, называнае дэбір, Святое-святых, абкладзенае чыстым золатам і прадвызначанае для каўчэга Запавету. Падлога святыні таксама была пакрыта золатам.

К. пытае:

- Чаму Саламон хацеў пабудаваць для Пана Бога цудоўную святыню?
- Чаму для будаўніцтва святыні ён выкарыстоўваў самы лепшы матэрыял?
- Чаму ён выбраў самых лепшых майстроў?
- Якое месца ў святыні было самым важным?
- Чаму гэта месца самае святое ў святыні?
- Чаму вучыць нас кароль Саламон?

**Чалавек адказвае Богу:**

К. пытае:

- Чаму людзі будуюць святыні?
- Хто ў іх жыве?
- Чаму святыня для нас з’яўляецца святым месцам?

– Якая розніца паміж нашым домам і домам Пана Бога?

– Чаму мы павінны старацца, каб нашыя святыні былі прыгожымі?

– Што мы павінны для гэтага рабіць?

К. звяртае ўвагу на будаўніцтва і рэстаўрацыю нашых святынь, таксама на дэкарыраванне і прыбіранне касцёлаў і прылягаючых тэрыторый.

К. прапаноўвае вучням напісаць правілы: «Як паводзіць сябе ў Доме Божым» з дапамогай наступных пытанняў:

– Чаму мы прыходзім у касцёл?

– Што мы павінны рабіць у касцёле?

– Як мы павінны паводзіць сябе ў касцёле?

– У якім выглядзе мы павінны прыходзіць у касцёл?

– Чаго нельга рабіць у касцёле?

**Разважанне:**

К. Пан Бог хоча, каб нашыя сэрцы сталі Яго святыняй. К. пытае:

– Калі маё сэрца становіцца святыняй Бога?

– Што я павінен зрабіць для таго, каб маё сэрца стала годнай святыняй Пана Бога?

– Чаму я навучыўся на прыкладзе цара Саламона?

**Пастанова.**

**Хатняе заданне:**

1. Раскажы сваёй сям'і і сябрам біблійную гісторыю пра тое, як кароль Саламон пабудаваў святыню для Пана Бога.
2. Намалюй свой парафіяльны касцёл і табэрнакулюм, у якім захоўваецца Святое-святых касцёла – Найсвяцейшы Сакрамэнт.

**Заключная малітва:**

У спантаннай малітве падзякуем Пану Богу за тое, што ёсць касцёл, за тое, што мы можам прыходзіць і маліцца. Памолімся таксама за будаўнікоў нашага касцёла, за ўсіх дабрачынцаў, якія сваімі ахвяраваннямі, малітвамі і працай берагуць прыгажосць нашага касцёла. «Ойча наш».

## Тэма № 22. Прарок Ілля – сведка сапраўднага Бога

**Дыдактычная мэта**:

Пазнаёміць вучня з біблійным тэкстам пра пакліканне прарока Іллі. Вучань разумее пакліканне і місію прарока – сведку сапраўднага Бога.

**Выхаваўчая мэта**:

Фарміруем у вучню свядомасць таго, што Пан Бог дапамагае заўсёды грэшніку, каб ён навярнуўся. Бог заўсёды шукае шляхі да сэрца чалавека.

**Матэрыялы**:

Біблія **1 Валадарстваў 18, 18-39**, ілюстрацыя, паказваючая падзеі біблійнага тэксту або фільм.

**Метады катэхэзы**:

Аналіз біблійнага тэксту, медытацыя вобраза, дыскусія. Пантаміма.

### Ход заняткаў

**Малітва:**

*Не нам, Пане, не нам, але імені Твайму дай славу, за міласэрнасць Тваю і вернасць. Навошта, каб язычнікі казаді: Дзе ж іхні Бог? Бог наш у нябёсах, чыніць усё, што захоча. Іхнія ідалы – гэта срэбра і золата, справа рук чалавечых. Маюць вусны, але не гавораць, маюць вочы, але не бачаць.*

Псальм 115 (113B), 1-5

К. правярае хатняе заданне, паўтарае пройдзены матэрыял і ўводзіць вучняў у новую тэму.

**Чалавек пытае:**

К. Я хачу вам расказаць праўдзівую гісторыю пра дзяўчынку Насцю. Ёй было 8 гадоў, яна вельмі часта хварэла, яе бацькі і бабуля часта вадзілі яе да бабак-шаптух, ім здавалася, што яны могуць дапамагчы вярнуць здароўе Насці. Яна яшчэ не ўмела маліцца і не хадзіла ў касцёл. Як толькі Насця заходзіла ў пакой, дзе знаходзілася бабка, яе ахопліваў незразумелы страх, яна хацела, каб бацькі абаранілі яе ад страху, але яны яе не разумелі. Ёй было вельмі непрыемна, балюча, самотна і страшна. Яна прасіла бацькоў не вадзіць яе да бабак і казала ім пра свой страх, але бацькі не згаджаліся. У 10 гадоў Насця прыступіла да Святой Камуніі, яна ужо ведала, што ў яе з’явіўся новы ўсемагутны сапраўдны Сябар, да Якога яна звярталася са сваімі просьбамі ў малітве. Аднойчы яе бабуля абяцала ёй, што павядзе яе да бабкі апошні раз, і Насця згадзілася. Яна вельмі моцна ўзрадавалася, што больш яе не будуць прымушаць ісці да бабак. Зайшоўшы ў пакой, яна зноў адчула гэта пачуццё незразумелага страху пачала пра сябе шчыра ад усяго сэрца маліцца, бо яна знала, што толькі Пан Бог можа дапамагчы ёй па-сапраўднаму. Бабка пачала нешта шаптаць, але ў яе нічога не атрымлівалася і ўрэшце яна сказала, што яна перад Насцяй – бяссільная, апраўдваючы гэта нейкай незразумелай моцай, якую назваць па імені яна баялася.  З той пары Насцю па бабках-шаптухаха больш не вадзілі.

К. абмяркоўвае з вучнямі гэту гісторыю. Акцэнтуе ўвагу на тым, што толькі Пан Бог можа дапамагчы чалавеку, што забабоны, варажба, загаворы з’яўляюцца грахом, і яны выклікаюць на чалавека страшную бяду, яны наклікаюць на чалавека злога духа.

**Бог адказвае:**

Пасля смерці караля Саламона вера ізраэльцян аслабла. Яны не клапаціліся аб сваёй святыні, рэдка яе наведвалі, мала маліліся, не слухалі Божае слова, якое заўсёды чыталася ў святыні. Людзі пачалі забываць пра Пана Бога і пра Яго запаведзі. Яны нават пабудавалі сабе іншую святыню,
у якой пакланяліся нежывому ідалу, якога звалі Баал, яго зрабілі з дрэва. Пан Бог, аднак, не пакінуў людзей у граху, але прыйшоў да іх з дапамогай. Ён паслаў да ізраэльцян вернага чалавека, свайго выбранніка Іллю, які заклікаў усіх звярнуцца да жывога і сапраўднага Бога. К. пытае:

− Хто такія пракорокі?

− Якая іх асноўная місія?

Прарок Ілля нагадваў людзям аб Божай любові, аб цудах, якія ўчыніў Пан для свайго народу, але яго не хацелі слухаць, а некаторыя прыхільнікі Баала нават хацелі яго забіць. К. чытае **1 Валадарстваў 18, 18-39.** К. пытае:

- Што пабудавалі святары Баала?
- Аб чым яны прасілі свайго бога?
- Чаму Баал не адказаў на іх просьбу?
- Аб чым Ілля прасіў сапраўднага і жывога Бога?
- Як Бог адказаў на яго просьбу?

К. прымацоўвае да дошкі дапаможнік, на якім паказаны фрагмент, як пан Бог дае агонь з неба.

--Што сказалі пра Пана Бога людзі, якія бачылі ўсё, што адбывалася?

Адказ вучні запісваюць на дошцы.

К. пытае:

- Чаму навучыў ізраэльцян цуд, які здзейсніў Пан?

**Чалавек адказвае Богу:**

- Якую запаведзь парушылі ізраэльцяне, пакланяючыся ідалу Баалу?

К. прымацоўвае да дошкі дапаможнік:

| Я – Пан Бог твой, не будзе ў цябе іншых багоў апроч Мяне |
| --- |

К. пытае:

- Калі мы выконваем першую Божую запаведзь? (Любім Пана Бога, верым у пана Бога, прымаем Яго ў Святой Камуніі, слухаем пана Бога, размаўляем з Ім у малітве, пазнаём Бога праз чытанне Бібліі на занятках па рэлігіі, калі чытаем кнігі і рэлігійныя часопісы, калі не верым у забабоны і не звяртаемся да варажбітаў).
- Калі мы парушаем першую Божую запаведзь?
- Каго Пан Бог пасылае да нас сягоння, каб нагадаць нам аб Сабе, аб Сваёй любові да нас?

**Разважанне:**

- Чаму я навучыўся з біблійнай гісторыі пра прарока Іллю?
- Як я выконваю першую Божую запаведзь? (можна выкарыстоўваць пытанні з малітоўніка «Ойча наш» стар. 227-230)
- Да каго мяне пасылае Бог, каб я гаварыў аб Яго любові?

**Пастанова.**

**Хатняе заданне:**

1. Выканай місію прарока для сваёй сям'і і сяброў, раскажы ім пра прарока Іллю і пра першую Божую запаведзь.
2. Намалюй малюнак на тэму: «Першая запаведзь у маім жыцці»

**Заключная малітва:**

Аднаўленне абяцанняў, дадзеных падчас хросту.

Малітоўнік "Ойча наш", "Малітва да святога Арханёла Міхала, апекуна Беларусі" стр. 85

## Тэма № 23. Абвяшчэнне прыйсця Збаўцы. Прарок Ісая

**Дыдактычная мэта**:

Пазнаёміць вучняў з прароцтвамі Ісаі адносна нараджэння, жыцця, пакутаў смерці і ўваскрасення Езуса Хрыста.

**Выхаваўчая мэта**:

Фарміраваць у вучнях імкненне заўсёды рыхтавацца да сустрэчы з Езусам Хрыстом падчас святой Імшы.

**Матэрыялы**:

Біблія, ілюстрацыя, паказваючая падзеі біблійнага тэксту. Дапаможнік.

**Метады катэхэзы**:

Аналіз біблійнага тэксту, медытацыя вобраза, дыскусія,

**Ход заняткаў**

**Малітва:**

Песня «Ты - наш Цар» Спеўнік Эмануэль стр.120

К. правярае хатняе заданне, паўтарае пройдзены матэрыял і ўводзіць вучняў у новую тэму.

**Чалавек пытае**

К. пытае:

– Як выглядала б нашае жыццё, калі б Езус Хрыстус не нарадзіўся?

– Якім бы быў наш свет, калі б Езус Хрыстус не адкупіў яго?

Пасля смерці караля Саламона яго каралеўства раздзялілася на дзве часткі. Незадаволенасць людзей расла. У дзяржаве панавалі непарадкі і хваляванні. Бог абяцаў ізраэльцянам, што дасць ім свайго Сына, які будзе Каралём Ізраэля. Яны вельмі доўга чакалі і маліліся, але яшчэ не былі гатовыя, каб усё гэта здзейснілася, яшчэ не прыйшоў час. Пан Бог пасылаў да ізраэльцян пракокаў, якія казалі аб тым часе. Прарок – гэта вусны самога Бога, ён перадае людзям Яго словы. Адным з вялікіх прарокаў, які прадказаў нараджэнне Езуса Хрыста быў Ісая. Нарадзіўся ён каля 765 г. да нашай эры.

**Бог адказвае:**

К. чытае **Іс. 7, 14; 9, 6-7а** і размяшчае на дошцы ілюстрацыю: нараджэнне езуса Хрыста, сімвалы царскай улады: Карона і Скіпетр. К. пытае:

- Аб кім кажа прарок Ісая?
- Як ён называе будучага Месію?
- Чыім Ён будзе царом?
- Што Ён здзейсніць?

Прарок Ісая прадказаў, што Сын Божы народзіцца на свет, і стане каралём, а галоўная мэта Яго жыцця – гэта збаўленне людзей, якое Ён здзейсніць праз смерць на крыжы. Многім людзям цяжка было зразумець гэтыя прароцтвы. К. чытае **Іс. 53, 3.4аб.5.** К. пытае:

- Аб кім кажа прарок Ісая?
- Якія падзеі з жыцця Езуса Хрыста ён прадказвае?

Бог абяцаў, што Яго Сын стане Збаўцам усяго чалавецтва і будзе Царом усяго свету.

К. прымацоўвае да дошкі гатовы дапаможнік наступнага зместу **Іс. 50, 7; 49, 7д** і ілюстрацыю «Пакланенне Мудрацоў»:

| |
|---|
| «Пан Бог дапамагае мне, таму я не саромеюся, таму зрабіў я твар свой, як цвёрды камень, і ведаю, што не зазнаю сораму». Ис. 50, 7 |

– Аб кім кажа прарок Ісая?

– Кім стане Сын Божы?

К. размяшчае на дошцы ілюстрацыю: Езус перад Пілатам, укрыжаванне Езуса Хрыста. К. пытае:

– Якім чынам здзейснілася прароцтва прарока Ісаі?

– Што здзейсніў Езус, каб нас збавіць?

**Чалавек адказвае Богу:**

Прарок Ісая і іншыя прарокі падрыхтоўвалі людзей да прыйсця Езуса Хрыста. К. пытае:

– Якім чынам мы з вамі рыхтуемся да прыйсця Езуса Хрыста? (праз сакрамэнты)

– У якім сакрамэнце Езус Хрыстус прыходзіць да нас?

Адказы запісваем на дошцы.

– Што значыць быць заўсёды гатовым да сустрэчы з Езусам Хрыстом? (прабываць у стане асвячальнай ласкі)

**Разважанне:**

К. мы не можам прадставіць сваё жыццё без Езуса Хрыста.

– Ці цаню я любоў Езуса Хрыста? У чым гэта выяўляецца?

– Як часта я дзякую Богу за дар збаўлення?

– Як я перажываю святую Імшу?

– Як я слухаю Божае слова?

– Якія дары я прыношу Пану Богу?

**Пастанова.**

**Хатняе заданне:**

1. Раскажы сваёй сям'і і сябрам пра прарока Ісаю і яго прароцтвы.
2. Зрабі малюнак да тэксту з Кнігі прарока **Ісаі 53, 3-5**.

**Заключная малітва:**

Песня «Мой Збавіцель» Спеўнік Эмануэль стр.76

## Тэма № 24. Заклік быць верным Запавету. Прарок Ерамія

**Дыдактычная мэта**:

Пазнаёміць вучня з асобай і прароцтвамі прарока Ераміі.

**Выхаваўчая мэта**:

Выхоўваць у вучнях вернасць Богу і любоў да Радзімы.

**Матэрыялы**:

Біблія **Ер. 1, 4-10, Ер. 4, 1. 14, Ер. 9, 10, Ер. 31, 31-34.** Мапа Беларусі, мапа Ерузалема, ілюстрацыя, паказваючая прарока Ерамію, які аплаквае Ерузалем.

**Метады катэхэзы**:

Аналіз біблійнага тэксту, медытацыя вобраза, дыскусія, незавершаныя сказы.

### Ход заняткаў

**Малітва:**

*Божа, Валадару і Пане народаў, з рук сваіх і волі сваёй не выпускай нас, а праз заступніцтва Найсвяцейшай Панны і Каралевы нашай благаслаеі Айчыну нашу, каб яна была заўсёды верная Табе і хвалу прыносіла Твайму святому імені, а сыноў і дачок сваіх вяла да вечнага шчасця.*

Малітва за Айчыну

К. правярае хатняе заданне, паўтарае пройдзены матэрыял і ўводзіць вучняў у новую тэму.

**Чалавек пытае:**

К. паказвае вучням мапу Беларусі.

– Якую краіну нагадвае вам гэта мапа?

– Хто з вас быў у Мінску?

– Што вам спадабалася найбольш?

– Чым для беларусаў з’яўляецца горад Мінск?

**Бог адказвае:**

К. паказвае вучням ілюстрацыю Ерузалема. Сталіцай валадарства Юдэйскага быў горад Ерузалем. З гэтым горадам звязаная асоба прарока Ераміі.

Пан Бог нястомна дапамагаў і апекаваўся Ізраэлем. Але ізраэльцяне не былі вернымі Богу і забыліся пра Запавет з Богам. Пад уздзеяннем суседніх народаў сярод іх расло ідалапаклонства, яны адвярнуліся ад сапраўднага жывога Пана Бога і пакланяцца нежывым ідалам, якіх зрабілі людзі з дрэва, каменя, золата, срэбра і г.д. Таму Пан пасылаў да свайго народу прарокаў. Пан Бог кліча прарока, каб ён перадаваў народу Яго словы. Ерамія быў адным з вялікіх прарокаў, якіх паклікаў Пан Бог. Пра яго пакліканне мы чытаем у пачатку кнігі прарока Ераміі. К. чытае **Ер. 1, 4-10.**

– Пра што расказвае гэты тэкст?

Ерамія выканаў Божае даручэнне. Быў вялікім прарокам у Юдэйскім каралеўстве. Ён нагадваў ізраэльцянам аб тым, что Пан Бог – адзіны, і няма

іншых багоў, і заклікаў быць верным Запавету, які яны заключылі з Богам на гары Сінай. К. чытае **Ер. 4, 1. 14.**

- Да чаго заклікае прарок Ерамія гэтымі словамі?

Прарок Ерамія прадказаў таксама кару Божую за нявернасць ізраэльцян, за іх нежаданне адвярнуцца ад зла і чыніць дабро. Ён прадказаў, што горад Ерузалем будзе разбураны, і ператворыцца ў груду камянёў. Прароцтва Ераміі споўнілася. Ізраэльцяне трапілі ў бабілёнскі палон. Кароль Бабілёна захапіў Ерузалем. Ён абрабаваў і разбурыў увесь горад і Божую святыню, якая ў ім знаходзілася, а людзей захапіў у палон і павёў іх у Бабілён у якасці нявольнікаў. Прарок Ерамія вельмі любіў сваю радзіму, але нічога не мог зрабіць з нявернасцю сваіх суайчыннікаў. Ён цудоўна ведаў, што паражэнне і няволя, якую яны перажываюць, гэта наступствы граху – нявернасці Богу і Яго запавету. Прарок Ерамія аплакваў свой любімы горад і суцяшаў народ.

К. паказвае прарока Ерамію, які аплаквае Ерузалем. К. пытае:

- Чаму Ерамія плача?
- Чаму Ерузалем разбурылі?

Прарок Ерамія таксама прадказаў вельмі важную падзею для ўсіх людзей. К. чытае **Ер. 31, 31-34.**

- Пра якую падзею гаворыць прарок?
- Дзе гэты запавет быў заключаны?
- Праз каго?
- Якім коштам? /пакуты і смерць Езуса Хрыста/

Прарок Ерамія прадказаў пакуты Езуса Хрыста, і Новы Запавет, які Бог заключыць з людзьмі.

**Чалавек адказвае Богу:**

Пан Бог праз прарока Ерамію заклікае да навяртання, не толькі ізраэльцян, але і нас. Ён нагадвае нам, што мы павінны быць вернымі Пану Богу і Яго запаведзям.

К. пытае:

- Да чаго заклікае нас Пан Бог словамі прарока Ераміі? (вернасць запавету)
- Калі мы з вамі заключылі запавет з Панам Богам? (падчас хросту)
- З дапамогай якога сакарамэнту Пан Бог прабачае нам грахі і дае нам асвячальную ласку? (сакрамэнт споведзі)

К. пытае:

- Які перыяд літургічнага года асаблівым чынам заклікае нас да навяртання? (Вялікі пост)
- Вялікі пост – гэта час….(закончы сказ)
- Падчас Вялікага посту мы рыхтуемся ….(закончы сказ)
- Час Вялікага посту дадзены чалавеку для таго,…(закончы сказ)
- Падчас Вялікага посту мы разважаем аб …(закончы сказ)
- Падчас Вялікага посту мы ходзім у касцёл на … (закончы сказ (Крыжовы шлях і Песні Жальбы)
- Кожны хрысціянін падчас Вялікага посту павінен прыняць удзел у … (закончы сказ (Духоўныя практыкаванні)

**Разважанне:**

К. пытае:

- Што я павінен змяніць у сваіх учынках, каб быць верным Богу і выконваць Яго запаведзі?
- Як я праяўляю любоў да Радзімы?
- Ці пазнаю яе гісторыю?
- Ці берагу прыроду?
- Як паводжу сябе ў грамадскіх месцах?
- Ці стаўлюся беражліва да грамадскай маёмасці?
- Як часта малюся за свой народ?
- Калі апошні раз я маліўся за Беларусь?

**Пастанова.**

**Хатняе заданне:**

1. Раскажы сваёй сям'і і сябрам пра прарока Ерамію і яго прароцтвы.
2. Намалюй карту Беларусі і напішы на ёй малітву за Радзіму.
3. Напішы, як ты можаш праявіць сваю любоў да Радзімы.

**Заключная малітва:**

Песня «Магутны Божа», Спеўнік Эмануэль стр. 65

## Тэма № 25. Даніэль – прыклад вернасці Богу

**Дыдактычная мэта**:

Пазнаёміць вучня з біблійнай гісторыяй пра Даніэля, чалавека малітвы. Вучань разумее, што Пан Бог ніколі не пакідае людзей, якія моляцца і спадзяюцца на Яго.

**Выхаваўчая мэта**:

Фарміраваць у вучнях вернасць штодзённай малітве і выхоўваць пачуццё даверу Богу ў вельмі цяжкіх сітуацыях.

**Матэрыялы**:

Біблія: **Даніэль 6, 1-28**, ілюстрацыя і фільм, якія паказваюць падзеі біблійнага тэксту. Дапаможнік.

**Метады катэхэзы**:

Малітва, аналіз біблійнага тэксту, медытацыя вобраза, дапаможнік, дыскусія.

### Ход заняткаў

**Малітва:**

*Люблю Цябе, Пане, і аб адзінай ласцы прашу ў Цябе: любіць Цябе вечна. Мой Божа, калі мой язык не можа паўтараць кожнае імгненне, што я люблю Цябе, то хачу, каб сэрца маё паўтарала гэта Табе з кожным уздыхам.*

Малітва св. Яна Марыі Віянэя

К. правярае хатняе заданне і паўтарае пройдзены матэрыял:

- Кім быў Ерамія?
- Хто такі прарок?
- Чаму Ерамія пакутаваў?
- Як Ерамія адносіўся да сваёй радзімы?

– Аб чым прароцтваваў Ерамія?

– Чаму мы навучыліся ад прарока Ераміі?

К. уводзіць вучняў у новую тэму.

**Чалавек пытае:**

К. прымацоўвае да дошкі ілюстрацыі, на каторых паказаны людзі, якія моляцца. У жыцці кожнага чалавека бываюць цяжкія моманты. Людзі спрабуюць вырашыць іх па-рознаму. К. прапаноўвае вучням на аркушы паперы напісаць аб сваёй праблеме, якая турбуе і засмучае іх найбольш, імкнучыся растлумачыць, чаму гэта для іх на самой справе важна. Вучні па ўласнаму жаданню дзеляцца на пары і абменьваюцца гэтымі праблемамі. Абмяркоўваюць іх і спрабуюць даць адзін аднаму добрую параду, як вырашыць праблему.

**Бог адказвае:**

Сёння мы даведаемся пра прарока Даніэля. У яго быў нялёгкі лёс. Але ў яго быў адзін верны і надзейны спосаб вырашэння ўсіх праблем, гэта - малітва, зносіны, размова з Нябесным Айцом. Даніэль бязмежна давяраў Пану Богу. У малітве ён чэрпаў сілы, знаходзіў адказы на самыя цяжкія пытанні. Штодзённа, тры разы на дзень, раніцай, у абед і вечарам ён маліўся Пану Богу. Ён ведаў, што толькі ўсемагутны Пан Бог можа дапамагчы яму. Нават тады, калі яму забаранілі маліцца, пагражаючы смерцю, ён усё роўна быў верны Пану Богу і не пераставаў маліцца. На аснове біблійнага тэксту **Даніэль 6, 1-28** расказвае пра прарока Даніэля, акцэнтуючы ўвагу на:

1. Давер караля Даніэлю

Бабілёнскі кароль Навуходаносар захапіў у палон жыхароў Ерузалема. Загадаў выбраць сярод палонных ізраэльцян маладых юнакоў, з каралеўскага і княжацкага роду, якія былі без цялесных недахопаў, прыгожыя і разумныя, для службы пры каралеўскім двары. Сярод іх апынуўся Даніэль. Ён быў верны Пану Богу і не адступаў ад сваёй веры, быў здольным вучнем і таму яго пакінулі служыць пры каралеўскім двары. Бабілёнскі кароль Дарый вельмі любіў Даніэля за высакароднасць і мудрасць, якімі надзяліў яго Пан Бог. Ён зацеў паставіць яго над усім каралеўствам.

2. Зайздрасць царадворцаў і іх дзеянні

Але царадворцы, сатрапы зайздросцілі Даніэлю і шукалі нагоду, каб пазбыцца яго. І прыдумалі пастку для Даніэля. Яны ведалі, што Даніэль заўсёды моліцца да свайго Бога, а не да іх ідалаў, і таму папрасілі караля выдаць закон, які б забараняў на працягу трыццаці дзён прасіць што-небудзь у якогасьці бога ці чалавека, акрамя караля Дарыя. Калі хто-небудзь адважыцца парушыць гэты закон, то ён будзе кінуты ў львіны роў. Кароль згадзіўся падпісаць загад.

3. Малітва Даніэля, які верыў і спадзяваўся на Бога

А Даніїл, калі даведаўся, што падпісаны такі ўказ, пайшоў у свой дом; а вокны ў сьвяцёлцы ягонай былі адчынены супроць Ерусаліма, і ён тры разы на дзень схіляў калені і маліўся свайму Богу і славіў Яго, як ён рабіў гэта і да таго. Злыя царадворцы падпільнавалі Даніэля, і знайшлі яго молячымся перад сваім Богам і данеслі каралю.

Даніэль у львіным рове.

Пачуўшы аб гэтым, кароль моцна засмуціўся і хацеў выратаваць Даніэля, але царадворцы яму нагадалі, што ніякі каралеўскі загад не можа быць зменены. Даніэля кінулі ў львіны роў. Кароль не спаў усю ноч.

4. Выратаванне Даніэля

На світанні кароль паспяшаўся да львінага рова і пачаў клікаць Даніэля. Даніэля адказаў яму: К. Чытае з Бібліі - Дан. 6, 22.: **«Мой Бог паслаў свайго Анёла і закрыў пашчы львам, і яны не зрабілі мне крыўды, бо Ён знайшоў мяне нявінным».** Дарый узрадаваўся выратаванню Даніэля і загадаў падняць яго з рова.

5. Пакаранне за абвінавачванне Даніэля

І загадаў кароль кінуць у львіны роў усіх, хто абвінавачваў Даніэля. Іх кінулі ў роў, львы авалодалі імі і скрышылі іхнія косці.

Пасля гэтага выпадку кароль Дарый напісаў ліст. К. чытае з Бібліі – Дан. 6, 25-28: **«Няхай будзе вялікім ваш спакой. Наказваю гэтым дэкрэтам, каб на ўсёй тэрыторыі майго валадарства пакланяліся Богу Даніэля, бо Ён –**

**Бог жывы і трывае вечна. Яго валадарства не будзе зруйнавана, і панаванне Яго бясконцае. Ён ратуе і вызваляе, чыніць знакі і цуды на зямлі і на небе. Ён уратаваў Даніэля ад моцы львоў».**

К. пытае вучняў:

– Як Даніэль апынуўся ў Бабілёне?

– Што цанілі каралі ў Даніэлю?

– Адкуль у Даніэля гэты дар?

– Як царадворцы ставіліся да Даніэля?

– Што яны задумалі?

– Які загад выдаў кароль Дарый?

– Як загад паўплываў на Даніэля?

– Чаму Даніэля бязмежна давяраў Богу?

– Чаму кароль кінуў Даніэля ў львіны роў?

– Як Пан выратаваў Даніэля?

– Што спадабалася Пану Богу ў паводзінах Даніэля?

– Што вам спадабалася найбольш з гісторыі пра Даніэля?

К. падсумоўвае адказы вучняў. Даніэля несправядліва абвінавацілі, ён маліўся да Бога і нікому не чыніў ніякай шкоды. Ён не скардзіўся каралю на людзей, якія рабілі яму зло, ён спадзяваўся на Пана Бога і прасіў у Яго дапамогі. Даніэль шчыра маліўся, і Пан яго выслухаў. Ён выратаваў Даніэля ад смерці.

**Чалавек адказвае Богу:**

Вернасць Пану Богу і штодзённая малітва выратавалі Даніэля ад смерці. Малітва неабходна чалавеку як паветра. Падчас малітвы чалавек можа літаральна выліць тое, што змяшчаецца ў яго сэрцы, перад Панам Богам. Толькі ўсемагутны Пан Бог можа зразумець нашы праблемы і дапамагчы нам

іх вырашыць. Толькі Пан Бог можа абараніць нас ад зла. К. прапаноўвае вучням завяршыць незавершаныя сказы.

Малітва - гэта …

Калі молішся,…

Богу падабаецца малітва …

Трэба маліцца …

Дзякуючы малітве …

У цяжкіх жыццёвых сітуацыях малітва...

Малітвай можна …

Калі ты самотны, малітва …

Малітва дае нам …

Вучні выказваюцца, К. падсумоўвае іх адказы. К. расказвае вучням аб тым, чым для яго з’яўляецца малітва, як часта ён моліцца, што яму дапамагае, а што перашкаджае маліцца і г.д., дае сведчанне аб ролі малітвы ў сваім жыцці. (Пры гэтым можа выкарыстоўваць пытанні з Разважання).

У людзей, якія любяць Пана Бога і імкнуцца жыць у еднасці з Ім ёсць дэвіз. К. прымацоўвае да дошкі гатовы дапаможнік наступнага зместу:

| НІВОДНАГА ДНЯ БЕЗ МАЛІТВЫ |
|---|

**Разважанне:**

К. пытае:

- Як часта я малюся?
- Што дае мне малітва?
- Што дапамагае мне маліцца?
- Што перашкаджае мне маліцца?
- Якую малітву я больш за ўсё люблю?
- Ці з’яўляецца малітва адным з маіх самых любімых заняткаў?
- Колькі часу ў дзень я прысвячаю малітве? Параўнай па часу з астатнімі заняткамі. Аб чым гэта сведчыць?

**Пастанова.**

**Хатняе заданне:**

1. Раскажы сваёй сям'і і сябрам біблійную гісторыю пра Даніэля і моц малітвы.
2. Прыдумай афішу на тэму «Ніводнага дня без малітвы», у якой ты заклікаў бы ўсіх людзей маліцца і тлумачыў бы сэнс і неабходнасць штодзённай малітвы. Можна выкарыстоўваць выразаныя малюнкі з часопісаў, выказванні розных людзей аб малітве і г. д.

**Заключная малітва:**

«Ойча наш», «Акты» стр. 21-22 малітоўніка «Ойча наш».

## Тэма № 26. Вернасць Богу. Мучаніцтва Маці і Сыноў

**Дыдактычная мэта**:

Пазнаёміць вучня з біблійнай гісторыяй аб пакутніцкай смерці сямі братоў і іх маці. Вучань ведае, што трэба мужна вызнаваць сваю веру. Адданы да канца Пану Богу чалавек атрымлівае ў якасці ўзнагароды вечнае Жыццё.

**Выхаваўчая мэта**:

Фарміраваць у вучню імкненне мужна вызнаваць сваю веру.

**Матэрыялы**:

**Біблія: 2 Мак. 7, 1-41,** ілюстрацыя і фільм, паказваючыя падзеі біблійнага тэксту. Фільм /ваеннай тэматыкі/, у якім чалавек аддае сваё жыццё за сваю сям'ю або за свабоду свайго народа – урывак з фільма «Адважнае сэрца», «Гладыятар» і г.д.

**Метады катэхэзы**:

Аналіз біблійнага тэксту, медытацыя вобраза, дапаможнік, дыскусія, сцэнка, праца ў групах.

### Ход заняткаў

**Малітва:**

*О, мой Божа, Тройца, якую праслаўляю...супакой душу маю; зрабі яе сваім небам, сваім умілаваным прытулкам і месцам свайго адпачынку. Няхай ніколі не пакіну там Цябе ў адзіноце, але няхай буду там уся цалкам, чуваючы ў веры, трываючы ў пакланенні, аддаючыся поўнасцю Тваёй справе збаўлення.*

Бл. Альжбета ад Тройцы

К. правярае хатняе заданне, паўтарае продзены матэрыял і ўводзіць вучняў у новую тэму.

**Чалавек пытае:**

К. паказвае ўрывак з фільма (ваеннай тэматыкі), у якім чалавек аддае сваё жыццё за сваю сям'ю, за любага чаловека або за свабоду свайго народа – урывак з фільма «Адважнае сэрца», «Гладыятар» і г.д.

К. абмяркоўвае з вучнямі змест прагледжанага фрагмента.

К. Жыццё – найвышэйшы дар, якім Пан Бог адарыў чалавека. Жыццё кожнага чалавека бясцэннае. Але мы ведаем, што існуюць каштоўнасці, за якія чалавек здольны аддаць сваё жыццё. Такіх людзей мы называем героямі. Яны аддаюць сваё жыццё, каб захаваць, абараніць жыццё іншых. К. пытае:

– Дзеля каго мы з вамі здольныя ахвяраваць сваё жыццё?

**Бог адказвае:**

К. За 200 год да нараджэння Езуса Хрыста ізраэльцян захапілі сірыйцы. Сірыйскі кароль прымушаў ізраэльцян адрачыся ад веры ў адзінага Пана Бога і ад Яго запаведзяў. Таго, хто адмаўляліся выконваць загады караля, катавалі і забівалі. К. чытае **2 Мак. 7, 1-41**. К. паказвае ілюстрацыю, на якой паказаны сем братоў і іх маці. К. пытае:

- За што катавалі і забілі маці і яе сыноў?
- На каго яны спадзяваліся?
- Што давала ім мужнасць і вытрываласць у пакутах?

- У каго яны глыбока верылі?
- Чаго дасягнулі маці і яе сямёра сыноў?
- Чаму яны нас вучаць?

К. прымацоўвае на дошцы дапаможнік наступнага зместу:

| ЧАКАЮ ЎВАСКРАШЭННЯ ПАМЕРЛЫХ І ЖЫЦЦЯ ВЕЧНАГА Ў БУДУЧЫМ СВЕЦЕ. |
|---|

К. пытае:

- З якой малітвы ўзяты гэты фрагмент?
- Як вы разумееце выраз «ЧАКАЮ ЎВАСКРАШЭННЯ ПАМЕРЛЫХ І ЖЫЦЦЯ ВЕЧНАГА Ў БУДУЧЫМ СВЕЦЕ”?

Адказы вучні запісваюць у дапаможнік для дзяцей, і прадстаўляюць іх на абмеркаванне.

**Чалавек адказвае Богу:**

К. дзеліць дзяцей на тры групы і прапаноўвае ім падрыхтаваць кароткія сцэнкі:

**Група 1**

Падчас адпачынку ў летнім лагеры дзеці пераадольваюць сарамлівасць і пачуццё сораму, перад тым, каб стаць на калені перад вячэрняй малітвай.

**Група 2**

На стадыёне дзеці заступаюцца за слабога дзіцяў, над якім смяюцца і здзекуюцца астатнія дзеці.

**Група 3**

Дзеці, праходзячы каля Касцёла, Крыжа робяць на сабе знак крыжа.

Вучні дзеляцца ўражаннямі ад сцэнкі.

К. пытае:

- Як мы ў штодзённым жыцці можам вызнаваць сваю веру ў Пана Бога? (маліцца раніцай і вечарам, да і пасля ежы, перад паездкай, па нядзелях удзельнічаць у Святой Імшы, любіць бліжніх і г.д.)
- Якая ўзнагарода чакае нас на небе за вернасць Пану Богу і Яго запаведзям?

**Разважанне:**

- Ці люблю я Пана Бога больш за ўсё на свеце? У чым гэта выяўляецца?
- Ці вызнаю я мужна сваю веру ў штодзённым жыцці? Якім чынам?
- Што я хачу і магу зрабіць з любові да пана Бога?

**Пастанова.**

**Хатняе заданне:**

1. Раскажы сваёй сям'і і сябрам біблійную гісторыю маці і яе сяноў.
2. Напішы сачыненне на тэму: «Мучанікі беларускай зямлі», у якім ты апішаш жыццё і гераічную смерць мучаніка. (К. павінен падрыхтаваць і прадставіць адпаведную інфармацыю для вучняў пра мучанікаў беларускай зямлі).
3. Напішы малітву - просьбу аб дары моцнай веры.

**Заключная малітва:**

Псальм 86 (85), 11-12

**Тэма № 28 «Выкананне Божых абяцанняў»**

**Дыдактычная мэта**:

Вучань ведае, што ў Езусе Хрысце здзейсніліся старазапаветныя прароцтвы. Увесь Стары Запавет падрыхтоўваў свет да прыйсця Збаўцы – Езуса Хрыста.

**Выхаваўчая мэта**:

Фарміраваць у вучню ўпэўненасць у здзяйсненні Божых абяцанняў. Дапамагчы вучню прыняць Езуса Хрыста як Збаўцу.

**Матэрыялы**:

Біблія: Евангелле **ад св. Лукі 2: 1-7**, ілюстрацыя і фільм, паказваючыя падзеі біблійнага тэксту - Нараджэнне Езуса Хрыста.

**Метады катэхэзы**:

Аналіз біблійнага тэксту, медытацыя вобраза, дапаможнік, праца ў групе, дыскусія.

**Ход заняткаў**

**Малітва**

Апостальскі сімвал веры

К. правярае хатняе заданне, паўтарае пройдзены матэрыял і ўводзіць вучняў у новую тэму.

**Чалавек пытае**

На працягу ўсяго года Пан Бог вёў нас. Ён адкрываўся нам у сваім Слове і не перастае адкрывацца. Ён вучыць нас, умацоўвае нашу веру і любоў.

Пасылае нам незвычайных, па-сапраўднаму веруючых людзей, якія любяць Яго ўсім сэрцам, усім розумам і ўсёю душою і вучаць нас, як слухаць Пана Бога і выконваць Яго святую волю. На сённяшнім спатканні мы паўторым матэрыял, які мы праходзілі на працягу года.

**Бог адказвае**

К. прымацоўвае да дошкі дапаможнік наступнага зместу:

| |
|---|
| Стары Запавет утрымлівае 46 кніг і апавядае нам аб людзях і падзеях да нараджэння Езуса Хрыста: |
| 1.Стварэнне свету і чалавека |
| 2. Першародны грэх |
| 3. Пакліканне і гісторыя выбранага народа |
| 4. Запавет на гары Сінай |
| 5. Прароцтва аб прыйсці нашага Збаўцы – Езуса Хрыста |

На працягу года мы з вамі вывучалі падзеі, апісаныя ў Старым Запавеце. Крок за крокам мы ішлі да здзяйснення самага галоўнага прароцтва Старога Запавету – прыйсця Месіі, Збаўцы свету – нараджэння Езуса Хрыста. Сягоння мы з вамі будзем успамінаць падзеі, якія мы праходзілі. К. дзеліць вучняў на 5 груп і раздае ім па 5 картак на групу, карыстаючыся ніжэй прадстаўленым дапаможнікам. Вучні, карыстаючыся дапаможнікамі для вучняў і Бібліяй павінны коратка расказаць пра асноўныя падзеі, якія ўтрымліваюцца ў дадзеных тэмах. К. выбудоўвае з вучнямі піраміду. К. падсумоўвае адказы вучняў: «І так усё сталася. Усе прароцтвы споўніліся праз прыйсце Езуса Хрыста». К. чытае Евангелле ад св. Лукі 2: 1-7.

НАРАДЖЭННЕ Месіі –
Збаўцы, ЕЗУСА ХРЫСТА

| |
|---|
| 25. Вернасць веры. Мучаніцтва Маці і Сыноў. |
| 24. Прарок Даніэль – прыклад вернасці Пану Богу. Львіны роў. |
| 22. Прарок Ерамія. Заклік быць верным Запавету. Ізраэльцяне трапілі ў вавілонскі палон. |
| 21. Прарок Ісая. Прадказанні нараджэння Збаўцы. Месія. |
| 20. Прарок Ілля – сведка сапраўднага бога. Прарок – гэта вусны Пана Бога. Цуд на гары Кармэль. |
| 19. Саламон, сын Давіда, пабудаваў цудоўную Святыню. Святыня – знак прысутнасці Бога сярод свайго народа. |
| 18. Пан Бог выбірае Давіда царом выбранага народа. |
| 17. Пан заклікаў “Суддзяў”, якія ратавалі ізраэльцян ад рук ворагаў і клапаціўся пра тое, каб народ быў верны Богу і жыў паводле Божых Запаведзяў. Самуэль – суддзя Ізраэльцян. |
| 16. Пан Бог дапамагае міласэрнаму Тобію. Арханёл Рафал. |
| 15. Пан Бог уводзіць ізраэльцян у зямлю абяцаную. Езус Навін. Пераход праз раку Ярдан. Узяцце Ерыхона. |

| |
|---|
| 14. Пан Бог заключае Запавет на гары Сінай. Бог дае Майсею Дзесяць Божых запаведзяў. |
| 13. Пан Бог вядзе Свой народ, як Айцец. Манна з неба. Майсей здабывае ваду са скалы. |
| 12. Пан Бог выводзіць Свой народ з Егіпта. Пераход праз Чорнае мора. Пасха. |
| 11. Пан Бог кліча Майсея, каб выратаваць свой народ з егіпецкага палону. |
| 10. Юзаф – сын Якуба. Пан Бог кліча Юзафа, для таго, каб выратаваць сям’ю Якуба ад смерці. |
| 9. Ісаак – сын Абрагама. Прымірэнне Эзава і Якуба – сыноў Ісаака. |
| 8. Пан Бог кліча Абрагама. Абрагам –айцец веруючых. Словы абяцання, якія Бог даў Абрагаму: «*Твайму патомству дам гэтую зямлю*» |
| 7. Вавілонская вежа - сімвал чалавечай ганарыстасці. Людзі бачылі моц і магутнасць Бога і хацелі, каб у іх быў знак і магутнасці і моцы, якую яны змаглі б паставіць нароўні з Богам. Пан Бог змешвае мовы. |
| 6. Пан Бог - Суддзя справядлівы за добрае ўзнагароджвае, а за злое карае. Патоп і праведны Ной. |
| 5. Грэх разбурае адносіны паміж людзьмі. Каін забівае свайго брата Абэля. |
| 4. Але Бог заўсёды любіць чалавека і не перастае любіць нават тады, калі чалавек выбірае няправільны шлях і сам адыходзіць ад Яго. Пан асуджае няправільны выбар - грэх, але не чалавека. Пан Бог абяцае людзям Збаўцу – Езуса Хрыста. |

| |
|---|
| 3. Па віне чалавека ў свет прыходзіць грэх. Грэх – гэта недахоп любові, які выражаецца ў непаслухмянасці Богу. Грэх разбурае адносіны з Богам. |
| 2. Пан Бог стварыў чалавека на Свой вобраз і падабенства. Бог стварыў чалавека, каб падзяліцца з ім Сваім шчасцем і любоўю. Чалавек створаны для таго, каб любіць Пана Бога, выконваць Яго святую волю і жыць вечна з Ім у раі. |
| 1. Усемагутны Пан Бог стварыў увесь свет з нічога. Усё, што створана Богам - добрае і карыснае. |
| ПАН БОГ |

**Чалавек адказвае Богу**

К. праводзіць з вучнямі адарацыю «Езус Хрыстус - наш Збаўца». Раздае вучням папярэдне падрыхтаваныя карткі са словамі з «Ліста Нябеснага Айца». Малітву можа суправаджаць медытацыйная музыка або спевы.